WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

13 САКАВІКА 2010 г.
СУБОТА
№ 46
(26654)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ПАВАЖАНЫЯ СУАЙЧЫННІКІ!

Сардэчна віншую вас з Днём Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Значэнне гэтай даты блізкае і зразумелае любому грамадзяніну. Менавіта прыняцце і далейшае ўдасканальванне Асноўнага Закона шмат у чым вызначыла сучаснае развіццё Беларусі як моцнай сацыяльнай прававой дзяржавы.

Канстытуцыя — найважнейшы сімвал і атрыбут суверэнітэту нашай краіны. Яна заклала аснову для ўмацавання дэмакратычных устояў грамадства, захавання духоўных каштоўнасцяў нацыі, забеспячэння дабрабыту кожнага чалавека і кожнай сям'і.

З'яўляючыся трывалым падмуркам дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь, Асноўны Закон гарантуе надзейную абарону правоў і свабод грамадзян, садзейнічае паслядоўнаму правядзенню сацыяльна-эканамічнай палітыкі, накіраванай на значнае павышэнне якасці жыцця людзей.

Мы па праве ганарымся сваёй Канстытуцыяй, якая ўвабрала ў сябе лепшыя традыцыі і дасягненні нацыянальнага заканадаўства і адпавядае самым высокім міжнародным стандартам.

Перакананы, што няўхільнае захаванне канстытуцыйных прынцыпаў стане залогам паспяховай рэалізацыі эканамічнага, культурнага і духоўнага патэнцыялу беларускага народа.

Шчыра жадаю вам, дарагія сябры, міру, шчасця, здароўя, здзяйснення ўсіх вашых задум, натхнення на далейшыя працоўныя дасягненні на карысць роднай Айчыны.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 12 сакавіка разгледзеў кадравыя пытанні.

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

Верамко Рыгора Іванавіча — намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь — дырэктарам Дэпартамента фінансавых расследаванняў;

Амельяновіча Міхаіла Міхайлавіча — міністрам лясной гаспадаркі.

Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

Майсейчыка Анатоля Мікалаевіча — намеснікам міністра прамысловасці;

Новікава Сяргея Віктаравіча — намеснікам начальніка Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь;

Цапоты Віктара Уладзіміравіча — старшынёй Талачынскага райвыканкама;

Кнышава Вадзіма Аляксандравіча — галоўным рэдактарам установы «Рэдакцыя газеты «Настаўніцкая газета»;

Лапцэвіча Аляксандра Анатольевіча — начальнікам установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны вышэйшы авіяцыйны каледж»;

Бусько Ігара Яўгеньевіча — членам Брэсцкага аблвыканкама;

Калача Уладзіміра Віктаравіча — членам Мінскага аблвыканкама, членам Мінскага гарвыканкама;

Пятруні Аляксандра Міхайлавіча — кіраўніком арганізацыйна-аналітычнага дэпартамента Сакратарыята Інтэграцыйнага камітэта Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Ільготныя крэдыты ў беларускіх рублях на куплю айчынных тавараў змогуць атрымаць усе жадаючыя

Усе жадаючыя змогуць атрымліваць ільготныя крэдыты ў беларускіх рублях на спажывецкія патрэбы для набыцця ў гандлёвых арганізацыях беларускіх тавараў па пераліку, зацверджанаму пастановай Савета Міністраў. Такая норма змяшчаецца ў падпісаным 12 сакавіка Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам указе № 152 «Аб унясенні змянення ў Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 ліпеня 2009 г. № 371».

Раней у адпаведнасці з указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 ліпеня 2009 года № 371 «Аб ільготным спажывецкім крэдытаванні» такое права было прадастаўлена толькі малазабяспечаным грамадзянам. Дакумент уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

БЕЛАРУСЬ УДЗЯЧНАЯ ААЭ ЗА ПАДТРЫМКУ НА СУСВЕТНАЙ АРЭНЕ

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, сустракаючыся ўчора ў Мінску з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў у Рэспубліцы Беларусь Мухамедам Маерам Абдалой аль-Раісі з нагоды завяршэння яго дыпмісіі.

«Не было такога выпадку, калі Беларусь звярнулася б да ААЭ з просьбай аб падтрымцы, і ваша дзяржава не адрэагавала», — адзначыў беларускі лідар. «Перадайце кіраўніцтву вашай краіны: вы можаце не сумнявацца ў прыстойнасці і шчырасці той пазіцыі, якую займае Беларусь у адносінах да ААЭ, — сказаў Аляксандр Лукашэнка паслу. — Вы можаце цвёрда разлічваць на нашу падтрымку па самым шырокім спектры пытанняў». Кіраўнік дзяржавы запэўніў пасла, місія якога ў Беларусі завяршаецца, у тым, што ў Мінску яго будуць вельмі рады бачыць, і ён можа адчуваць тут сябе як дома.

У сваю чаргу Мухамед Маер Абдала аль-Раісі падзякаваў беларускаму Прэзідэнту за тое, што ён знайшоў час сустрэцца з ім, нягледзячы на загружанасць свайго графіка. «Гэта сведчанне прыярытэтнасці нашых адносінаў і таго, як ставяцца ў Беларусі да Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў», — сказаў дыпламат. Паводле слоў пасла, палітычныя адносіны паміж дзвюма дзяржавамі апярэджваюць па сваёй дынаміцы эканамічныя, аднак у будучыні гэта будзе навярстана.

БЕЛТА.

У БЕЛАРУСІ СТВОРАНЫ І ДЗЕЙСНА ПРАЦУЕ МЕХАНІЗМ УЗАЕМАДЗЕЯННЯ ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ І КАНФЕСІЙ

Аб гэтым заявіў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Патупчык на праведзенай 11 сакавіка сустрэчы з кіраўнікамі рэспубліканскіх рэлігійных аб'яднанняў, паведамілі БЕЛТА ў Апараце Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў.

У сустрэчы прынялі ўдзел архіепіскап Навагрудскі і Лідскі Гурый, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскай архіепархіі Рымска-каталіцкай царквы ў Рэспубліцы Беларусь архіепіскап Тадэвуш Кандрусевіч, а таксама кіраўнікі і прадстаўнікі рэлігійных аб'яднанняў іудзейскай, мусульманскай, стараверскай і пратэстанцкіх канфесій і рэлігійных напрамкаў. Разам з тым Уладзімір Патупчык звярнуў увагу рэлігійных арганізацый на неабходнасць строгага выканання ў іх дзейнасці патрабаванняў дзеючага заканадаўства, важную ролю рэлігійных кіраўнікоў у выхаванні прававой культуры грамадзян. Таксама намеснік прэм'ер-міністра падкрэсліў важнасць правільных і кваліфікаваных дзеянняў мясцовых органаў улады ў пытаннях супрацоўніцтва з канфесіямі, выкарыстанні іх патэнцыялу ў вырашэнні сацыяльных і выхаваўчых задач.

Былі таксама разгледжаны актуальныя пытанні дзейнасці рэлігійных арганізацый, адзначана высокая эфектыўнасць сумесных намаганняў канфесій у пытаннях духоўна-маральнага выхавання асобы і грамадства, вырашэнні значных сацыяльных праблем. Высока ацэнена роля Кансультатыўнага міжканфесіянальнага савета пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, Грамадскага савета па маральнасці як значных грамадскіх ініцыятыў у справе захавання міру і ўмацавання духоўных традыцый у Беларусі.

Кіраўнікі рэлігійных арганізацый выказалі ўдзячнасць за арганізацыю гэтай сустрэчы і адзначылі карысць правядзення такіх мерапрыемстваў для развіцця канструктыўных узаемаадносінаў органаў улады і рэлігійных арганізацый, пашырэння дзяржаўна-канфесіянальнага дыялога.

ІНСПЕКТАР АСТРАВЕЦКАЙ ДАІ ЗНОЙДЗЕНЫ МЁРТВЫМ З НАЖОМ У ГРУДЗЯХ

Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведаміў памочнік пракурора Гродзенскай вобласці Вячаслаў ІГНАЦІК.

Трагедыя адбылася 5 сакавіка. Раніцай 35-гадовы інспектар сабраўся на службу, да якой так і не дабраўся. Цела мужчыны знайшлі каля яго ж гаража з пранікаючым нажавым раненнем грудной клеткі. Паводле папярэдняй версіі, мужчына сам сабе нанёс смяротнае раненне. Пры гэтым ён выкарыстаў нож з кухоннага набору сваёй сям'і.

Паводле інфармацыі пракуратуры, інспектар быў законапаслухмяным грамадзянінам і ўзорным сем'янінам. Без бацькі засталіся двое дзяцей-школьнікаў.

ХОЧАШ БЯРОЗАВІКУ — ЗВЯРНІСЯ Ў ЛЯСНІЦТВА

У сувязі з пачаткам перыяду сокаруху Мінпрыроды нагадвае, што нарыхтоўка бярозавага соку ў краіне рэгулюецца нарматыўнымі прававымі актамі.

Згодна з заканадаўствам, нарыхтоўваць бярозавік можна ў насаджэннях, прызначаных для высечак галоўнага карыстання, але не раней, чым за пяць гадоў да іх высечкі. Працэс можа адбывацца таксама на ўчастках, адведзеных для правядзення іншых высечак і высечак прамежкавага карыстання ў год высечкі. Пры нарыхтоўцы бярозавага соку юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі павінны мець лясны білет, выпісаны юрыдычнай асобай, што вядзе лясную гаспадарку. Грамадзяне могуць весці нарыхтоўку сокаў бясплатна на ўчастках лесу, што вызначаюцца для гэтых мэтаў названымі юрасобамі, з захаваннем правілаў нарыхтоўкі. Каб даведацца пра такія ўчасткі лесу, грамадзянін павінен звярнуцца ў лясніцтва па месцы жыхарства. Акрамя таго лясгасы могуць вывешваць абвесткі ў грамадскіх месцах пра ўчасткі лесу, дзе можна весці нарыхтоўку.

Існуюць тэрыторыі, на якіх нарыхтоўка забаронена. Да іх, у прыватнасці, адносяцца гарадскія, курортныя лясы і лесапаркавыя часткі зялёных зонаў; прыбярэжныя палосы рэк, азёраў, водасховішчаў і іншых водных аб'ектаў; палосы адводу чыгуначных і аўтамабільных дарог, іншых транспартных і камунікацыйных ліній; населеныя пункты; дэндралагічныя паркі, батанічныя сады; месцы з дзікімі жывёламі і дзікарослымі раслінамі, што ўнесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь; акругі і зоны санітарнай аховы курортаў; гісторыка-культурныя запаведнікі, мемарыяльныя паркі, археалагічныя помнікі; тэрыторыя санаторыяў, дамоў адпачынку, курортаў і ўстаноў сістэмы аховы здароўя; месцы масавага адпачынку. За парушэнне правілаў нарыхтоўкі існуе адміністрацыйная адказнасць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.03.2010 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲1 долар ЗША 2 960,00	1 чэшская крона 159,69	USD 29,3897	Агенцтва Уладзіміра Грачова
▲1 еўра 4 059,94	1 польскі злоты 1 044,53	10 UAH 36,8361	
1 латвійскі лат 5 738,10	▲1 расійскі рубель 100,72	1000 BYR 9,9592	
1 літоўскі літ 1 176,47	1 украінская грыўня 371,11	EUR 40,2610	

Фота Анатоля КЛЕЦКА

ШАПКАМ РАНА НА ПАЛІЦУ!

Медыкі заклікаюць у міжсезонне не спяшацца знімаць галаўныя ўборы

«Надвор'е цяпер вельмі падманлівае. Сонца свеціць, але дзьме парывісты халодны вецер, таму вельмі лёгка застудзіць галаву і зарабіць неўрыт нерва твару. Пры гэтым часцей за іншых захворваюць людзі, якія недасыпаюць і няправільна харчуюцца», — патлумачыла карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» ўрач-рэфлексатэрапеўт 17-й гарадской паліклінікі Мінска Тамара Вяргейчык.

Доктар падкрэсліла, што менавіта ў міжсезонне колькасць пацыентаў рознага ўзросту з неўрытам нерва твару рэзка павялічваецца. Хворыя прыходзяць да ўрачоў у літаральным сэнсе з перакошанымі тварамі. «Асабліва бестурботна ставіцца да свайго здароўя моладзь: крыху пацяплела — адразу шапкі далоў», — пракаментавала Тамара Вяргейчык. Між тым, лячэнне гэтага захворвання працяглае і складанае, можа працягвацца больш як год. У некаторых выпадках пацыентам прызначаюць нават гарманальныя прэпараты.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА, «Мінск—Навіны».

ПАСЛЯ ВЫХАДНЫХ ПАХАЛАДАЕ

На наступным тыдні ў Беларусі будзе пераважаць надвор'е зімовага характару, паведаміла БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга ФЯДОТАВА.

У нядзелю, 14 сакавіка, на тэрыторыю рэспублікі накіруюцца халодныя паветраныя масы арктычнага паходжання. У многіх раёнах чакаецца кароткачасовы снег і слабая мяцеліца. На дарогах галалёдзіца. Ноччу слупок тэрмометра пакажа 5—12 градусаў ніжэй за нуль. Пры праясненнях — да 15—17 градусаў. Днём тэмпература паветра будзе вагацца ад 0 да мінус 5 градусаў. На паўднёвым захадзе — да 2 градусаў цяпла.

У пачатку наступнага тыдня пахаладае яшчэ больш. У многіх раёнах час ад часу будзе ісці снег. Ноччу тэмпература паветра складзе 5—14 градусаў марозу, пры праясненнях чакаецца мінус 17—23 градусы, днём — ад 0 да 7 градусаў марозу.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НУ І НУ!

РЫБАК СТРАЦІЎ ПРЫТОМНАСЦЬ І ЎМЁРЗ У ЛЁД

73-гадоваму пенсіянеру, які рыбачыў на Мінскім моры, пад вечар раптоўна стала дрэнна, а паблізу нікога не было: да ўчорашняй раніцы пацярпелы праляжаў на лёдзе.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар МНС Віталь Новікаў, знайшлі чалавека і выклікалі выратавальнікаў рыбакі. За ноч пенсіянер паспеў умерзнуць у лёд (яго рука была апушчаная ў лунку). З дыягназам пераахалоджванне і абмаражэнне правай кісці рукі пацярпелы быў дастаўлены ў бальніцу.

Таксама з дыягназам пераахалоджванне ў сталічную бальніцу ўчора трапіў малады мінчанін, якога выратавальнікі выцягнулі з ракі Свіслач у цэнтры Мінска. Гэтае здарэнне адбылося каля пяці гадзін раніцы ў раёне Нямігі. Небараку, які тануў на адлегласці каля шасці метраў ад берага, убачыў іншы хлопец і патэлефанаваў у МНС. На шчасце, выратавальнікі, якія тэрмінова з'явіліся на месцы здарэння, выцягнулі пацярпелага з вады. Цяпер усе акалічнасці апошняга выпадку высвятляюцца.

Ігар ГРЫШЫН.

ПАВЕЦЬ АБРУШЫЛАСЯ. ХЛОПЧЫК ЗАГІНУЎ

У вёсцы Краснаполле Расонскага раёна пад дахам павеці, якая абрушылася, загінуў вучань пятага класа мясцовай школы.

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, трагедыя адбылася а шостай гадзіне вечара. Хлопчык пайшоў у павець і пачаў калоць дровы. Раптам будынак абрушыўся. Сцены павеці, дарэчы, былі амаль што разабраныя. Дзіўна, як канструкцыя плошчай 24 квадратныя метры не абрушылася раней. Суседка хлопчыка — вучаніца 8-га класа, калі ўбачыла, што павець разбурылася, адразу расказала пра гэта фельчару, якая праходзіла недалёка. Тая паведаміла пра здарэнне выратавальнікам. Апошнія, калі даставалі цела хлопчыка з завалу, знайшлі і сабаку, які быў прывязаны да павеці. Сабака застаўся жывы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЛАВІЛІ БРАКАНЬЕРАЎ — ПАТРАПІЛІ НА ЗЛАДЗЮЖАК

Пры абследаванні вадаёма «Сачыўка» на тэрыторыі Баранавіцкага раёна работнікі Слонімскай міжрайінспекцыі заўважылі грамадзян, якія пераносілі каністры ад матавоза да аўтамабіля «Аўдзі». Але як толькі службовая машына інспектараў наблізілася, «Аўдзі» і «след прастыў».

Дзве асобы былі ўстаноўленыя. Імі аказаліся машыніст і складальнік цягнікоў ГП ААТ «Калпеніца». У каністрах знаходзілася дызельнае паліва — усяго 50 літраў. Яго зграбаныя грамадзяне мелі намер перадаць вадзіцелю «Аўдзі».

ЧАРАМША — ПАД ЗАБАРОНАЙ

З сярэдзіны красавіка да пачатку мая на рынках, недзе побач са станцыямі метро, у іншых месцах можна сустрэць у продажы «з рук» чарамшу — рэдкую расліну, занесеную ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, збор якой забаронены.

Рэдкім, як нагадваюць спецыялісты Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, гэтая расліна стала якраз з-за варварскага знішчэння. З пачаткам вясны тысячы людзей прачэсваюць лясы ў пошуках чарамшы, што па смаку нагадвае часнок і, дзякуючы сваім харчовым якасцям, карыстаецца такой папулярнасцю. Сітуацыю ўскладняе тое, што з-за гістарычных прычын, а таксама гаспадарчай дзейнасці чалавека, месцаў, прыдатных для існавання папуляцыі чарамшы, у Беларусі няшмат. Каб захаваць тое, што пакуль маем, Мінпрыроды заклікае грамадзян не толькі не парушаць заканадаўства, якое забараняе збор і продаж гэтай расліны, але і не стымуляваць збор чарамшы пакупкамі яе ў іншых людзей, што ідуць на такія парушэнні. Тым больш што для саміх такіх нарыхтоўшчыкаў, гандляроў прадугледжаны штрафы. А для законапаслухмяных грамадзян інфармацыя да ведама: чарамша добра размнажаецца самасейкай, расліна непатрабавальная і можа вырошчвацца на прысядзібных і дачных участках.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Прамая лінія

ЖЫЛЛЁ НЯДАЎНА ЎВЕДЗЕНА, А ТАМ УЖО... НЕМАГЧЫМА ПРАЖЫВАЦЬ

З ПЯЦІ раёнаў паступілі скаргі на якасць будаўнічых работ падчас «прамой лініі» старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Зянона ЛОМАЦЯ з жыхарамі Гродзенскай вобласці. Ён запэўніў, што кожную заяву праверыць і, калі факты пацвердзяцца, будуць прыняты самыя строгія меры да вінаватых.

— У аграгарадку ў Бераставіцкім раёне нядаўна ўвялі жыллё, а там ужо немагчыма пражываць, — абураны Зянон Ломаць. — Тэлефанавалі па пытанні якасці будаўніцтва жылля таксама з Ліды, Іўя, Зэльвы, Свіслачы. Забудоўшчыкі сёння плацяць вялізныя грошы, бяруць крэдыты пад высокія працэнты. Добра яшчэ, калі крэдыты льготныя. А калі звычайныя, камерцыйныя? Гэта вельмі сур'ёзная тэма, мы разбяромся. Прычым, акрамя якасці, будзем глядзець і па прыпісках. Прывяду адзін прыклад. У Мінску нашы работнікі заняліся адным кааператывам і кошт жылля быў зменшаны на 13 працэнтаў, па 240 тысяч рублёў «знялі» з квадратнага метра.

Старшыня Камітэта дзяржкантролю паабяцаў разабрацца і з сітуацыяй, якая хвалюе шэраг сем'яў на тэрыторыі Тарноўскага сельсавета Лідскага раёна:

— Каля дваццаці гадоў людзі пражываюць у дамах. Засяляліся — былі па сутнасці адны каробкі. Дабудоўвалі, абжывалі. Цяпер хочуць жыллё прыватызаваць, але не могуць, бо па віне кіраўніцтва гаспадаркі, на чыім балансе знаходзіліся гэтыя дамы, на іх няма дакументаў.

Летась Зянон Ломаць правёў 14 «прамых ліній». Каля 500 чалавек размаўлялі непасрэдна са старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю, станоўчае рашэнне прынята па кожным чацвёртым звароце.

Дык што, усе клопаты, у тым ліку і фінансавыя расходы на распрацоўку неабходнай дакументацыі на жыллё павінны класціся на гэтых людзей? Так быць не павінна, лічыць Зянон Ломаць. А канкрэтны шлях вырашэння праблемы будзе вызначаны ў самы бліжэйшы час.

Увогуле за тры гадзіны па «прамой лініі» са старшынёй Камітэта дзяржкантролю пагутарылі 50 чалавек. Яму спадабалася, што «не было злых зваротаў, людзі тэлефанавалі па набалелых пытаннях». Напрыклад, фермер з Навагрудскага раёна яшчэ ў 2008 годзе здаў на крухмальны завод 120 тон бульбы, аднак дагэтуль з ім у поўным аб'ёме не разлічыліся, доўг складае больш за 18 мільёнаў рублёў. А хутка сяўба і вялікія расходы... З гэтай сітуацыяй даручана разабрацца абласному ўпраўленню сельскай гаспадаркі і харчавання.

— Дэталёва разбяромся з кожным зваротам, — сказаў Зянон Ломаць. — Атрымаюць адказы не толькі тыя людзі, з якімі я гутарыў асабіста, але і яшчэ 88 чалавек, якія патэлефанавалі на «прамую лінію», а таксама аўтары пісьмовых зваротаў. Не будуць разглядацца толькі пытанні, звязаныя з рашэннямі судоў, бо гэта не ўваходзіць у нашу кампетэнцыю.

Пры гэтым частка зваротаў на «прамую лінію» будзе разгледжана ў міністэрствах і ведамствах, а некаторыя будуць неўзабаве прааналізаваныя Камітэтам дзяржкантролю, у прыватнасці, па выкананні праграмы па развіцці інфраструктуры Аўгустоўскага канала.

Пасля завяршэння «прамой лініі» Зянон Ломаць наведаў некалькі прадпрыемстваў, дзе цікавіўся пытаннямі імпартазамяшчэння і замацавання на рынках айчыннай прадукцыі. Гэтыя пытанні старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю лічыць першачарговымі:

— Мы завозім у краіну тое, што можам выраблять самі. І часта завозім тое, што самі выраблям. Напрыклад, маюцца факты ўвозу з-за мяжы сродкаў аховы раслін, хоць сёння мы ў стане амаль цалкам забяспечыць пестыцыдамі патрэбы краіны. Гэта датычыцца і кансервантаў, што выкарыстоўваюцца пры нарыхтоўцы кармоў. Некаторыя фірмы так «раскруціліся» па імпарце... Хоць кансерванты, якія вырабляюцца нашымі прадпрыемствамі, у два, тры, а то і ў пяць разоў таннейшыя за тыя, што завозяцца. Хто гэта не зразумее — будзе адказваць, як кажуць, па поўнай праграме, парадак будзе наведзены.

Зянон Ломаць лічыць таксама ненармальнай сітуацыю, калі на прылаўках нашых крамаў не бачыш у поўным асартыменце айчыннай прадукцыі. І не толькі таму, што на прадпрыемствах, дзе яна вырабляецца, працуем і атрымліваем зарплату мы, нашы сваякі і знаёмыя:

— Некаторыя кідаюцца на прыгожую ўпакоўку, нягледзячы на цану і вагу. Таму глядзіце, колькі там гэтай прадукцыі. У нас, згодна са стандартамі, запаўняльнасць павінна быць не меншай за 70 працэнтаў, а ў імпартнай упакоўцы, здараецца, бывае і 20 працэнтаў. А цана? Сачыце і за якасцю. Я магу гарантаваць, што амаль на сто працэнтаў сёння наша айчынная прадукцыя якасная, бо патрабаванні да якасці прадуктаў харчавання вельмі строга кантралююцца і службай Дзяржстандарта, і нашым камітэтам. Тады як у некаторых краінах дзейнічаюць не стандарты, а тэхнічныя ўмовы, якія вызначаюцца непасрэдна вытворцам. І колькі чаго ўкласці ў тыя ж пельмені ці сокі — вырашае вытворца і, па сутнасці, няма належнага кантролю. Таму купляйце беларускае!

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ІТАЛЬЯНСКІЯ ЧЫНОЎНІКІ АТРЫМЛІВАЛІ ПРАСТЫТУТАК У АБМЕН НА КАНТРАКТЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ САМІТУ G8

Італьянскія чыноўнікі, адказныя за падрыхтоўку саміту «Вялікай васьмёркі» ў Акviле ў 2009 годзе, атрымлівалі магчымасць карыстацца паслугамі прастытутак у абмен на выгадныя будаўнічыя кантракты. У карупцыйнай схеме ўдзельнічалі 350 жанчын, заявілі ў чацвер следчыя. Маштаб справы пра «сэксуальныя паслугі ў абмен на добразычлівасць», у якім, як лічылася раней, былі задзейнічаны ўсяго тры ці чатыры прастытуткі, стане новым ударам для прэм'ер-міністра Італіі Сільвіа Берлусконі, піша The Times.

Следчыя заявілі, што праслухалі тэлефонныя гутаркі і раскрылі іншыя сведчанні, якія пацвярджаюць, што жанчыны — уключаючы рускіх, украінак, венесуэлак, бразільянак, кубінак і італьянак — атрымлівалі прыкладна па 700 еўра за сустрэчы на прыватных вечарынках і ў кватэрах па ўсёй Італіі. У некаторых выпадках узнагарода складала да 5 тысяч еўра.

ЯНУКОВІЧ ЗАГАДАЎ ПРАВЕРЫЦЬ, КУДЫ ІШЛІ ГРОШЫ ПРЫ ЎРАДЗЕ ЦІМАШЭНКІ

Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч ініцыяваў міжнародную праверку выкарыстання ўрадам Юліі Цімашэнкі міжнародных крэдытаў, а таксама рэсурсаў рэзервовага і стабілізацыйнага фондаў. Ён таксама даручыў генеральнаму пракурору краіны Аляксандру Мядзведзьку выявіць прычыны «ігнаравання» ўрадам законаў, якое «мела месца ў папярэднія гады».

У сваю чаргу, Мядзведзька падкрэсліў, што пракуратура апратэставала больш сотні пастаноў кабінета міністраў Цімашэнкі. «Ва ўрадзе не знаходзіліся сродкі на барацьбу з беднатой. Самымі высокімі ўрадавымі чыноўнікамі ігнараваліся патрабаванні закона пра павышэнне сацыяльных стандартаў», — заявіў генпракурор. Акрамя таго, як падкрэсліў Мядзведзька, урадам «тройчы незаконна вызваляліся ад выплаты ўзносаў у Пенсійны фонд і іншыя сацыяльныя фонды, вуглездабыўныя прадпрыемствы». Усяго, паводле яго слоў, у Пенсійны фонд не выплачана 3,5 млрд грыўняў паловай прадпрыемстваў вугальнай галіны.

НАЗАРБАЕЎ ЗАБАРАНІЎ АДЗНАЧАЦЬ ЯГО ЮБІЛЕЙ

Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў катэгарычна забараніў кіраўнікам абласных адміністрацый адзначаць яго 70-гадовы юбілей, паведамляе ІА «Навіны-Казахстан».

«Ніякага афіцыйнага юбілею прэзідэнта, ніякіх урачыстых мерапрыемстваў па ўсёй краіне не будзе, гэта загад, майце на ўвазе!» — заявіў кіраўнік дзяржавы на нарадзе з акімамі абласцей. Таго, хто парушыць яго забарону, Назарбаеў паабяцаў зняць з пасады. «Ніякіх там падарункаў, вытворчых, жыццёвых і гэтак далей», — дадаў ён.

Прэзідэнт дадаў, што 6 ліпеня, калі яму спаўняецца 70 гадоў, будзе «звычайным днём горада». Нагадаем, што 6 ліпеня адзначаецца таксама Дзень сталіцы.

Раней Нурсултан Назарбаеў, нагадаем, адмовіў ініцыятыву дэпутатаў, якія прапанавалі перайменаваць сталіцу краіны ў Нурсултан. Ён таксама адмовіўся прыняць званне Героя Працы. Тым часам да юбілею прэзідэнта, як паведамляў тэлеканал КТК, ужо здымаецца фільм, прысвечаны дзяцінству Нурсултана Назарбаева. Акрамя таго, прадстаўнікі сената прапанавалі абвясціць да яго 70-годдзя маштабнае святкаванне.

«БІЗНЭС» НА МІГРАНТАХ

Шэраг крымінальных спраў заведзена ў дачыненні да ўраджэнца Лівана, які за грошы арганізаваў незаконную перапраўку праз Беларусь у краіны Еўрасаюза каля 100 чалавек.

Як адзначаюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, крымінальны бізнэс абвінавачаны ажыццяўляў з 2006-га па лістапад 2009 года шляхам махлярства і распаўсюджання падробных візаў краін Шэнгенскага пагадненя. Кліентаў для зламысніка, які, між іншым, пражываў на тэрыторыі нашай краіны з 1979 года, адшукалі саўдзельнікі: ахвотных яны знаходзілі ў краінах Блізкага Усходу і Афрыкі, пасля чаго праз інтэрнэт і іншыя сродкі сувязі давалі іх пашпартныя звесткі.

А для прыкрыцця супрацьзаконнай дзейнасці арыштаваны выкарыстоўваў ілжэпрадпрымальніцкую камерцыйную структуру, заснавальнікам і дырэктарам якой з'яўляўся сам. Акрамя таго, да «бізнэсу» ён прыцягваў іншых суб'ектаў гаспадарання краіны, сярод якіх былі і турыстычныя. Выкарыстоўваючы іх рэквізіты, мігранты атрымлівалі хадатайніцтвы-запрашэнні і турыстычныя ваўчары, у якіх пазначаліся несапраўдныя звесткі наконт мэты прыезду ў Беларусь, напрыклад, «вывучэнне рынку краіны».

У краіну замежнікі прыбывалі без рэгістрацыі альбо па фіктыўнай рэгістрацыі па месцы жыхарства знаёмых і даверaных асобаў, а таксама рэгістрацыі па розных адрасах без ведама і ўдзелу іх уладальнікаў. У наступным мігранты пакідалі краіну без афармлення выязных візаў Беларусі і візаў краін Шэнгенскага пагаднення, па падробных дакументах. Як падкрэслілі ў МУС, зламыснік падазраецца не толькі ў арганізацыі незаконнай міграцыі грамадзян і асобаў без грамадзянства ў Беларусі, падробцы дакументаў і іх выкарыстанні, махлярстве, але таксама ў лжэпрадпрымальніцтве, атрыманні хабару, злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі.

Ігар ГРЫШЫН.

Ну і ну!

180 ЧУЖЫХ РУЖАЎ У ПАДАРУНАК... АД РАМАНТЫЧНАГА САНТЭХНІКА



42-гадовы сантэхнік віншаваў жанчын са святам 8 Сакавіка ружамі, якія да таго «экспрапрыіраваў» у знаёмага.

Пра рамантычнага сантэхніка карэспандэнту «Звязды» распавёў **прэс-афіцэр Кастрычніцкага РУУС Сяргей ЧАБАТАРОЎ.** Каму ж не пашанцавала ў гэтай гісторыі — гэта гандляру кветкамі, асноўнай крыніцай заробку якога быў іх продаж. Апошні напярэдадні жаночага свята закупіў буйную партыю цюльпанаў і руж, якія па дамоўленасці з ЖЭСам захоўваў у падвальным памяшканні дома па вуліцы Жукоўскага. З часткай тавару ён і патрапіўся на вочы нецвярозаму сантэхніку, які па старой памяці папрасіў падараваць некалькі кветак для сваёй жонкі. Натуральна, гандляру такая прапанова не вельмі спадабалася. Тады пакрыўджаны мужчына вырашыў узяць кветкі сам: ён ведаў, дзе яны захоўваюцца, і вынес 180 штук ружаў. Пасля нецвярозы сантэхнік хадзіў па раёне і дарыў кветкі жанчынам. Між іншым, шыкоўныя букеты атрымалі жонка рамантыка і ўсе супрацоўніцы ЖЭСа. Што датычыцца пацярпелага гандляра, то ён, выявіўшы прапажу, звярнуўся ў міліцыю. У выніку па гэтым факце заведзена крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НЕ ЗАДАВОЛЕНЫ СТАНАМ І ТЭНДЭНЦЫЯМІ РАЗВІЦЦЯ ХАКЕЯ Ў БЕЛАРУСІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка не задаволены цяперашнім станам і тэндэнцыямі развіцця хакея ў Беларусі. Аб гэтым ён заявіў на нарадзе па пытаннях развіцця айчыннага хакея з шайбай, перадае БЕЛТА.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, за гэтай нарадай будзе яшчэ шэраг нарад на спартыўную тэматыку. Цяпер размова пойдзе пра хакей і пра ўсё, што звязана з зімовымі відамі спорту, затым адбудзецца сур'ёзная размова ў рамках агульнага сходу НАК, будзе абмеркаваны ход падрыхтоўкі да маючай адбыцца летняй Алімпіяды ў Лондане.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на нарадзе размова ідзе пра хакей не таму, што, як прынята лічыць, гэта любімы від спорту Прэзідэнта, а таму што для гэтага ёсць некалькі важкіх прычын. Першая — гэта выступленне на Алімпіядзе ў Ванкуверы. «У мяне гэта выступленне выклікае не толькі заклапочанасць, але і незадаволенасць з-за адсутнасці вывераных стратэгіі развіцця хакея напярэдадні маючага адбыцца чэмпіянату свету 2014 года ў Мінску», — сказаў Прэзідэнт.

Па-другое, прадоўжыў ён, Алімпійскія гульні прыходзяць і адыходзяць, але напярэдадні чэмпіянат свету па хакеі ў Германіі. Таму, упэўнены Аляксандр Лукашэнка, расслабляцца ні ў якім выпадку нельга. «Але калі мы будзем так гуляць, як у Ванкуверы, то лепш туды ўвогуле не ехаць і сядзець дома. У Солт-Лейк-Сіці мы былі чацвёртыя, а ў Ванкуверы ці то дзявятыя, ці то дваццатыя. Найгорш, што мы апынуліся невядома дзе», — заўважыў ён.

Акрамя таго, паводле слоў Прэзідэнта, неабходна сур'ёзна разглядзець пытанні далейшага функцыянавання мінскага хакейнага клуба «Дынама». «Калі мы будзем і ў наступным годзе гуляць так, як гулялі ў гэтым годзе ў КХЛ, то лепш гэтыя грошы патраціць на развіццё хакея ўнутры краіны, чым падарожнічаць ад Уладзівастока да Брэста па прасторах былога СССР», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што каманда («Дынама» (Мінск). — Заўвага БЕЛТА) гуляць магла, што відаць па асобных матчах, аднак гуляла настолькі няроўна, што гэта сведчыць аб безадказнасці як кіраўніцтва Федэрацыі хакея, каманды, так і саміх ігракоў.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу дзяржава не можа сабе дазволіць траціць вялікія сродкі, якія выдзяляюцца на хакей, упустую. Таму ў далейшым, папярэдзіў ён, на вялікія грошы без эфектыўнай аддачы разлічваць не трэба. «У хакей сёння не іграюць — у хакей сёння б'юцца, асабліва на Алімпіядзе і чэмпіянатах свету, а вы ўсе едзеце пагуляць», — адзначыў Прэзідэнт, звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады. Што датычыцца зарплат хакеістаў, то, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, дай Бог кожнаму такую зарплату, якую мае ў сярэднім хакеіст у Беларусі.

Каментуючы прапановы, якія раней былі агучаны шэрагам спецыялістаў аб тым, каб дадаткова да мінскага клуба «Дынама» дзелегаваць для ўдзелу ў розыгрышы КХЛ клуб «Юнацтва» (Мінск), а магчыма, і нейкую трэцюю каманду, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што не супраць гэтага, але толькі тады, калі першая каманда заваюе хоць бы бронзавыя медалі. Таму, прадоўжыў ён, размовы аб тым, каб накіраваць яшчэ адну каманду, трэба спыніць. «Калі ў некага ёсць грошы, то, калі ласка, плаціце і гуляйце», — сказаў Прэзідэнт, падкрэсліўшы, што дзяржава акажа дапамогу толькі тады, калі будуць добрыя вынікі.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў упушчэнні і ў развіцці дзіцяча-юнацкага хакея. У прыватнасці, на пяршынствах свету юнацкая каманда 18-гадовых хакеістаў выступае нестабільна, то выбываючы з вышэйшага дывізіёна, то вяртаючыся ў яго. Аналагічная сітуацыя складваецца з юніёрскай камандай ва ўзросце да 20 гадоў. Калі ў 2004—2007 гадах яна пераходзіла з першага ў вышэйшы дывізіён, то апошнія тры гады запар яна апусцілася на 13-е месца. З усяго гэтага вынікае, лічыць Аляксандр Лукашэнка, што да гэтага часу Федэрацыяй хакея, Міністэрствам спорту і турызму, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам не сфармулявана дакладная сістэма і не прыкладаюцца належныя намаганні для выхаду дзіцяча-юнацкага хакея на сусветны ўзровень.

«Узровень гульні камандаў зусім невысокі. Людзі не настроены на барацьбу, няма сучаснага хакея. Усе бачылі, як гуляюць амерыканцы і канадцы на Алімпіядзе: барацьба не тое што на кожным метры, але на кожным сантыметры пляцоўкі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Рэгіянальныя антыманапольныя структуры ў Беларусі цяпер будуць падпарадкоўвацца непасрэдна кіраўніцтву выканкамаў

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 149 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 мая 1999 г. № 285 і ад 23 кастрычніка 2006 г. № 631».

Нарматыўны акт падрыхтаваны ў мэтах павышэння ролі органаў антымонапольнага і цэнавага рэгулявання, якія абавязаны процістаяць фактам нядобрасумленнай канкурэнцыі.

У адпаведнасці з указам прадугледжваецца рэарганізацыя існуючай структуры камітэтаў эканомікі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама шляхам выдзялення са складу гэтых камітэтаў упраўленняў цэнавай палітыкі і падпарадкавання іх непасрэдна кіраўніцтву названых выканкамаў. Такім чынам, на мясцовым узроўні будуць створаны органы антымонапольнага рэгулявання, якія ў поўнай меры змогуць выкарыстоўваць інструменты, прадугледжаныя заканадаўствам.

Гэта ўзмоцніць уплыў дзяржавы на антыманапольныя і цэнавыя працэсы, павысіць эфектыўнасць функцыянавання мясцовых таварных рынкаў і аператыўнасць мераў, што прымаюцца па процідзеянні нядобрасумленнай канкурэнцыі.

Указ уступае ў сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання, за выключэннем некаторых пунктаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

СЕЗОН ПАЛЯВАННЯ СЁННЯ УСЁ Ж РАСПАЧЫНАЕЦЦА...

Як мы паведамлялі раней, згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і паляванне, з гэтай суботы ў краіне павінен распачацца сезон палявання на гусей. Не першы год запар напярэдадні яго адкрыцця гучаць заклікі забараніць паляваць увесну на гэтых птушак. Не стаў выключэннем і гэты год. Праўда, у адрозненне ад мінулых разоў, калі вяліся такія ж размовы і дыскусіі, цяпер літаральна напярэдадні адкрыцця сезона з'явілася больш-менш акрэсленая інфармацыя на гэтую тэму.

Так, прагучала, што Савет Міністраў накіраваў на разгляд у Адміністрацыю Прэзідэнта праект указа са змяненнямі ў Правілы вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання ў частцы абмежавання веснавога палявання на вадаплаўную птушку на асобных тэрыторыях краіны. З гэтай мэтай запланавана правесці даследаванні асноўных шляхоў масавай міграцыі вадаплаўных птушак у краіне. Але ж і працэдура разгляду і ўнясення магчымых змяненняў у Правілы, гэтак жа як і вывучэнне асноўных шляхоў масавай міграцыі птушак — задача не аднаго дня? А сезон палявання павінен распачацца літаральна сёння...

— Да прыняцця змяненняў паляванне на вадаплаўную птушку будзе праводзіцца па-ранейшых Правілах. Таму з суботы дазволена паляваць на гусей — шэрых, белалобых, гуменніка, — патлумачыла на запыт рэдакцыі начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Наталля МІНЧАНКА. — Насамрэч сутнасць тут не столькі ў правядзенні неабходных даследаванняў асноўных шляхоў масавай міграцыі: на большасці тэрыторыі краіны яны ўжо вядомыя. Сутнасць, хутчэй, у даволі працяглай працэдуры — ад унясення прапаноў, іх разгляду, узгаднення магчымых змяненняў паміж шэрагам міністэрстваў і ведамстваў, праходжанні экспертызы і рэгістрацыі іх да з'яўлення афіцыйнага дакумента. Гэта праца, думаю, будзе праведзена на працягу гэтага года, так што веснавы сезон палявання на птушку пройдзе без зменаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Працяг тэмы — на 3-й стар.

15 сакавіка — Сусветны дзень абароны спажыўцоў

ПРАДАЎЦАМ НЕ ПАДАБАЕЦЦА МЕЦЬ СПРАВУ З АДУКАВАНЫМІ ПАКУПНІКАМІ?

«Якасць тавараў і паслуг — знак якасці жыцця!» — менавіта пад такім дэвізам пройдзе ў Беларусі ў Год якасці Сусветны дзень абароны спажыўцоў

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Як паведаміла на прэс-канферэнцыі з нагоды свята **намеснік міністра гандлю нашай краіны Ірына НАРКЕВІЧ,** прыкладна 80 працэнтаў усіх скаргаў, што паступаюць у іх ведамства, звязаныя з нездавальняючай якасцю нехарчовых тавараў. «Лідзіруюць» у гэтым спісе абутак, адзенне, тэлефонныя апараты і іншыя складанатэхнічныя тавары. Скардзяцца таксама спажыўцы на няякасныя медыцынскія, жыллёва-камунальныя, транспартныя, будаўнічыя, турыстычныя і адукацыйныя паслугі. А вось скаргаў на харчовыя тавары стала апошнім часам значна менш. На думку Ірыны Наркевіч, гэта сведчыць, у першую чаргу, пра больш якасную работу беларускіх вытворцаў і ўкараненне на вытворчасці сертыфікаваных сістэм менеджменту якасці. Прычым часцей за ўсё прэтэнзіі да якасці прадуктаў харчавання звязаныя з парушэннем тэрмінаў і ўмоў іх захоўвання ў прадпрыемствах гандлю.

У Беларускае таварыства абароны спажыўцоў летась звярнуліся больш як 20 тысяч грамадзян. З кожных шасці зваротаў, што паступаюць да юрыстаў грамадскага аб'яднання, чатыры датычацца нездавальняючай якасці складанатэхнічных тавараў, з іх кожныя дзве скаргі — мабільных тэлефонаў, набытых у інтэрнэт-крамах.

— Напрыклад, спажывец не можна знайсці прадаўца ці ў прадаўца не заключаны дагавор з сэрвісным цэнтрам, які, у сваю чаргу, адмаўляе спажыўцу ў гарантыйным абслугоўванні, — расказала журналістам **старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна СУША.** — Нярэдкія выпадкі, калі ў дакументах адсутнічае кошт мабільнага тэлефона, таму ў выпадку скасавання дагавора куплі-продажу спажыўцу праблематычна вярнуць свае грошы.

Ганна Суша падкрэсліла, што спажывец мае права на якасныя тавары і атрыманне якасных паслуг не толькі ў Год якасці. Ён сваімі грашыма аплачвае тавар і мае права патрабаваць ад вытворцы ці прадаўца высокую якасць гэтага тавару. Невыпадкова Сусветная арганізацыя абароны спажыўцоў прапанавала правесці сёлета Дзень спажыўцоў пад дэвізам «Нашы грошы — нашы правы». Ганна Суша з задавальненнем адзначыла, што адукаванасць беларусаў у правах спажыўцоў істотна палепшылася, прычым як гараджан, так і жыхароў сельскай мясцовасці. Беларускія спажыўцы сталі больш непрымірымымі да тых недахопаў, з якімі ім даводзіцца сутыкацца ў сферы бытавых паслуг і гандлю. Зразумела, што адукаванасць прадаўцоў не можа спадабацца прадстаўнікам гандлю і сферы паслуг, але назад дарогі ўжо не будзе. Ва ўмовах рынку пры наяўнасці канкурэнцыі на першае месца павінен выйсці менавіта спажывец. І трэба прымусіць усіх лічыцца са спажывецкім заканадаўствам.

Як вядома, у студзені 2009 года ўвайшла ў сілу новая рэдакцыя Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў». Не сакрэт, што новым законам задаволены далёка не ўсе, паколькі ён дае больш правоў спажыўцам у параўнанні з прадаўцамі, вытворцамі ці выканаўцамі паслугі. У лексіконе прадаўцоў нават з'явіўся тэрмін «спажывецкі экстрэмізм».

— Мы лічым, што ў спрэчцы паміж спажыўцом і аб'ектам гандлю ці спажыўцом і вытворцай менавіта спажывец знаходзіцца ў найменш выйгрышным становішчы, — упэўнена Ірына Наркевіч, — таму і трэба клапаціцца найперш пра тое, каб абараніць інтарэсы спажыўца. Хтосьці са спажыўцоў пасіўна адстойвае свае правы, а хтосьці ідзе да канца, праяўляе актыўнасць. Магчыма, не заўсёды патрабаванні і скаргі спажыўца бываюць абгрунтаванья. І ў гэтым выпадку прадаўцы могуць сябе адукавана абараніць, зразумела, у рамках дзейнага заканадаўства.

Напрыканцы студзеня мінулага года ўвайшоў у дзеянне таксама абсалютна новы Закон «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг». У Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі канстатуюць, што з яго ўвядзенне павысілася адказнасць усіх структур, асабліва за разгляд зваротаў грамадзян.

— Звароты грамадзян — гэта лакмусавая паперка якасці паслуг, што аказваюцца нашымі арганізацыямі, — прызнаецца **начальнік упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Эдмунд ГРЫШКАВЕЦ.** — Не буду хаваць: асабліва нас непакояць паўторныя звароты грамадзян, якія сігналізуюць пра тое, што праблема чалавека не вырашылася. На шчасце, летась колькасць паўторных зваротаў скарацілася на 13 працэнтаў, а вось колькасць усіх зваротаў крыху ўзрасла — недзе ў межах трох працэнтаў. Мы аналізуем структуру ўсіх зваротаў. Прыкладна 20 працэнтаў звязаныя з атрыманнем грамадзянамі інфармацыі тлумачальнага характару: як правільна плаціць, якія дзейнічаюць тарыфы і гэтак далей. Сярод скаргаў пераважаюць звязаныя з правядзеннем рамонтных работ і эксплуатацыяй жыллёвага фонду (53 працэнты). 14 працэнтаў скаргаў аб праблемах з водазабеспячэннем, хоць аварыйнасць і па водазабеспячэнні, і па электразабеспячэнні ў нас знізілася. Скаргаў на ацяпленне стала прыкметна менш. Умовы надвор'я апошняй зімы былі вельмі падобныя на зіму 1995/1996 гадоў, таму мы і параўноўвалі сёлетнюю сітуацыю менавіта з той зімой. У гэты раз колькасць скаргаў на праблемы з ацяпленнем жыллёвага фонду была меншая на 60 працэнтаў. Мяркуем, што свой плён прынесла ўкараненне прыборнага ўліку цяпла і сістэм аўтаматычнага рэгулявання ацяплення.

Эдмунд Грышкавец паведаміў: у Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі аналізуюць усе крытычныя артыкулы, што з'яўляюцца ў сродках масавай інфармацыі. Дарэчы, 2/3 усіх артыкулаў, якія датычацца работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны, носяць менавіта крытычны характар. «Мы ўдзячныя журналістам за крытыку, і, спадзяюся, робім з яе правільныя высновы...», — дадаў прадстаўнік галіновага міністэрства.

Надзея НІКАЛАЕВА.

КАБ ЗАРЭГІСТРАВАЦЬ АЎТАМАБІЛЬ, ДАСТАТКОВА ГАДЗІНЫ?

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Надзея ДРЫЛА наведала новы Цэнтр па рэгістрацыі аўтатранспарту для фізічных асобаў, якія адчыніўся ў Мінску

Сучасны цэнтр знаходзіцца на вуліцы Ціміразева ў раёне гандлёвага дома «Ждановічы». Створаны сумесныя намаганнямі Дзяржаўтаінспекцыі і адміністрацыі гэтага гандлёвага прадпрыемства.

Усё пачынаецца з таго, што кіроўца са спецыяльным талонам прыязджае на пляцоўку для агляду аўтамабіля. Там супрацоўнік ДАІ адразу звярае нумарныя агрэгаты. Пасля гэтай працэдуры з адпаведнымі дакументамі чалавек крочыць у будынак Цэнтра. Там ва ўтульнай зале раздрукоўвае нумарны талончык і чакае сваёй чаргі. На ўласныя вочы пераканалася, што нумар акенца, да якога трэба падысці, на электронным табло загараецца менш як праз хвіліну. Аўтаўладальнік тут жа, нікуды не выходзячы, афармляе ўсе неабходныя дакументы і ўносіць плацяжы. Пасля гэтага чакае.

— Пакуль што працэдура рэгістрацыі ў новым падраздзяленні займае каля гадзіны, — паведаміў **намеснік начальніка УДАІ МУС Беларусі Максім ПАДБЯРОЗКІН.** — У хуткім часе плануецца скараціць яе да 30 хвілін.

Каб гадзіна праляцела хутчэй, у цэнтры працуюць пункты грамадскага харчавання, дзе можна перакусіць, папіць кавы, гарбаты. Больш за тое, у той жа зале размяшчаецца офіс па аўтастрахаванні. А паблізу ў суседнім будынку можна ў той жа дзень прайсці тэхагляд.

— Аказваем аўтаўладальнікам і новую паслугу зняцця і ўсталявання дзяржаўных нумароў на машыну, — расказаў **Генадзь ПАДБЯРЭЗНЫ, дырэктар ГЦ «Ждановічы».** — Выслухоўваем пажаданні людзей. Прасілі павялічыць колькасць лавак — павялічылі. Вось бачыце (паказвае), мы нават не прыкручвалі лаўкі, каб людзі змаглі паставіць іх так, як менавіта ім зручна. Наогул мы працуем па японскай методыцы: спачатку прытоптваем сцяжынку, а толькі пасля яе асфальтуем.

— Рэгістрацыйны цэнтр такога плана, але больш сціплы, ёсць ужо ў Наваполацку, — адзначыў **старшы інспектар па асобых даручэннях аддзела рэгістрацыйна-экзаменацыйнай дзейнасці і тэхнічнага нагляду УДАІ МУС Беларусі Дзмітрый ГАРЫНОВІЧ.** — Па прынцыпе электроннай чаргі ён ужо працуе больш за год. Паказаў сябе станоўча, людзі задаволеныя. Вось у Год якасці і вырашылі парадаваць аўтаўладальнікаў горада Мінска.

Паводле слоў Максіма Падбяразнікаў, прыкладна 20 працэнтаў аўтамабіляў — гэта свята для чалавека і яго сям'і, якое не павінна быць азмрочаным доўгімі чэргамі і нязручнымі працэдурамі. Таму Дзяржаўтаінспекцыя і надалей будзе старацца ствараць зручныя і камфортныя ўмовы для людзей.

У найбліжэйшы час падобны цэнтр, плануецца, з'явіцца ў Дзяржынску. Гэта будзе спрыяць больш яксаснаму абслугоўванню жыхароў гэтага рэгіёну. Астатнія падраздзяленні, якія займаюцца рэгістрацыяй транспарту, будуць па меры магчымасці мадэрнізавацца.

— Усяго ў краіне маецца 43 падраздзяленні, якія займаюцца рэгістрацыяй транспарту, — паведаміў Дзмітрый Гарыновіч. — Штодзень пярвічна рэгіструецца больш за паўтары тысячы транспартных сродкаў. У прыватнасці, у Мінску зарэгістраваць аўтамабіль фізічная асоба можа ў Ждановічах і на Сярова. На «Аквабеле» цяпер можна толькі зняць транспартны сродак з уліку.

* * *

За два няпоўныя дні паслугамі цэнтра скарысталася каля тысячы чалавек. Цікава, а што думаюць яны наконт новага цэнтра?

Андрэй ЦІТАВЕЦ: «Цудоўная ідэя. Часта мяняю машыны, таму і афармляць даводзіцца іх пастаянна. Раней нязручна было. Чэргі былі вялікія. Трэба было займаць чаргу, пры гэтым нельга было нікуды адысці, каб не прахукаць яе. Акрамя таго, цяпер не трэба страчваць час на хаду, тут усё знаходзіцца ў адным месцы. Нумары чакаў недзе гадзіну. Тут аўтарынак на месцы, набыў люстэрка ў машыну. Таму гадзіна праляцела незаўважна».

Аляксей і Святлана ПЛЮШЧОВЫ: «Вельмі спадабалася, усё проста і зразумела, ніякіх затрымак. Не было чаргі нідзе: ні пры плацяжах, ні пры прыёме дакументаў, ні пры выдачы. Здалі дакументы і ўжо праз гадзіну атрымалі нумары. Раней жа на гэту працэдуру патрэбна было страчваць цэлы працоўны дзень. Даводзілася адпрошвацца з працы».

Генадзь КІСЕЛЬ: «З электронай чаргой даводзілася мець справу толькі за мяжой. Гэта, на мой погляд, самая лепшая форма абслугоўвання. Я афармляю не першы аўтамабіль у сваім жыцці. Таму ёсць з чым параўнаць. Вельмі правільны падыход. Усё проста, даступна, хутка. У акне максімум пяць хвілін стаяў. Культурны персанал, які ветліва падкажа, калі нешта незразумела».

МЕДЫК ЛІШНІМ НЕ БЫВАЕ

Рынак працы

У адрозненне ад аператара ПЭВМ, цырульніка і сакратара

У пачатку сакавіка ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя ў Беларусі складаў 0,9 працэнта ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Пры гэтым, як паведаміла карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзела рынку працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Галіна Грынчук, у цэлым па краіне налічвалася 43,5 тыс. беспрацоўных, і ў той жа час службы занятасці мелі звесткі аб наяўнасці 36 тысяч вакансій.

Паводле звестак міністэрства, найбольш запатрабаванымі ў найманікаў застаюцца рабочыя прафесіі — у цэлым па краіне на іх прыпадае каля 70 працэнтаў вакансій. Прычым выпадае казаць аб існаванні своеасаблівага «рэйтынгу папулярнасці». Так, у цэлым па гарадах Беларусі колькасць заявак на машыністаў бульдозера перавышае колькасць беспрацоўных прадстаўнікоў гэтай спецыяльнасці ў 12,9, на машыністаў экскаватара — у 10,3, муляраў — у 3,5, мантажнікаў і электраманцёраў — у 3,1, на слесараў-сантэхнікаў — у 1,9, токараў і тынкоўшчыкаў — у 1,7, вадзіцеляў аўтамабіля — у 1,5 раза. Што да спецыялістаў і служачых, то сярод іх у гарадах адзначаецца найбольш высокая запатрабаванасць ва ўрачах (перавышэнне колькасці вакансій над колькасцю беспрацоўных — у 27,2 раза), медыцынскіх сёстрах (8,1) і інжынерах-канструктарах (у 3 разы).

Адначасова ў «топ-ліст» найбольш неабходных прафесій у сельскай мясцовасці ўваходзяць механізатары (колькасць заявак наймальнікаў на іх большая за колькасць беспрацоўных у 20,7 раза), аператары машыннага даення (5,1), трактарысты (3,9), токары (2,9), электраманцёры (2,5), жывёлаводы (1,7), вадзіцелі (1,5), а таксама тыя ж урачы (35,3), медсёстры (13,1), ветурачы (9,9) і заатэхнікі (7,9 раза).

Праўда, пры гэтым выпадае казаць і аб найбольш «праблемных» прафесіях. Як паказаў аналіз, значныя цяжкасці ў працаўладкаванні ў гарадах у аператараў ПЭВМ (тут наадварот колькасць беспрацоўных перавышае колькасць вакансій у 14,3 раза), цырульнікаў (10), сакратароў (8,8), кладаўшчыкоў (5,4), майстроў па манікюры (2,3), барменаў (2), вязальшчыц (1,7), слесараў па рамонце аўтамабіляў (1,3), а таксама ў юрыстаў (4), выкладчыкаў (3,8), эканамістаў (3,6), бухгалтараў (3,2), тэхнікаў (2,9) і менеджараў (2,4 раза). У сельскай мясцовасці ў падобны спіс уваходзяць кухары (на 1 вакансію прыпадае больш чым 6 беспрацоўных), гандляры (2,1), зноў-такі сакратары (4), эканамісты (2,9), бухгалтары (2,6) і юрысты (2,2 умоўнага прэтэндэнта на кожнае свабоднае месца). Зрэшты, заўважыла Галіна Грынчук, такі малюнак атрымліваецца ў цэлым па краіне, інакш кажучы, сітуацыя з попытам і прапановамі ў асобных рэгіёнах можа адрознівацца.

Сяргей ГРЫБ.

Абзац

◢ У Гомельскай вобласці з 6 па 11 сакавіка пад коламі цягнікоў загінулі мужчына і тры жанчыны. Усе НЗ адбыліся пры перасячэнні чыгуначнага палатна ў нявызначаным месцы. Людзі імкнуліся скараціць шлях, а скараціл сабе жыццё.

◢ **Каля Br3,7 млн знікла з кватэры 81-гадовай жыхаркі Рагачова пасля візіту дзвюх дзяўчын, якія назваліся работніцамі сацыяльнага забеспячэння. Міліцыя шукае махлярак.**

Поўны абзац

◢ У турме Саа-Гансала ў бразільскім штаце Рыа-дэ-Жанэйра «вартавымі сабакамі» служыць... пара гусей. «Гусіны патруль» заступіў на вахту прыкладна год таму, і з той пары ў турме не было адзначана ніводнай спробы заключаных пакінуць камеры без дазволу. На самае малое парушэнне звыклага парадку ў дварыны гусі рэагуюць гучным гагатаннем, якое чуваць нават у самых далёкіх памяшканнях. Самца, якому далі мянушку «Дэтэктыў», і яго сяброўку наглядальнікі песцяць прысмакамі і халоднын душам.

◢ **Жанчына-фармацэўт з аптэкі Lloyd's у брытанскім горадзе Шэфілд адмовілася прадаць 38-гадовай наведвальніцы таблеткі для кантрацэпцыі. Супрацоўніца аптэкі аргументавала сваю адмову рэлігійнымі перакананнямі. Жанчына прапанавала кліентцы звярнуцца ў іншую аптэку. Астатнія супрацоўнікі аптэкі выглядалі збянтэжанымі, але не сталі пярэчыць фармацэўту. Як высветлілася, аптэкарка, якая адмовілася прадаваць таблеткі, не працуе ў аптэцы на пастаяннай аснове. Яна толькі часам замяняе супрацоўнікаў, якія не могуць выйсці на працу.**

◢ Шэсць жыхарак амерыканскага штата Нью-Джэрсі былі шпіталізаваныя пасля выкананай шарлатанам працэдуры павелічэння ягадзіц. Непасрэдны прынынай шпіталізацыі шасці эмігрантак з Дамініканскай Рэспублікі сталі інфекцыі, якія развіліся на глебе ін'екцый «шэрагу невядомых матэрыялаў» у ягадзіцы. «Пластычны хірург», які не мае ліцэнзіі, з найбольшай верагоднасцю, уводзіў пацыенткам сумесь тэхнічнага сілікону, вазеліну і будаўнічага герметыку. Працэдуры праводзіліся ў прыгарадных гатэлях. Ін'екцыі ўскладніліся нагнойваннем скуры і мяккіх тканак. Цяпер усе жанчыны атрымалі кваліфікаваную медыцынскую дапамогу і выздараўліваюць. Шарлатан, які рабіў ім ін'екцыі, пакуль не знойдзены; за медыцынскую дзейнасць без ліцэнзіі яму пагражае крымінальнае праследаванне.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

КАНФІСКАВАНА...112 ПЕТЛЯЎ

Пра меркаванае незаконнае паляванне работнікам Магілёўскай аблінспекцыі паведамілі супрацоўнікі Бялыніцкага лясгаса.

Падчас сумесных мерапрыемстваў у лясным масіве паміж вёскамі Калінаўка і Чырвоны Бор быў затрыманы раней неаднаразова судзімы грамадзянін, які незаконна здабыў аленя. Ва ўгоддзях і па месцы жыхарства затрыманай асобы знойдзена і канфіскавана 112 петляў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

На турнір Мядзведзя з'ехаліся барцы 26 краін

У суботу ў сталічным Палацы спорту працягнецца 40-ы Міжнародны турнір Гран-пры па вольнай барацьбе на прызы Аляксандра Мядзведзя, які пачаўся 12 сакавіка. Спаборніцтвы даўно сталі візітоўкай беларускай сталіцы, і сёлета ў Мінск з'ехаліся прадстаўнікі 26 краін. Сярод іх барцы такіх экзатычных для гэтага віду спорту краін, як Камерун, Сенегал, Туніс. Уваход у Палац спорту будзе вольны.

Як расказаў Аляксандр Мядзведзь, спаборніцтвы абяцаюць стаць відовішчнымі: у Мінск сёлета прыехалі наймацнейшыя спартсмены. «У Маскве завяршыўся этап Кубка свету, і цяпер большасць яго ўдзельнікаў прыехала ў Мінск. Прыемна ўбачыць тут сваіх сяброў з розных краін свету». Аляксандр Васільевіч прызнаўся, што ў якасці прызоў пераможцам падрыхтаваныя фігуркі мядзведзя з шарам над галавой. «Эканоміку краіны гэтым турнірам мы не падарвалі. Размяшчэнне і харчаванне гасцей спаборніцтваў — за іх кошт. Выключэнне толькі для расіян і ўкраінцаў, якіх мы прымаем па праграме абмену», — адзначыў Аляксандр Мядзведзь.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

«МІНСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ШКОЛА ІМЯ ШАПЭНА». ГУЧЫЦЬ!

У дні 200-годдзя Фрэдэрыка Шапэна Амбасадар Польшчы Генрык Літвін урачыста адкрыў бюст вялікаму кампазітару ў Мінскай музычнай школе № 3

Яшчэ 18 снежня «Звязда» паведаміла прыемную навіну: адна з мінскіх музычных школ атрымлівае імя Фрэдэрыка Шапэна. Пра гэта абвясціў міністр культуры Павел Латушка, прымаючы ў Нацыянальнай бібліятэцы свайго польскага калегу Богдана Здраеўскага. Пан Здраеўскі ў сваю чаргу падараваў нам бюст Шапэна — высокамастацкую копію скульптуры XIX стагоддзя.

Днямі ў Мінскай музычнай школе № 3, якой і надалі імя Шапэна, адбылося ўрачыстае адкрыццё бюста, прымеркаванае акурат да 200-годдзя вялікага кампазітара. Ва ўрачыстасці ўзяў удзел Надзвычайны і Паўнамоцны Амбасадар Польшчы ў Беларусі Генрык Літвін, дырэктар Інстытута Польскага ў Мінску Пётр Казакевіч, а таксама начальнік Упраўлення культуры Мінгарвыканкама Уладзімір Карачэўскі. Навучэнцы і выкладчыкі школы зладзілі для гасцей святочны канцэрт. Пасля яго мы запыталіся дырэктара школы імя Шапэна Міхаіла Абражэвіча: чаму менавіта ягонай школе далі імя выбітнага кампазітара?

— Мяркую, прычынаў некалькі, — разважае спадар Міхаіл. — Па-першае, наша школа мае паважны ўзрост — 57 гадоў. Па-другое, мы займаем годнае месца сярод мінскіх музычных школак паводле паказчыкаў паступлення вучняў на далейшае навучанне, паводле канцэртнай дзейнасці, прэмій і ўзнагародаў. Па-трэцяе, з нашых 405 вучняў прыкладна трэцяя частка займаецца па класе фартэпіяна. А фартэпіяна — гэта, вядома, у значнай ступені Шапэн!..

Наданне школе імя Шапэна адметнае яшчэ і тым, што дагэтуль музычным школам у Мінску даваліі імёны выключна айчынных дзеячаў — Александроўскай, Глебава, Шырмы, Аладава, Алоўнікава. Агулам у Мінску 20 музычных школаў, але большасць з іх пакуль не мае імёнаў выбітных людзей, толькі нумары.

Дырэктар Міхаіл Абражэвіч кажа, што адна з асаблівасцяў ягонай школы — магутная пераемнасць пакаленняў:

— Траціна нашых сённяшніх выкладчыкаў — гэта колішнія выпускнікі нашай школы! Што казаць — я сам скончыў гэтую школу ў 1970 годзе па класе баяна, і вось ужо 23 гады з'яўляюся яе дырэктарам!..

Пачынаючы ад 2004 года, музычная школа ладзіць штогадовыя вясновыя канцэрты ў філармоніі. Сёлетні, «Перліны класічнай музыкі», адбудзецца 26 сакавіка — і прысвечаны ён будзе, вядома, Шапэну. На ім зайграюць навучэнцы, выкладчыкі і выпускнікі школы.

Дырэктар Міхаіл Абражэвіч мудра разважае пра мэты сваёй школы:



— Музычая школа мае дзве задачы. Першая — агульнасацыяльная: вучыць дзетак прыгожаму. Я ганаруся, што сярод нашых навучэнцаў няма правапарушальнікаў. Другая задача — прафесійная. Ад агульнай колькасці выпускнікоў каля 15 % ідуць вучыцца далей — у музычныя каледжы, затым у кансерваторыю. Астатнім музычная адукацыя, мяркую, таксама спатрэбіцца ў жыцці, бо музыка — гэта прыгажосць, эстэтыка, харство! Ведаеце, мне дужа прыемна, што колішнія нашы выпускнікі прыводзяць сёння да нас вучыцца ўжо сваіх дзетак!..

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Фрэдэрык Шапэн (1810—1849) — адзін з найбольш вялікіх артыстаў у гісторыі польскай культуры, выдатнейшы польскі кампазітар, а таксама вядучы піяніст свету і прадстаўнік музыкі перыяду рамантызму, якога часта называюць паэтам фартэпіяна. Шапэн — кампазітар, якога найбольш выконваюць піяністы ва ўсім свеце. Яго творы патрабуюць ад выканаўцы вялікага майстэрства і віртуознасці. Незалежна ад таго, што ля вытокаў яго творчасці ляжыць вялікая мастацкая ўражлівасць і ўменне чэрпаць узоры з польскай фальклорнай музыкі, паводле слоў іншага прадстаўніка эпохі рамантызму, выдатнага паэта Цыпрыяна Норвіда, Шапэн быў «родам — з Варшавы, сэрцам паляк, талентам — грамадзянін свету».

ТЫМ ЧАСАМ

ШАПЭНАЎСКАЯ ВЕЧАРЫНА Ў НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ

Літаратурна-музычная вечарына, прысвечаная 200-годдзю Шапэна, прайшла заўчора ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Да гэтай вечарыны бібліятэка падрыхтавала дзве выставы. Першая, «Мелодыя святла», складаецца з твораў мастакоў і фатографаў, прысвечаных вялікаму кампазітару. Другая — «Паэт і фартэпіяна» — выданні, прысвечаныя Шапэну, а таксама прыжыццёвыя выданні самога кампазітара. На адкрыцці выставаў прагучаў цікавы факт: у Парыжы Шапэн даваў урокі нашаму выбітнаму кампазітару і мастаку Напалеону Орду, пазней яны сябравалі. Амбасадар Польшчы Генрык Літвін адзначыў, што «хоць Шапэн ніколі не быў у Беларусі, але ён лічыў сябе грамадзянінам Вялікага Княства

Радавыя Перамогі

МАГІЛЁЎ — ГОРАД БАЯВОЙ СЛАВЫ

МЕНАВІТА такога ганаровага звання дамагаецца Магілёўская абласная арганізацыя ветэранаў пры падтрымцы мясцовых уладаў.

«Мы не можам памерці спакойна, пакуль подзвіг абаронцаў Магілёва не будзе ацэнены належным чынам!» — заявіў **лідар ветэранаў рэгіёна Анатоль ЛЮБЧАНКА** на пасяджэнні абласнога арганізацыйнага камітэта па святкаванні 65-годдзя Перамогі.

У аргкамітэт уваходзяць 70 чалавек на чале са **старшынёй Магілёўскага аблвыканкама Пятром РУДНІКАМ**. Усе праблемы ветэранаў падрабязна разглядаюцца.

Сёння ў Магілёўскай вобласці жыве 4940 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Толькі за апошні год з жыцця пайшлі 925 чалавек. Кожны трэці з ветэранаў жыве ў вёсцы, кожны пяты — адзінокі чалавек.

Яны атрымліваюць павышаныя пенсіі і льготы, аднак усё роўна маюць патрэбу ва ўвазе і клопаце з боку ўладаў і грамадства. Як правіла, больш за ўсё пытанняў ад ветэранаў і іх сваякоў датычацца паляпшэння жыллёвых умоў. Сёння жыллёвае пытанне канчаткова не вырашана толькі ў 2-х ветэранаў, але ўзаемаразуменне паміж уладамі і ветэранамі абавязкова будзе знойдзена ў бліжэйшы час.

— Трэба акружыць клопатам нашых ветэранаў, — настойвае Пётр Руднік. — І няхай яны часам просяць крыху болей, чым гарантавана заканадаўствам, я мяркую, што такую ўвагу яны заслужылі.

Больш за 80 % ветэранаў у вобласці сёлета прайшлі комплексны медыцынскі агляд, цяпер гэта праца працягваецца па месцы жыхарства. Абноўлены спецыяльныя пакоі ў бальніцах, у іх з'явілася новая бытавая тэхніка. Ветэранам рамантуюць дамы, ім аказваюць дапамогу шэфы.

Анатоль Любчанка ад імя сваіх таварышаў падзякаваў уладам за ўсё, што зроблена для ветэранаў Магілёўшчыны. Сёння яны чакаюць майскіх святаў.

У вобласці будуць шырока адзначаць юбілей Перамогі: гэта будзе прыём ветэранаў у аблвыканкаме, ускладанні кветак да помнікаў і мемарыялаў, мітынг-рэквіем на Буйніцкім полі, шэсце ветэранаў у абласным цэнтры, тэатралізаванае прадстаўленне і гулянне на «Салдацкай паляне».

Аднак, разам з тым, магілёўскія ветэраны вайны спадзяюцца, што абласны цэнтр будзе сустракаць юбілей Перамогі з новым высокім званнем. Не супраць гэтага міністэрствы абароны і юстыцыі, станоўча ставіцца да пытання Нацыянальны сход Беларусі. Ветэраны вайны чакаюць, што ўся краіна будзе ганарыцца Магілёвам, горадам баявой славы.

Ілона ІВАНОВА.

НА МУХАЎЦЫ АДКРЫЛАСЯ НАВІГАЦЫЯ

Рачны порт Брэст — філіял рэспубліканскага транспартнага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускае рачное параходства» — адкрыў навігацыю на рацэ Мухавец. Навігацыя адкрылася на мясцовым узроўні — з кар'ера, размешчанага за 18 км ад абласнога цэнтра, дастаўляецца пясок, які выкарыстоўваецца на будоўлях горадах. Летась Брэсцкі порт перавёз 974 тыс. тон грузаў. Цяпер да Брэсцкага рачнога порта прыпісаны пяць буксірных цеплаходаў, 14 барж, два земснарады, 4 партальныя краны і адзін плывучы кран, а таксама турыстычны цеплаход «Гродна».

Фота Уладзіміра ЧАБЕРКУСА, БЕЛТА.

Матарыст-рулявы Віталь ЗЯЛЬКО.

Раверс з сюжэта

«ДАЙЦЕ!»

АРТЫКУЛ Барыса Пракопчыка пад такім загалоўкам «Звязда» надрукавала 17 лютага. На думку Сяргея Харчанкі з вёскі Азёры Гродзенскага раёна, у дачыненні да яго шматдзетнай сям'і не дзейнічаюць гарантыі ўрада па дзяржаўнай дапамозе. Аднак пры гэтым ён ігнаруе патрабаванні заканадаўства, і не толькі па пытанні атрымання дзяржаўнай дапамогі на дзяцей, але і па справаздачнасці аб фінансава-гаспадарчай дзейнасці сваёй фермерскай гаспадаркі.
Вось якія меркаванні рэдакцыя атрымала па электроннай пошце.

@

Насамрэч было б цікава пабачыць і адказы гаспадара сям'і. А так артыкул глядзіцца даволі аднабока. Усё можа быць далёка не адназначна. Калі ў сям'і шмат дзяцей, вельмі складана выехаць куды-небудзь, каб штосьці даведацца ці сабраць у чыноўнікаў паперы. Упэўнены, што ў гэтым выпадку не чыноўнікі хадзілі і пыталіся, чым дапамагчы шматдзетным (хоць гэта іх работа), а сям'я спрабавала чагосьці дамагчыся. Выклікае павагу тое, што чалавек сваёй працай і падтрымлівае сваю сям'ю. Ну стаіць камп'ютар, ну прыбрана ў доме, дзеці акуратна апранутыя — гэта паказчык? Трэба было, каб у доме жылі алкаголікі, быў бруд і поўзалі паўгалодныя і перапэцканыя дзеці? На жаль, гэта ў нашым грамадстве вобраз шматдзетнай сям'і. Не апускайце шматдзетных сваімі артыкуламі. Разумею, што давялося ў камандзіроўку ехаць, але можна ж было напісаць неяк больш нейтральна.

Brat777 (Будслаў)

@

Скажыце, шаноўны, а на чым грунтуецца ваша ўпэўненасць, што сям'я «спрабавала чагосьці дабіцца»? Я вось з артыкула бачу, што бацьку двойчы прапаноўвалі заплаціць страхавыя ўнёскі і тады ўжо смела атрымліваць дапамогу на дзяцей, а ён двойчы гэта праігнараваў. І хто яму цяпер што вінен? Або, на вашу думку, паўтара мільёна — маленькая зарплата для вёскі? Дык я вам скажу як мінчанін, што гэта і для сталіцы вельмі нават неблагія грошы...

Ніхто не «апускае» шматдзетныя сем'і, але чамусьці здаецца, што, нараджаючы семярых дзяцей, трэба разлічваць не толькі на дзяржаўныя дапамогі, але і на свае сілы. Ці вам так не здаецца? Хоць асабіста мне інтэрв'ю з тым бацькам, а яшчэ больш — дваторы здымкі, для таго каб скласці ўласнае ўражанне пра «блакадныя ўмовы», таксама не хапае.

Ну-ну

@

Мне таксама падаецца, што калега «сабак спусціў» на чалавека. Ці чыноўнікаў. Чаму няма тлумачэнняў бацькі пра страхавыя ўнёскі? Чаму ўвогуле няма спробы зразумець чалавека, матывы яго ўчынкаў? Такі суб'ектывізм і імкненне абараніць мясцовае начальства прагледжваецца ў артыкуле, што подых перахоплівае. А людзям жа толькі падавай, яны ўжо даўно чакаюць нагоды закідаць камянямі шматдзетных, якія на льготныя крэдыты палепшылі свае жыллёвыя ўмовы і жывуць часам не горш за тых, хто і аднаго нарадзіць не рашаецца. Хоць не выключаю і спажывецкіх настрояў сярод шматдзетных. Але, як і ўсё ў нашым жыцці, пытанне гэта тонкае, далікатнае, неадназначнае. А слова — сапраўды зброя страшная. Як сёння жывецца гэтаму тату? Што ён адчувае пасля артыкула? Можа запіў? Не здзіўлюся. Упэўненая ў адным, артыкул не аб'ектыўны. Не як іншы журналіст «Звязды» выказаўся, што не разуме, у чым шчасце шматдзетнай сям'і. Гэта сапраўды цяжка зразумець. Таму, хто не паспрабаваў. Аднак, упэўненая, з тых, хто паспрабаваў, усё ж такі больш шчаслівых. Хоць прычына тут не ў колькасці дзяцей. Але гэта ўжо іншая тэма.

Вольга

@

Што ж датычыцца дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, то для атрымання патрабуюцца штомесячныя адлічэнні з фермерскай заработнай платы ў ФСАН і ІМПС — і не інакш (згодна з дзейным заканадаўствам). Фермер гадамі прывозіць у парадак сваю дзейнасць, выплачвае даўгі, а потым налічвае сабе зарплату. Немагчыма 1-га стаць фермерам, а 31-га таго ж месяца зарабіць грошы. Зыходзячы з логікі, у верасні 2008 года даход сям'і не мог быць 1,5 мільёна рублёў па прычыне таго, што жонка знаходзілася ў водпуску па доглядзе 8-месячнага дзіцяці, а мог складаць усяго 200 тысяч дапамогі. Што датычыцца блакадных умоў пражывання, то з 200 кв. м жыць можна толькі на 20 кв. м. Астатнія знаходзяцца ў аварыйным стане. З шасці пакояў пражываем толькі ў двух. У мінус 20 на вуліцы дома тэмпература плюс 6-7 градусаў. Чамусьці ў артыкуле забыліся напісаць, што ў маёй сям'і ёсць яшчэ тэлевізар і DVD. Ваш аповед, спадар Пракопчык, аднабока бюракратычны, а я, як прыхільнік не бюракратаў, а палітыкі Прэзідэнта, буду і далей стукацца ў дзверы чыноўнікаў! З павагай шматдзетны алігарх С. Харчанка.

Сяргей ХАРЧАНКА.

Сайт «Звязды»: www.zviazda.by

АД АЎТАРА

Журналісцкая практыка навучыла мяне з пэўнай насцярожанасцю ставіцца да гучных слоў пра барацьбу з бюракратызмам і чыноўніцкай абыякавасцю, якімі казырае Сяргей Харчанка пад «шыльдай» прыхільніка палітыкі Прэзідэнта. Заўсёды спрабую разабрацца: а наколькі прынцыпова гэты «барацьбіт» ставіцца да сябе? Ці не прыхоўвае ён за прыгожымі фразамі ўласныя, скажам так, хібы?

Нагадаем адзін факт з артыкула, які датычыцца бясплатнага харчавання на дзіця да двух гадоў жыцця. Сям'я Харчанкі паўгода атрымлівала адпаведны набор прадуктаў, аднак з кастрычніка мінулага года па сёлетні люты гэта дапамога ад дзяржавы не аказвалася, паколькі бацька... па яе не звярнуўся.

Дык вось, у Сяргея Харчанкі ўсё ж хапіла розуму не паўтараць гэту памылку і нядаўна, згодна з інфармацыяй дырэктара Гродзенскага раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Анжэлы Далгашэй, ён прынёс неабходныя дакументы і сям'я атрымала права на бясплатнае харчаванне для малодшага дзіцяці.

А вось выканаць вызначаны законам абавязак падаць справаздачу ад сваёй фінансава-гаспадарчай дзейнасці, пра што расказвалася ў артыкуле «Дайце!», Харчанка так і не захацеў. Паводле слоў начальніка аддзела статыстыкі Гродзенскага раёна Людмілы Пыркай, справаздачнасць павінна была быць пададзена да 12 лютага — не прыйшоў. Выслалі яму павестку — таксама не з'явіўся. Цяпер афармляецца пратакол у суд для пакарання Харчанкі штрафам. Што, і гэта бюракратызм?

Хочацца паўтарыць выказанае ў артыкуле меркаванне: статус шматдзетнай сям'і не можа быць «індульгенцыяй» ад ігнаравання нормаў жыцця ў грамадстве, закон абавязковы для ўсіх. І з гэтых пазіцый кожны павінен ставіцца не толькі да дзейнасці тых ці іншых органаў, але і да самога сябе.

Крымінал

ФІНАНСАВАЯ МІЛІЦЫЯ ВЫКРЫЛА БУЙНЫ КРАДЗЕЖ БІЯПАЛІВА

Чатыры жыхары Касцюковічаў кралі біядызельнае паліва з цеплавозаў Беларускага цэментнага завода. Упраўленне Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці спыніла дзейнасць злачыннай групы.

Затрыманы 24-гадовы мужчына, які на сваім мікрааўтобусе «Фальксваген Каравэла» перавозіў 300 літраў біядызелю. Як высветлілася, паліва крадзенае, а дапамагалі яго «прыватызаваць» два машыністы цеплавозаў чыгуначнага цэха на цэментным заводзе, а таксама памочнік машыніста, які з'яўляецца бацькам затрыманага маладога чалавека. Здабытае на прадпрыемстве паліва рэалізоўвалася ў Касцюковічах уладальнікам аўтамабіляў па цане 1000 рублёў за літр.

Распачата крымінальная справа, на затрыманы аўтамабіль накладзены арышт. Як паведаміў начальнік арганізацыйна-інспектарскага аддзела УДФР КДК па Магілёўскай вобласці Аляксандр Шаройкін, следства ўжо даказала крадзеж 2500 літраў паліва на суму 3,6 мільёна рублёў. Зладзеям пагражае зняволенне да 5 гадоў.

Ілона ІВАНОВА.

ТРЫВОЖНАЯ СТАРАСЦЬ

Пачуўшы звон разбітага шкла ў дзвярах, 82-гадовы пенсіянер з в. Трасцяніца Камянецкага раёна пайшоў паглядзець, што там здарылася. Вось тут на дзеда напалі двое і пачалі збіваць яго нагамі і рукамі.

Ад пабояў мужчына памёр у сваёй хаце. Следчая група ўстанавіла, што напад зрабіў 21-гадовы жыхар в. Ратайчыцы разам з 20-гадовым напарнікам з в. Навіцковічы. Забойцы напачатку залезлі ў хату, каб абакрасці старога, але калі ўбачылі, што ціха зрабіць гэта не ўдасца, то з хаты нічога не ўзялі, але пенсіянера забілі.

У в. Вялута (Лунінецкі раён) таксама пацярпеў пенсіянер. Яго у сваёй хаце ноччу моцна збілі аднавяскоўцы — 25 і 28 гадоў. З паламанымі рэбрамі і пашкоджаным лёгкім гаспадара даставілі ў бальніцу.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

З РЫЭЛТАРАЎ — У... НАРКАДЫЛЕРЫ

Амаль паўкілаграма марыхуаны выявілі ў аўтамабілі мінчаніна супрацоўнікі дзяржбяспекі і пагранічнікі ў пункце пропуску «Брузгі», паведамляе прэс-служба УКДБ па Гродзенскай вобласці.

Камітэтам дзяржбяспекі была атрымана інфармацыя пра магчымую спробу ўвозу наркатычных сродкаў на тэрыторыю Беларусі. Быў вядомы і перавозчык, які неўзабаве і з'явіўся ў «Брузгах». На стандартнае пытанне пагранічніка пра наяўнасць забароненых для ўвозу прадметаў і тавараў малады чалавек адказаў адмоўна, аднак агляд машыны гэта не пацвердзіў. У салоне легкавіка былі выяўленыя тры запаяныя ўпакоўкі з-пад кавы, і службовы сабака імгненна адрэагаваў на рэчыва, якое там знаходзілася. А экспертыза пацвердзіла: марыхуана.

У дачыненні да мінчаніна Упраўленнем КДБ па Гродзенскай вобласці ўзбуджана крымінальная справа па артыкуле «кантрабанда наркатычных сродкаў», які прадугледжвае пакаранне ад трох да сямі гадоў пазбаўлення волі.

Наркадылер да нядаўняга часу быў заснавальнікам рыэлтарскай кампаніі ў адной з краін Усходняй Еўропы. Яна не вытрымала крызісных з'яў і збанкрутавалася. Следству яшчэ трэба высветліць, ці не выкарыстоўвалася гэтая фірма раней для легалізацыі атрыманых злачынным шляхам грошай. Ці мо былы рыэлтар з дапамогай наркатрафіку вырашыў палепшыць сваё матэрыяльнае становішча?

Барыс ПРАКОПЧЫК.

...І ПАМЕРЛІ Ў АДЗІН ДЗЕНЬ

Два абгарэлыя трупы знойдзены раніцай у адселеным 4-кватэрным доме з адключанай электраэнергіяй у пасёлку Рассвет Добрушскага раёна.

Тут дажывалі свой век 60-гадовая жанчына з сужыцелем, на 2 гады за яе старэйшым. Яны разам атрымалі пенсію, разам урачыста пайшлі адзначаць такую важную падзею — трыма пакетамі віна, расказваюць мясцовыя жыхары. Вядома і тое, што гэта быў звычайны лад жыцця пенсіянераў. Калі па выкліку прыехалі пажарныя, выратоўваць ужо не было каго. Выгарала прыкладна 2 квадратныя метра падлогі вакол ложка. Як паведамляюць у прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, папярэдняя прычына трагедыі — неасцярожнае абыходжанне з агнём. Астатняе можна толькі дадумваць: ці то была цыгарэта гаспадара, ці то свечкі, якімі яны асвятлялі сваё жытло з-за адсутнасці электраэнергіі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПАЧАЛІ З ДАРОГІ, СКОНЧЫЛІ — У ЛАЗНІ

Гісторыя пачалася з паведамлення інспектарам Бягомльскай міжрайінспекцыі пра знойдзеныя сляды дарожна-транспартнага здарэння з удзелам дзікай жывёлы на аўтадарозе паблізу вёскі Малыя Сітцы Докшыцкага раёна. Заяўнік распавёў, што нехта вывез тушу лася на транспартным сродку.

У названым месцы дзяржінспектары і аператыўная група Докшыцкага райаддзела міліцыі сапраўды знайшлі сляды. Падчас пошукавых мерапрыемстваў у лазні мясцовага жыхара ў вёсцы Валкалаты былі знойдзены рэшткі... пяці свежых тушаў дзікоў. А ў падвале дома — мяса дзікіх жывёл. У паляўнічых угоддзях былі адшуканы і іншыя месцы здабычы дзікоў. Зведзена крымінальная справа, парушальнік затрыманы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Гэта мы, Госпадзі...

А ці трэба лячыць такіх хворых?

ІНЦЫДЭНТ, які адбыўся на гэтым тыдні з брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі ў Брэсце, наводзіць на роздум не толькі аб небяспецы прафесіі ўрача «Хуткай», але аб неабходнасці нейкай заканадаўчай абароны людзей у белых халатах гэтай катэгорыі.

Позна ўвечары 9 сакавіка па тэлефоне 103 пазваніў яўна нецвярозы мужчына з вёскі Клейнікі (прыгарад Брэста). Брыгада накіравалася па выкліку. Урач і фельчар па названым адрасе сапраўды знайшлі чалавека з ірваной ранай галавы, пры гэтым моцна п'янага. Па ўсіх паказаннях патрабавалася шпіталізацыя. Але пацыент наадрэз адмаўляўся ехаць у бальніцу. Медыкі выклікалі міліцыю. З дапамогай участковага інспектара грамадзяніна Вікарука пасадзілі ў машыну. Але ён паспрабаваў вылезці з яе, зрываў з сябе кропельніцу, брыдка лаяўся на медыкаў. Па дарозе ў бальніцу ён двойчы ўдарыў фельчара нагой у грудзі. А потым, калі медыцынскія работнікі ўсё ж спрабавалі ўціхамірыць «хворага», ён злаўчыўся і нанёс удар доктару ў скроневую частку галавы.

Доктару стала дрэнна, яму самому давялося звяртацца па медыцынскую дапамогу. Па сутнасці ўрач атрымаў чэрапна-мазгавую траўму і цяпер сам праходзіць курс лячэння. Як паведаміў загадчык філіяла «Станцыі хуткай дапамогі» Брэсцкай гарадской бальніцы хуткай дапамогі Генадзь Ласіцкі, у бальніцы, куды даставілі ваяўнічага пацыента, таксама нацярпеліся страху. Бо ён паводзіў сябе агрэсіўна. Жыхару Клейнікаў ўсё ж аказалі неабходную дапамогу, рану зашылі, пасля чаго ён практычна самахоць пакінуў лячэбную ўстанову.

Пацярпелы доктар выказаў намер падаваць у суд іскавую заяву. Галоўурач «Хуткай» са шкадаваннем зазначыў, што з рознага выгляду хамствам, а часам з агрэсіяй медыкі сутыкаюцца ледзь не кожны дзень. І няма ніякіх рычагоў абароны, а дапамогу аказваць у любой сітуацыі — іх абавязак.

А ці трэба сапраўды сілком аказваць дапамогу, калі чалавек не хоча і супраціўляецца? Гэта ж не малое дзіця, якое не можа ацаніць наступствы свайго стану. Дарослы чалавек перш за ўсё сам нясе адказнасць за сваё жыццё і здароўе. Пакуль цэлая брыгада медыкаў важдалася з патэнцыйным хуліганам, нехта, магчыма, доўга чакаў дапамогі, якая была сапраўды неабходная хутка. Мабыць, настаў час неяк замацаваць заканадаўча правілы магчымых паводзінаў брыгады хуткай дапамогі ў падобных абставінах. Інакш мы прыйдзем да таго, што яе, гэтую брыгаду, будзе суправаджаць міліцыянер са зброяй.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

На скрыжаванні думак

ЗАБАВЫ НА КРЫВІ

Дзікія гусі самотна крычаць,
Шэрыя гусі высока ляцяць
Над лясамі, над палямі
І над аграгарадкамі...

Шкодзяць прыродзе не паляўнічыя...

СЁННЯ адкрываецца паляванне на пералётных шэрых гусей. І веснавы сезон будзе цягнуцца да 9 мая. Амаль два месяцы гэтых птушак, як і іншых, будуць страляць на тэрыторыі нашай краіны.

Летась «Звязда» прысвяціла шэрым гусям некалькі публікацый, і вось зноў варта сказаць слова ў абарону гэтых птушак.

Гняздзяцца шэрыя гусі і на тэрыторыі Беларусі, але іх вельмі мала, прыкладна 200—250 параў. Праблему ствараюць паляўнічыя, якія не даюць магчымасці шэрым гусям спакойна размнажацца. Быў перыяд, калі гэтыя птушкі ўвогуле зніклі з тэрыторыі нашай краіны. Яшчэ ў 2004 годзе шэрая гусь знаходзілася ў Чырвонай кнізе Беларусі, але неўзабаве была выкраслена з яе і стала паляўнічым відам.

Шэрыя гусі ў масе сваёй ляцяць гнездавацца ў тундру і падчас гэтай міграцыі птушкам прыходзіцца апускацца на зямлю, каб падсілкавацца і адпачыць. Вось тут іх і чакаюць людзі са стрэльбамі. Такая «гасціннасць» толькі ў нашай краіне, бо ва ўсёй Еўропе адстрэл пералётных гусей забаронены.

Праблема яшчэ ў тым, што на зімоўцы гусі фарміруюць пары, і калі ў час пералёту адна птушка з пары загіне, то другая ўжо выключана ў гэтым годзе з размнажэння.

Відавочна, найбольшы вынік быў бы, каб ініцыятыва аб адмене палявання вясной выходзіла ад кіраўніцтва Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, бо як можна ахоўваць прыроду, калі ў птушак страляюць падчас гнездавання? У канцы красавіка — пачатку мая птушкі ўжо садзяцца на гнёзды.

16 сакавіка з 11 да 12 гадзін будзе прамая лінія «Усё пра вясновую рыбалку і паляванне» з начальнікам Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Міхаілам Арэшкам.

Па тэлефонах у Мінску: 8 (017) 292 46 55, 292 23 52, 287 18 70 зададзім Міхаілу Адамавічу пытанні наконт шэрых гусей, качак, глушцоў, цецерукоў... — птушак, якіх у нас страляюць вясной.

Чаму нам не ўзяць прыклад з еўрапейскіх краін — нашых суседзяў, дзе такое паляванне даўно забаронена? Дарэчы, гэты крок там даў добры вынік. За апошнія 10 гадоў колькасць шэрых гусей ва Украіне, Польшчы і Літве рэзка вырасла і дасягае некалькіх тысяч параў.

Адна з прычын, а можа і галоўная, звязана з тым, што паляванне прыносіць прыбытак лесапаляўнічым гаспадаркам. Напрыклад, у 2008 годзе даход ад палявання дасягнуў 145 % у параўнанні з 2007 годам. Вырас ён і летась.

Да нас прыязджаюць паляўнічыя з іншых краін, бо вясной у іх паляванне забаронена. Чалавек плаціць грошы і цешыць душу, а якая ад гэтай забавы прыродзе шкода, то гэта ўжо не яго праблема. Лесапаляўнічыя гаспадаркі выжываюць як могуць, і паляванне ў іх дзейнасці займае важнае месца.

Нам добра вядома (з інфармацыі той жа дзяржінспекцыі), што твораць з дзікамі, казулямі ды ласямі браканьеры, то няўжо яны па-іншаму будуць ставіцца да шэрых гусей на пералёце ці падчас гнездавання?

Аднойчы знаёмы паляўнічы, доктар па прафесіі, сказаў:

— Усе гэтыя абаронцы прыроды — звычайныя крыкуны. Абураюцца, пішуць, але самі ад таго ж гусачка не адмовяцца.

Чалавек, які выгадаваў гусей, патраціў на іх час і сілы, мае поўнае права свайго гусака засмажыць, можна пайсці і ў краму....

Той, хто страляе дзікіх гусей, ідзе на такі крок не ад голаду, а робіць гэта дзеля забавы. Забавы на крыві.

Калі паляўнічы за адзін выхад забівае некалькі дзясяткаў гусей, то можна сказаць, што чалавек ужо не здольны кантраляваць сябе. Дзе мяжа такога азарту?

Нашы продкі ў часы Вялікага Княства інакш падыходзілі да палявання, тады дзейнічалі законы, якія забаранялі з 1 сакавіка да 12 ліпеня «ніколі і нідзе ва ўсёй дзяржаве звяроў і птушак не лавіць, як і з сабакамі не ездзіць і не страляць пад штрафам».

У Статуце ВКЛ напісана, які вялікі штраф мог атрымаць той, хто пашкодзіў гняздо лебедзя ці ўзяў адтуль яйка, а сёння адзін з мясцовых кіраўнікоў таварыства паляўнічых і рыбаловаў кажа:

— А лебедзяў трэба страляць, бо ад іх адна шкода — на сваю тэрыторыю іншых птушак не пускаюць.

Лебедзі ўжо не носьбіты прыгажосці, а шкоднікі!

У 2009 годзе птушкай года была шэрая гусь, і Нацыянальны банк Беларусі з гэтай нагоды выпусціў памятныя манеты «Шэрая гусь», але гэта нічога не змяніла. Стралялі гусей летась — будуць страляць і сёлета. Будзем любавацца шэрымі гусямі на манетах ці ўсё ж аддадзім пераважную жывым птушкам?

Чытаю ў Бібліі: «пладзіцеся і размнажайцеся, і папаўняйце зямлю і валодайце ёю, і пануйце над рыбамі марскімі, і над птушкамі нябеснымі, і над усякай жывёлай, поўзаючымі па зямлі». І гэтым сказана ўсё. Двухногая істота з паляўнічым азартам у вачах атрымала карт-бланш (неабмежаваныя паўнамоцтвы) на панаванне над усім жывым.

А я з гэтым не згодзен і стаўлю пад сумненне такую ўстаноўку.

Бібліейскі запавет «Не забі» датычыцца чалавека — гэта яго нельга забіваць, але павінен быць яшчэ адзін, які адносіцца да братоў нашых меншых — «Не забівай для забавы».

Будзем яго прытрымлівацца, і свет стане крыху іншым, хоць надзея малая.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Паважаная рэдакцыя!

Кожны раз, калі пачынаецца альбо набліжаецца чарговы паляўнічы сезон у Беларусі, журналісты (не ўсе, безумоўна, а самыя дрымучыя ў гэтай сферы) робяць спробы зарабіць піяр-аўтарытэт на «паляўнічай тэме». Пры гэтым схема публікацый лапідарна прымітыўная: якія яны гады, гэтыя аматары паляўнічай забавы; хутка ўсё знішчаць, каб дагадзіць свайму крыважэрнаму захапленню; хутчэй трэба альбо забараніць усялякае паляванне, альбо перабіць усіх паляўнічых у імя найвялікшай мэты «захавання прыроды роднага краю».

Утрырую крыху, але, на жаль, такая формула характэрная для большай часткі артыкулаў. Танна, гранічна некампетэнтна ў спалучэнні з абсалютным няведаннем (або наўмысным нежаданнем ведаць) сапраўднага стану рэчаў, якія датычацца паляўнічых «праблем».

Для большай важнасці абавязкова ў якасці прыкладу прыводзіцца пара-тройка фактаў адкрытага браканьерства (або прыкладаў на мяжы гэтага), якія не маюць ніякага дачынення да сапраўднага палявання, з адпаведнымі «высновамі». Вось і «Звязда» неаднаразова звярталаса да гэтай тэмы. Хачу выказаць некалькі меркаванняў.

Колькасць выдадзеных дзяржаўных паведчанняў на права палявання ў разы перавышае колькасць арганізаваных паляўнічых. Раней без членства ў грамадскіх аб'яднаннях БТПР, «Дынама» альбо ВПТ паляўнічую гладкаствольную стрэльбу наогул набыць нельга было, і гэта было, я глыбока перакананы, правільна. Хоць членства ў іх і не гарантавала поўнае выключэнне фактаў браканьерства, але хоць быў пэўны адбор, бо, акрамя ўсяго іншага, існаваў яшчэ і гадавы кандыдацкі стаж для прэтэндэнтаў у паляўнічыя.

Менавіта сапраўдных паляўнічых часцей за ўсё і больш за ўсіх хвалюе захаванне фаўны Беларусі, бо менавіта яны ў першую чаргу бачаць рэальнае становішча ў жывёльным свеце беларускай зямлі.

Я больш за трыццаць гадоў захапляюся паляваннем і рыбалкай у Беларусі і як законапаслухмяны грамадзянін, магу дакладна і адказна меркаваць пра тое, што з'яўляецца насамрэч галоўнымі фактарамі, якія скарачаюць не толькі колькасць дзікіх жывёл, але і метадычна знішчаюць месцы іх пасялення. А, як вядома, адно без другога не існуе. Таму што калі знішчаць біятопы, на дзічыну і паляваць не трэба будзе, бо яна проста знікне, як маманты.

Дарэчы, забарона палявання на шэрых курапатак была звязана з памылковым меркаваннем, што гэтая птушка есць каларадскага жука (злоснага ворага «другога хлеба» — бульбы) і яго лічынкі. Аднак далейшыя даследаванні гэтага не пацвердзілі. Як і таго, што колькасць шэрай курапаткі залежыць ад палявання на яе. Больш важнымі аказаліся месцы пасялення птушкі, якія пастаянна ўзворваюцца, а ў выніку птушкам цяжка выжыць ва ўмовах снежнай зімы з-за адсутнасці корму. А вось падкормка шэрых курапатак у зімовы перыяд, якую ажыццяўляюць паляўнічыя гаспадаркі і паляўнічыя, сапраўды істотна ўплывае на колькасць асобінаў. Акрамя таго, у шэрай курапаткі існуе ў сярэднім сямігадовы цыкл, на працягу якога колькасць шэрых курапатак ва ўгоддзях расце, а затым іх робіцца так шмат, што хваробы, якія ўзнікаюць пры гэтым, вядуць да рэзкага скарачэння іх колькасці (закон натуральнага адбору), і ўсё пачынаецца спачатку. І паляванне дазволена, каб пагалоўе своечасова скарачалася і не прападала ў выніку хваробаў, якія шкодзяць лішнім асобінам.

Заклік забараніць веснавое паляванне не з'яўляецца навацыяй або адкрыццём. Тым больш што такая практыка ў Рэспубліцы Беларусь таксама існавала, вось толькі яна ніяк не паўплывала на колькасць тых відаў птушак, на якія ў цяперашні час веснавое паляванне ў нас практыкуецца.

Глушэц і цецярук сталі ліцэнзійнымі відамі і даступныя цяпер толькі выбраным (чытай — тым, хто мае адпаведныя фінансавыя і «іншыя» магчымасці).

Паляванне на гусака вельмі скарацечнае, бо цесна прывязанае да часу пралёту, патрабуе сур'ёзнай падрыхтоўкі і забеспячэння. Пралётны гусак — вялікі разумнік, і яго проста так не здабудзеш.

Паляванне на качак вясной таксама няпростае. Неабходныя падсадныя, чучалы, буданы і іншае. Застаецца адзінае паляванне на вальдшнэпа, цяга якога доўжыцца 30—40 хвілін пасля захаду сонца. Той факт, што яно дазваляецца з 18.00 вечара, асаблівых наступстваў не мае.

Спісваць праблемы аховы птушынага пагалоўя і захаванасці нашай прыроды на паляўнічых — наўмысная хлусня, бо нават **самыя зламысныя браканьеры не нанясуць прыродзе і тысячнай долі таго ўрону, які ёй наносіць штодзённая гаспадарчая дзейнасць чалавека. І калі б толькі гаспадарчая**!

Яшчэ нейкіх пятнаццаць — дваццаць гадоў таму, калі колькасць паляўнічых у Рэспубліцы Беларусь была разы ў тры большая, чым цяпер, мы пастаянна ездзілі на паляванне ў Смалявіцкі і іншыя раёны Мінскай вобласці, не далей чым за 50—60 км ад горада Мінска. На раку Прыпяць або яшчэ куды далей ездзілі толькі раз у сезон, ды і тое толькі на адкрыццё. Проста не было необходнасці, бо дзічыны было дастаткова ў стокіламетровай паласе вакол сталіцы. І гэта рэальны факт, а не фантазія старэючага чалавека.

Там, дзе цяпер знаходзіцца Нацыянальны аэрапорт, ляталі чароды цецерукоў да 50 галоў. Цяпер цецярук у гэтых мясцінах зусім знік.

Знакамітая алімпійская бетонка Брэст — Масква, пабудаваная напрыканцы мінулага стагоддзя, прайшла па самых багатых паляўнічых угоддзях.

Ва ўгоддзях, што знаходзяцца ў месцы зліцця рэк Плісы і Чарнушкі (Чырвоны Сцяг Смалявіцкага раёна), дзе калісьці існавала вядомае торфапрадпрыемства, для паляўнічых і рыбакоў было сапраўднае раздолле. І цяпер там яшчэ тое-сёе засталося. Але, на жаль, ужо не тое: меліяраванае, асушанае, узаранае, засеянае, забруджанае адкідамі сельскагаспадарчай вытворчасці.

Ёсць яшчэ адна асобная праблема — **шматлікія дачныя пасёлкі**, насельнікі якіх паводзяць сябе ў адносінах да лясоў, лугоў, палёў і балотаў, якія акружаюць іх участкі, як заваёўнікі або каланізатары. Але гэта, як кажуць, бяздонная тэма для іншай размовы.

Вызначаны цяпер у рэспубліцы парадак паляўнічакарыстання, можа, і не пазбаўлены заганаў, але, разам з тым, з'яўляецца станоўчым фактарам, які садзейнічае захаванню рэшткаў дзікай прыроды, нягледзячы на пастаянныя спробы з боку асобных СМІ паставіць законапаслухмяных паляўнічых па-за законам і станоўчай грамадскай думкай, зрабіць іх казламі адпушчэння.

Не сакрэт, што браканьерам толькі на карысць, калі ва ўгоддзях нікога, акрамя іх, не будзе.

Цяпер амаль спынілася масавае паляванне на ліс — нявыгадна (шкурка нікому не патрэбная, і выраб стратны), а паляванне на дзіка з-за высокага кошту ліцэнзій стала таксама менш папулярным сярод паляўнічых, якія ведаюць, як яго арганізаваць і правесці.

Лішак колькасці ліс — дадатковы прэс на іншых насельнікаў дзікай прыроды: зайцоў, вадаплаўных птушак. Бо мышападобныя грызуны не адзіныя, на каго ліса палюе. Не сакрэт, што лісы з задавальненнем наведваюць могільнікі каля фермаў, а гэта яшчэ адна праблема. Як вынік — распаўсюджванне шаленства сярод ліс і свойскіх жывёл, якое стварае ў асобных раёнах рэальную пагрозу для людзей, асабліва вясковых жыхароў.

З дзікамі тое ж самае. Усе цецеруковыя (глушэц, цецярук, рабчык) гняздуюцца на зямлі, як і многія іншыя птушкі. Лішак пагалоўя дзікоў непазбежна вядзе да рэзкага скарачэння колькасці гэтых птушак, кладкі якіх дзікі проста з'ядаюць, калі знаходзяць. Не кажучы ўжо пра тое, якія плошчы яны «ўзворваюць» у пошуках корму. Кабаны пачалі прыходзіць ужо ў гарады і іншыя населеныя пункты. Пра знішчаныя ў некаторых раёнах пасадкі бульбы, караняплодаў і іншыя пасевы і гаварыць не даводзіцца. У гэтых выпадках прадугледжана хоць нейкая

Укладчыкі мяняюць долар на рубель?..

За люты валютныя дэпазіты зменшыліся амаль на $29 мільёнаў

ПРАЦЭНТНЫЯ стаўкі па ўкладах у замежнай валюце паступова змяншаюцца, і даходнасць рублёвых дэпазітаў становіцца ўсё больш істотнай у параўнанні з валютнымі, паведаміў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» апошнія тэндэнцыі намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл ЖУРАВОВІЧ. Таму, паводле слоў нашага суразмоўцы, сродкі з валютных дэпазітаў паступова «перацякаюць» на рублёвыя ўклады.

Наогул, падкрэсліў Міхаіл Журавовіч, за два першыя месяцы года беларусы значна папоўнілі свае зберажэнні ў беларускіх банках: укладны ў рублях і замежнай валюце павялічыліся больш як на 1,17 трыльёна рублёў, ці на 6,5 працэнта, і на пачатак сакавіка людзі трымалі ў банках ужо амаль 19,33 трыльёна рублёў. Прычым доля рублёвых дэпазітаў у агульным аб'ёме ўкладаў няўхільна павялічваецца: за студзень-люты яны ўзраслі на 922,51 мільярда рублёў, ці на 11,5 працэнта і склалі больш за 8,9 трыльёна рублёў. Заўважым і тое, што ў лютым на ўклады ў нацыянальнай валюце «капнула» яшчэ больш рублёў, чым у папярэднім месяцы — яны павялічыліся больш чым на 543 мільярды рублёў, ці на 6,5 працэнта (у студзені іх рост склаў 379,25 мільярда, ці 4,7 працэнта). «Што сведчыць пра рост даверу насельніцтва да нацыянальнай валюты і банкаўскай сістэмы ў цэлым, — кажа Міхаіл Журавовіч. — На гэта ўплывае і працэнтная палітыка, якая накіравана на падтрыманне працэнтных ставак па тэрміновых укладах насельніцтва ў нацыянальнай валюце на ўзроўні, які істотна перавышае як інфляцыю, так і даходнасць зберажэнняў у замежнай валюце».

Паводле звестак Нацыянальнага банка, у сярэднім за леташні год стаўка па новых тэрміновых дэпазітах насельніцтва склала 20,2 працэнта гадавых і ў рэальным выражэнні перавысіла ўзровень 10 працэнтаў гадавых. На пачатку года па тэрміновых рублёвых укладах фізічных асобаў таксама захоўваецца высокі ўзровень стаўкі. Напрыклад, у студзені ён знаходзіўся на ўзроўні 21,2 працэнта гадавых і склаў 11,6 працэнта гадавых у рэальным выражэнні.

Пры выкананні тэмпаў інфляцыі, якія прагназуюцца на 2010 год на ўзроўні 8—10 працэнтаў, прадугледжваецца далейшае зніжэнне стаўкі рэфінансавання да канца года да ўзроўню 9—12 працэнтаў гадавых, ставак па новых дэпазітах і крэдытах банкаў да 10—13 і 12—15 працэнтаў гадавых адпаведна.

А вось верхняя мяжа даходнасці дэпазітаў у доларах і еўра не перавышае 8 працэнтаў гадавых, што, безумоўна, уплывае на сітуацыю. Як вынік, за два месяцы дэпазіты ў замежнай валюце павялічыліся ўсяго на 4,7 мільёна долараў (на 0,1 працэнта), а ў лютым, як адзначалася вышэй, нават зменшыліся. Між іншым, на рынку наяўнай валюты сёлета па-ранейшаму беларусы прадаюць больш цвёрдаканверсоўнай, чым купляюць. З пачатку года, за два месяцы, чысты продаж насельніцтвам валюты банкам склаў ужо больш за 168 мільёнаў долараў ЗША. За люты грамадзяне прадалі амаль на 75 мільёнаў долараў больш, чым купілі. У сакавіку тэндэнцыі такія ж: за першыя пяць дзён чысты продаж наяўнай валюты грамадзянамі перавысіў 7 мільёнаў долараў.

Мы пацікавіліся ў экспертаў, наколькі цяперашнія тэндэнцыі могуць змяніцца, калі агучаная рэкамендацыя Нацыянальнага банка камерцыйным па зніжэнні працэнтных ставак па рублёвых дэпазітах і крэдытах пачне рэалізоўвацца. На думку **старшыні Асацыяцыі беларускіх банкаў Фелікса ЧАРНЯЎСКАГА**, каб не нарабіць тут шкоды, галоўнаму банку неабходна будзе праводзіць збалансаваную палітыку, у прыватнасці, па зніжэнні інфляцыі, забеспячэнні надзейнасці банкаў, зніжэнні кошту валютных рэсурсаў, па развіцці новых інструментаў прыцягнення ўкладаў. Да рэгулявання працэнтных ставак, лічыць ён, трэба падыходзіць узважана, банкам нельга тут рабіць рэзкіх рухаў, каб не страціць кліентаў.

Што датычыцца альтэрнатывы банкаўскім укладам, то па словах Фелікса Чарняўскага, у нас, на жаль, пакуль мала інструментаў для таго, каб насельніцтву ўкладваць свабодныя грошы, і асноўным інструментам прыцягнення зберажэнняў грамадзян, як і раней, застаюцца дэпазіты.

— У нашай краіне, вядома, вельмі дарагія сродкі, і крэдытаваць прадпрыемствы імі затратна, — каментуе ён захады, якія маркуецца зрабіць па зніжэнні ставак па крэдытах і дэпазітах. — Адзін з метадаў памяншэння кошту крэдытаў — зніжэнне кошту дэпазітаў. Банкі сапраўды цяпер прапануюць высокія працэнтныя стаўкі па ўкладах, таму што захоўваецца дастаткова высокая інфляцыя. Калі будуць падаць тэмпы інфляцыі, а ўзровень працэнтных ставак па ўкладах па-ранейшаму перавышаць яе, людзі не адмовяцца зберагаць у банках. Важна, каб была відавочнай прывабнасць захавання свабодных сродкаў на дэпазітах.

Зрэшты, Нацыянальны банк, агучваючы ініцыятыву паступовага зніжэння агульных працэнтных ставак у эканоміцы, падкрэслівае, што так і будзе — прывабнасць зберажэння ва ўкладах захаваецца. Прычым, у галоўным банку робяць акцэнт на тое, што змяншэнне стаўкі рэфінансавання будзе адбывацца пры выкананні тэмпаў інфляцыі, якія прагназуюцца на сёлета на ўзроўні 8—10 працэнтаў. Менавіта ў такім выпадку, адзначае і Міхаіл Журавовіч, прадугледжваецца далейшае зніжэнне стаўкі рэфінансавання да канца года на ўзроўні 9—12 працэнтаў гадавых, а ставак па новых дэпазітах і крэдытах банкаў да 10—13 і 12—15 працэнтаў гадавых адпаведна. «Паступовае зніжэнне банкамі працэнтных ставак на фоне стабільнага абменнага курсу беларускага рубля, — кажа ён, — накіраванае на пашырэнне магчымасці насельніцтва і прадпрыемстваў па прыцягненні банкаўскіх крэдытаў, што будзе спрыяць павышэнню тэмпаў эканамічнага росту ў краіне і росту дабрабыту грамадзян». У Нацбанку таксама заўважаюць, што нязменнай застаецца і працэнтная палітыка адносна рублёвых і валютных укладаў: стаўкі па тэрміновых дэпазітах у нацыянальнай валюце будуць перавышаць даходнасць па ўкладах у СКВ.

Вяртаючыся ж да статыстыкі, згадаем і тое, што на 1 сакавіка ў разліку на аднаго жыхара прыпадала 2 мільёны 118 тысяч 150 рублёў зберажэнняў (у эквіваленце 722,19 долара), размешчаных у дэпазітах і сертыфікатах. На пачатак года аднаведная лічба раўнялася 1 мільёну 939 тысячам 520 рублям (677,48 долара), гэта значыць, за два месяцы зберажэнні ў разліку на аднаго жыхара папоўніліся 178 630 рублямі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Выбары-2010

ВЫГАДНЫ ФОН

Партыйцаў на ўчастках будзе хоць і няшмат, але ж значна больш, чым на мінулых мясцовых выбарах

ВОСЬ і яшчэ адзін этап выбарчай кампаніі за плячыма. 6387 участковых выбаркамаў укамплектаваныя. У кагорту тых, хто зойме ца падлікам галасоў, трапіла і пяцёра расіян, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі нашай краіны. Па традыцыі, у камісіях гендэрны дысбаланс: 67,7 адсотка жанчын (46 608 удзельніц). Крыху пра ўзроставую структуру: маладых людзей (да 30 гадоў) ва ўчастковых выбаркамах будзе 11,3 адсотка (7810 чалавек).

— Фарміраванне ўчастковых выбарчых камісій прайшло ва ўстаноўленыя тэрміны і ў поўнай адпаведнасці з выбарчым заканадаўствам, — так адрэкамендаваў нам чарговы этап электаральнай кампаніі **сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай ЛАЗАВІК.**

Асаблівую ўвагу ён звярнуў на долю чыноўнікаў у выбаркамах.

— Усяго ў склад участковых камісій уключаны 68 881 чалавек, сярод іх дзяржаўных службоўцаў — 2 696 (ці 3,9 адсотка). А гэта значыць, што патрабаванні Выбарчага кодэкса аб прысутнасці ў складзе камісій не больш адной траціны дзяржслужбоўцаў выкананыя, ды яшчэ і з запасам.

Ад грамадзян шляхам падачы заяў у выбаркамы гэтага ўзроўню ўключана 26 731 асоба (38,8 адсотка), ад працоўных калектываў — 15 345 (22,3 адсотка). Прадстаўнікоў палітпартый і грамадскіх аб'яднанняў ва ўчастковых камісіях будзе 26 805 (38,9 адсотка). Доля грамадскіх аб'яднанняў у гэтай лічбе, як заўжды, значна больш важкая: ад іх уключана 25 233 прадстаўніка. У той час як партыйцаў толькі 1 572 (усяго 2,3 адсотка ў агульнай масе супрацоўнікаў участковых выбаркамаў). Аднак усё, як вядома, пазнаецца ў параўнанні. Напрыклад, на мінулых мясцовых выбарах 2007 года ад партый ва ўчастковых камісіях працавала куды менш — 113 прадстаўнікоў. На такім фоне сёлетнія лічбы выглядаюць значна больш прывабна.

— Вельмі адчуваецца розніца ў складзе участковых камісій на гэтых выбарах у параўнанні з мінулымі, — акцэнтуе сакратар ЦВК. — Тады ў камісіі трапіла 7 456 прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў (што складала трохі больш за 10 адсоткаў у агульнай колькасці ўключаных у склад участковых камісій), а сёлета — 25 233 (36,6 адсотка). Партыйцаў на мінулых выбарах было ўключана ўсяго 113 (што складала 0,2 адсотка ад сукупнай колькасці членаў участковых камісій), а на гэтых — 1572 (2,3 адсотка). Адрозніваецца і ўключэнне ў склад камісій апазіцыі. Калі на мінулых выбарах быў толькі адзін прадстаўнік АГП, то ў гэтую кампанію прадстаўленыя і БСДП (Грамада), і «Справядлівы свет», і БНФ, і АГП, і ЛДП. Можна сказаць, што змены ў выбарчым заканадаўстве значна лібералізавалі працэдуру фарміравання выбарчых камісій і раскрылі больш шырокія прававыя рамкі для ўдзелу палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у гэтым працэсе. Змены, у першую чаргу, скіраваныя на тое, каб палітпартыі і грамадскія аб'яднанні больш свабодна маглі браць удзел ва ўсіх этапах выбарчай кампаніі, а таксама на тое, каб узрастала актыўнасць гэтых грамадскіх утварэнняў. І мы назіраем велізарны прагрэс у справе прыцягнення палітычных партый да работы.

Колькасны рэйтынг па прадстаўніках партый афарміўся такім чынам: Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя — уключана 432 (пры заяўцы 434), КПБ — 427 (прапанавана 516), Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці — 342 (прэтэндавала 358), Беларуская аграрная партыя — 131 (спробу зрабілі 132), Ліберальна-дэмакратычная партыя — 95 (столькі і вылучалася), Рэспубліканская партыя аб'яднаных левых «Справядлівы свет» — 31 (вылучана было 160), АГП — 23 (а спрабаваў 281), партыя БНФ — 17 (са 122 вылучаных), Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) — 5 (з 24 прапанаваных кандыдатур).

У цэлым жа заяўкі партый задаволеныя прыблізна на 70 адсоткаў. Яны прапанавалі для ўключэння 2212 сваіх прадстаўнікоў (2,9 адсотка ў агульнай колькасці патэнцыйных супрацоўнікаў участковых камісій). А працаваць у камісіях будзе 1572 (2,3 адсотка).

— Доля партыйцаў у агульнай масе членаў камісій фактычна засталася нязменнай у параўнанні з доляй у агульнай колькасці прэтэндэнтаў, — рэзюмуе М. Лазавік.

Захавалася і геаграфічная дыспрапорцыя: з 1572 партыйцаў 1140 будуць выконваць свае абавязкі ва ўчастковых камісіях сталіцы.

Сярод прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў больш за ўсё членаў ФПБ — 8886. Ад БРСМ на ўчастках будзе працаваць 3813 чалавек, ад Беларускага Саюза жанчын — 3684, «Белай Русі» — 3341, Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў — 2019, двое — ад грамадскага аб'яднання БНФ «Адраджэнне», на долю іншых ГА даводзіцца 3488 месцаў у выбаркамах.

Што ж, цяпер мы ў чаканні звестак пра склад саміх кандыдатаў. Дакументы на рэгістрацыю можна падаваць да 15 сакавіка. На працягу наступнай дэкады выбаркамы прымаюць рашэнне аб рэгістрацыі (ці адмове ў ёй). А ўжо да 16 сакавіка маюць быць вызначаныя месцы для правядзення кандыдатамі масавых мерапрыемстваў (сходаў па-за памяшканнямі, мітынгаў, пікетаў), на якія, дарэчы, не патрэбны асобны дазвол (яны праводзяцца ў паведамляльным парадку). Да гэтага часу будзе вырашана таксама, дзе размясціць агітацыйныя лістоўкі, у якіх памяшканнях праводзіць сустрэчы з выбаршчыкамі і гэтак далей. Агітацыя як-ніяк павінна быць самым прыкметным і цікавым этапам выбарчай кампаніі, прынамсі ў тэорыі.

Ала МАЧАЛАВА.

«БЕЛАВІЯ» ПАВЯЛІЧВАЕ КОЛЬКАСЦЬ РЭЙСАЎ У МАСКВУ ДА 6 НА ТЫДЗЕНЬ

З 15 красавіка Нацыянальная авіякампанія «Белавія» пачынае выконваць дадатковы рэгулярны рэйс па маршруце Мінск — Масква з пасадкай у аэрапорце Унукава.

Тройчы на дзень самалёты «Белавія» лятаюць у аэрапорт Шарамецьева-1 (тэрмінал В), двойчы — у Дамадзедава, а цяпер і ва Унукава. Ранні вылет з Масквы і прыбыццё ў Мінск дазволіць пасажырам, у першую чаргу дзелавым людзям, рацыянальна выкарыстоўваць час знаходжання ў Беларусі. А позні вылет з Мінска ў Маскву дае магчымасць масквічам, якія знаходзяцца ў камандзіроўцы ў Беларусі, паспець закончыць усе свае справы і дабрацца дадому. Палёты Мінск — Масква (Унукава) — Мінск будуць выконвацца штодзень (за выключэннем рэйса з суботы на нядзелю) пераважна на камфартабельных рэактыўных самалётах CRJ-100/200 вытворчасці канадскага авіябудаўнічага канцэрна «Бамбардзье» з абслугоўваннем у бізнэс і эканамічным класах. Агульны час палёту складзе 80 хвілін.

Андрэй ПЯТРОЎ, «Мінск—Навіны».

РАСІЙСКІ БАНК АДКРЫВАЕ ПРАДСТАЎНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ

Яшчэ адно прадстаўніцтва замежнага банка пачынае працу ў Беларусі: Нацыянальны банк дазволіў расійскаму ЗАТ «Рэспубліканскі банк» адкрыць у нашай краіне сваё прадстаўніцтва.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі галоўнага банка нашай краіны Міхаіл Журавовіч, згаданае прадстаўніцтва банка адкрываецца для вывучэння магчымасцяў далейшага развіцця гандлёва-эканамічных сувязяў паміж Беларуссю і Расіяй, а таксама для ўдасканалення сеткі карэспандэнцкіх адносінаў банка. ЗАТ «Рэспубліканскі банк» зарэгістравана Цэнтрабанкам Расіі ў лістападзе 1995 года і ажыццяўляе банкаўскую дзейнасць на падставе генеральнай ліцэнзіі ад 6 лістапада 2002 года.

Ігар ГРЫШЫН.

НАЦЫЯНАЛЬНУЮ платформу бізнэсу Беларусі на 2010 год ухваліла дзелавая супольнасць 10 сакавіка на XI Асамблеі дзелавых колаў, дзе, акрамя ўласна бізнэсменаў, прысутнічалі чыноўнікі, дэпутаты і замежныя госці. Асноўная мэта прынятай платформы, па словах старшыні Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Уладзіміра КАРАГІНА, — скарачэнне выдаткаў бізнэсу для павышэння яго канкурэнтаздольнасці на ўнутраным і знешнім рынках — змяншэнне падатковага ціску і зніжэнне выдаткаў на выкананне патрабаванняў тысячы актаў заканадаўства. Сярод іншых мэтаў Уладзімір Мікалаевіч таксама назваў паляпшэнне дзелавога асяродка, кансалідацыю бізнэс-супольнасці, развіццё паўнавартаснага дыялогу бізнэсу і ўлады, а таксама развіццё механізмаў самарэгулявання рынку.

— Мы шмат спрачаліся пры напісанні Нацыянальнай платформы бізнэсу, шмат дыскутавалі, адмовіліся ад некаторых прапаноў для таго, каб засяродзіцца на самым важным і галоўным.

Прынамсі, тэкст Нацыянальнай платформы падзелены на шэсць раздзелаў згодна з прыярытэтнымі для бізнэсу напрамкамі рэфармавання нацыянальнай эканомікі: рэалізацыя правоў уласнасці і развіццё рынкавых інстытутаў, пашырэнне прасторы для прыватнай ініцыятывы, павышэнне канкурэнтаздольнасці бізнэсу і дзяржавы, партнёрства і давер бізнэсу і ўлады, скарачэнне падатковага ціску і рэфармаванне бухгалтарскага ўліку, адкрытасць дзяржавы і палягчэнне доступу да якаснай інфармацыі і ведаў.

— У працэсе падрыхтоўкі папярэдніх платформаў мы атрымлівалі папрокі, што гэта, маўляў, выпрошванне нейкіх ільготаў і прывілей для малога бізнэсу. Але гэта далёка не так, — кажа Уладзімір Карагін. — Платформа — гэта імкненне да нармальных умоў вядзення бізнэсу: 24 гады, пачынаючы з кааператыўнай дзейнасці, развіваецца ў краіне бізнэс, а мы ўсё змагаемся за тое, каб былі гэтыя нармальныя ўмовы... А ў часы сусветнага фінансавага крызісу стаіць пытанне пра паскарэнне мадэрнізацыі эканомікі і стварэнне мадэрнізацыйных праграм, бо калі мы гэтага не зробім, то рызыкуем надоўга застацца на перыферыі сусветнага развіцця.

Пра мадэрнізацыю казаў у сваім выступленні і **Андрэй ТУР, намеснік міністра эканомікі:**

— Асноўная задача, якую наша краіна вырашае на гэтым гістарычным этапе, — мадэрнізацыя эканомікі ў цэлым, — заявіў Андрэй Мікалаевіч і расказаў пра досвед Японіі і Паўднёвай Карэі, якія ў свой час таксама прайшлі шлях мадэрнізацыі эканомікі, але розным чынам дасягнулі прыкладна аднолькавых вынікаў — у Японіі дамінаваў прыватны бізнэс, а ў Паўднёвай Карэі быў жорсткі кантроль дзяржавы.

Разам з тым намеснік міністра эканомікі пагадзіўся, што нельга супрацьпастаўляць дзяржаўную палітыку інтарэсам бізнэсу, а трэба, наадварот, аб'ядноўваць намаганні. Андрэй Тур таксама інфармаваў прадпрымальнікаў, што ў сумесным плане Саўміна і Нацбанка па дасягненні прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця ў 2010 годзе прадугледжаная распрацоўка праекта закона пра прыватна-дзяржаўнае партнёрства, што павінна стаць «нашай агульнай задачай гэтага года».

Уладзімір ЗІНОЎСКІ, старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта і Савета па развіцці прадпрымальніцтва, таксама лічыць добрай справай прыняцце Нацыянальнай платформы:

— Прыняцце платформы, якая выразна акрэслівае пазіцыю бізнэсу, з'яўляецца важным не толькі для дзелавой супольнасці, але і для дзяржавы ў цэлым, бо гэта стварае аснову для ўзаемадзеяння, дыялогу, наладжвання плённага супрацоўніцтва. І ад таго, наколькі эфектыўным будзе гэтае ўзаемадзеянне, залежаць не толькі тэмпы пераадолення крызісу, але і перспектывы далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы.

Кіраўнік даследчага цэнтра «Мізэса» Яраслаў РАМАНЧУК выдзеліў тры галоўныя ідэі Нацыянальнай платформы: па-першае, трэба давяраць прадпрымальнікам, па-другое, трэба давяраць чыноўнікаў і мець даступную інфармацыю пра іх дзейнасць, каб было бачна, «хто на ўкладзены рубель дае максімум выгады і карысці, а хто замест аднаго рубля траціць два або тры», ну і па-трэцяе, трэба даць свабоду выбару спажыўцу.

А вось **Віктар МАРГЕЛАЎ, сустаршыня Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва**, звярнуў увагу бізнэс-супольнасці на тое, што простай рэалізацыі платформы недастаткова, трэба глядзець на ўсё больш глабальна і разумець, які рынак патрэбны Беларусі і як спалучыць матэрыяльныя выгоды, духоўнасць і веды.

— Дзяржава, несумненна, павінна ўсвядоміць сваю новую ролю, аддаць частку функцый для самарэгулявання арганізацыям, а тыя, у сваю чаргу, павінны падхапіць гэты цяжар. Але вялікае пытанне — ці здольная сёння дзелавая супольнасць узяць на сябе такія функцыі? Па шчырасці скажу, што тут не ўсё так проста — вялікую заклапочанасць выклікае пасіўнасць шырокіх мас прадпрымальнікаў, слабасць іх структур і экспертнай супольнасці, якія ці гасціліцах часта прапануюць няўвязгадны курс абмену. Што, лепш адразу яшчэ дома набыць валюту краіны наведвання ў патрэбным аб'ёме, а калі не ўсе грошы разыдуцца, то рэштку зноў дома мяняць на долары?

— Нявыгадна. Можна істотна страціць. З уласнага досведу настойліва раю карыстацца электроннымі грашыма. Іх яшчэ называюць лічбавымі грашыма. Сутнасць у тым, што вы можаце карткай беларускага банка, у якім у вас, скажам, доларавы рахунак, разлічвацца за пакупкі і паслугі за мяжой. Працэс канвертацыі часткі вашых зберажэнняў у еўра, злотыя, літы ці латы будзе аўкцыяльяцца аўтаматычна і без утрымання працэнтаў. А ў абменных пунктах з вас «здзярэуць» як мінімум два працэнты, а можа і больш. Таму ў сучаснага і беражлівага чалавека павінна быць банкаўская картка.

А лепш не адна. У мяне, напрыклад, дзясятак картак розных банкаў. Праз іх я вяду амаль усе разлікі. Як дома, так і за мяжой. Наяўных грошай пры сабе не нашу, хіба толькі нейкую дробязь на ўсялякі выпадак І гэта, паверце, вельмі зручна. Няма праблем заплаціць за кватэру, тэлефон, газ, ваду і г.д. Я неяк нават пачак запалак набыў з дапамогай карткі. Акрамя гэтага, ганарары за публікацыі, выступленні, лекцыі, дарэчы, і для банкаўскіх работнікаў, мне дасылаюць на картку. Не трэба некуды ехаць, стаяць у чарзе ў касу, губляць дарагі час.

— Няўжо для гэтага неабходна аж дзесяць банкаўскіх картак? Навошта вам іх так шмат?

— Гэта яшчэ не шмат. Я ведаю людзей, у якіх іх значна больш. Па-другое, я — эканаміст. Мне цікава назіраць і аналізаваць, як на практыцы працуюць карткі розных банкаў: «Беларусбанка», «Пріорбанка», Белзнешэканамбанка і іншых. За гэтай формай разлікаў — будучыня. Між іншым, пераважная большасць гандлёвага абароту вядзецца ў электронных грошах. Хутка і насельніцтва пяройдзе на разлікі праз карткі. Асабліва гэта будзе карысным для людзей сталага ўзросту. Грошы на картцы — значыць менш шанцаў згубіць іх (можна згубіць картку, а не грошы ў банку), забыць месца «тайніка», стаць ахвярай прайдзісветаў ці рабаўнікоў. Ды і для моладзі і людзей сярэдняга ўзросту яна будзе карыснай, асабліва пры набыцці дарагой кватэры, машыны, мэблі. Вам не трэба ўсю суму несці з сабой на месца здзелкі, а прыхапіць картку і разлічыцца з яе дапамогай.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Беларускі бізнэс сфармуляваў свае пажаданні на 2010 год у Нацыянальнай платформе

У НАС АДНА «ЎМОЎНАЯ АДЗІНКА» — РУБЕЛЬ

ПРА некаторыя асаблівасці разлікаў на беларускім рынку тавараў і паслуг у эквіваленце іншых валют наш карэспандэнт гутарыць з вядомым беларускім эканамістам, членам Грамадска-кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Л.Ф. ЗАІКАМ.

— Леанід Фёдаравіч, памятаеце, слынны персанаж Астап Бэндэр лічыў карысным чытаць газеты, бо там шмат чаго цікавага друкуецца. Думаецца, што яго, як эксклюзіўнага спецыяліста па адбіранні адносна сумленнымі спосабамі грошай у заможных суграмадзян, прыцягнулі б аб'явы ў сённяшніх газетах наступнага зместу: «Вокны з ПВХ — ад 30 у.а.!», «Шафы-купэ поўнай камплектацыі — 1,5 — 220 у.а., 2,0 — 250 у.а., 3,0 — 375 у.а.», «Падлога ламінаваная — ад 8 у.а. кв. м», «Мэбля — ад 300 у.а.», «Дзверы металічныя — ад 155 у.а.» Гэты пералік тавараў даволі шырокага ўжытку за грошы пад назвай «у.а.» можна працягваць і працягваць. Кошт адпачынку таксама ёй вымяраецца, напрыклад, «Грэцыя — ад 99 у.а.». Адкуль яна ўзялася на нашу галаву, гэтая «ўмоўная адзінка»?

— Адкажу, але адразу невялікая заўвага. Цэны можна пісаць ва «ўмоўных адзінках», а прадаваць у Беларусі толькі за беларускія рублі. Інакш гэта будзе парушэнне закона і адпаведнае пакаранне. А цяпер што такое «ўмоўная адзінка». Думаеце, іншая назва долара ці еўра? Не. У Беларусі ёсць адна грашовая «ўмоўная адзінка» — рубель. Усе іншыя валюты — безумоўныя адзінкі. Так і толькі так варта разглядаць з пункту погляду эканомікі цэны ва «ў.а.».

А цяпер некалькі слоў адносна гісторыі пытання. Ва ўсіх краінах, якія праходзяць праз сістэмны крызіс, узнікаюць вялікія праблемы з уласнай грашовай адзінкай. Надыходзіць час, калі там грошы з-за аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын перастаюць паўнацэнна працаваць. А яны, нагадаю, павінны строга і няўхільна выконваць пяць функцый: мера кошту, сродак абароту, сродак плацяжу, надзейны сродак зберажэнняў ці як яшчэ кажуць — скарбаў. Асобныя валюты выконваюць ролю сусветных грошай: долар, еўра, іена. У свой час савецкі рубель паступова перастаў выконваць гэтыя функцыі і ператварыўся ў грашовы сурагат: каляровыя паперкі, якія страчвалі плацежаздольнасць. На змену гэтым сурагатным грошам прыйшлі іх замяняльнікі ў выглядзе «вечназялёных» амерыканскіх долараў. Хоць яшчэ зусім нядаўна іх наяўнасць у савецкага грамадзяніна, а тым больш нейкія аперацыі з імі, лічылася сур'ёзным злачынствам. Аднак у 90-х гадах долары выціснулі савецкія грошы, якія тады перасталі быць мерай кошту тавараў. Гэту функцыю ўжо выконваў долар, які дыпламатычна назвалі «ўмоўнай адзінкай» — «у.а». Праз яе ўжо вёўся продаж ці пакупка вельмі многіх тавараў.

— Наколькі я памятаю, гэта быў даволі складаны, хваравіты і нярэдка драматычны працэс на яшчэ пакуль савецкай прасторы.

— Так. І суправаджаўся ён стратай павагі і даверу да непахіснага некалі савецкага рубля. Першымі ад яго адмовіліся тады савецкія рэспублікі Прыбалтыкі, якія паміж сабой ужо ціха вырашылі ісці на Захад, а таму пачалі актыўна пазбаўляцца ад савецкай наяўнасці. «Прыбалты» везлі ў рэспублікі Савецкага Саюза чамаданы грошай, асабліва ў суседнюю Беларусь, і скуплялі ў нас аўтамабілі, тэхніку, тавары шырокага спажывання, сельгаспрадукцыю. Напрыклад, прапаноўвалі добрую цану ў памежных раёнах за кароў, іншую жывёлу, птушку. Ліхаманкава «скідвалі» таксама савецкія грашовыя знакі і жыхары рэспублік Сярэдняй Азіі. Узбекі прывозілі да нас мільёны наяўных рублёў і «вымятлі» склады баз і крамаў. Прычым таксама за цаной не стаялі.

— Чаму такі недавер узнік у нашых былых братоў па Саюзе да савецкага рубля?

— Адказ просты: ён перастаў выконваць такую вельмі прывабную для савецкіх грамадзян, асабліва дзялкоў ценявога бізнэсу, функцыю зберажэнняў, а ў апошніх — назапашвання багацця. Тагачасныя махляры, раскрадальнікі дзяржаўнай уласнасці, так званыя «цэхавікі», велізарныя грошы (у асноўным пяцідзесяцірублёвыя асігнацыі) захоўвалі пераважна ў трохлітровых слоіках са шкла, якія закопвалі ў зямлю. Пра афшорныя зоны, схемы выводу капіталаў у замежныя банкі тады нават і не марылі. У мэтах палегчыць ціск грашовай масы на бедны рынак СССР яго міністр фінансаў Паўлаў ініцыяваў аднойчы вывад з абароту пяцідзесяцірублёвых асігнацый. Але гэты адчайны крок, як і іншыя меры, не здолелі супыніць зніжэнне курсу савецкага рубля. А вось долар ЗША выдатна спраўляецца з функцыяй назапашвання скарбаў для багатых і збераженняў для астатняга насельніцтва. Увогуле без гэтай функцыі грошы ўжо не грошы.

— Усё гэта зразумела. Але з'яўленне «ўмоўнай адзінкі» было вымушанай рэакцыяй на выкліканы развалам СССР эканамічны крызіс, яе прысутнасць на рынку ўяўлялася часовай. Той крызіс даўно скончыўся, а «ў.а.» засталася і яна па-ранейшаму ў нас у пашане. Чаму?

— «У.а.» — гэта не зусім чыста антыкрызісная мера. «У.а.» — у першую чаргу лічыльная адзінка, кажучы навуковай мовай, мера кошту, напрыклад, паўсядзённых тавараў, працы, прапорцый паміж пенсіяй і заработнай платай. «У.а.» узнікае як пераходная мера на шляху развіцця са старымі грашыма да ўзнікнення і ўмацавання новых грашовых знакаў. На постсавецкай прасторы ў якасці «ўмоўнай адзінкі» быў абраны долар ЗША. Але, заўважце, мы ў свой час усё ж не перайшлі поўнасцю на долар, хоць пры вялікім жаданні маглі б. Не перайшлі, бо апасаліся негатыўных наступстваў гэтага кроку.

Памятаеце, тады ўвогуле ўзнікалі таварныя замяняльнікі грошай. У нас адзін час у хаду была так званая «вадкая валюта», а яе адзінкай вымярэння стала бутэлька гарэлкі. Цяпер смешна пра гэта казаць. І мы не адзінкавыя ў такіх вынаходствах. У Югаславіі падчас вайны самым хадавым замяняльнікам грошай на пэўны час стала каністра бензіну.

— У тыя складаныя часы ўзнікла і, здаецца, надзейна прыжылася яшчэ адна грашовая мера — так званая базавая велічыня. Яна, што, сястра «ўмоўнай адзінкі»?

— Паралельна з «у.а.» для вызначэння памераў суадносінаў заработнай платы і памераў сацыяльных выплат, пенсій, стыпендый, розных плацяжоў, у тым ліку камунальных, штрафаў, была ўведзена адна базавая велічыня. Яе роля шмат у чым супадае з задачай «у.а.» у разліках за тавары і паслугі. Базавая велічыня — таксама часовая мера. Яна з часам аб'ектыўна павінна знікнуць, як і паняцце «ў.а.», якое ўжо ператварылася ў пережытак часоў пераходу да рынкавай эканомікі.

— Будзем спадзявацца. Але пакуль «у.а» няблага сябе адчувае. На цярністым шляху ад старых да новых грошай «умоўная адзінка» нярэдка паводзіць сябе як сапраўдны хамелеон. Як толькі курс долара істотна знізіўся ў адносінах да еўра, то многія нашы вынаходлівыя прадпрымальнікі «ў. а.» пачалі лічыць у еўра, чым істотна павысілі кошт тавараў і паслуг у рублёвым эквіваленце. Скажам, пакой у кватэры для двух іншагародніх студэнтаў раней быў (у доларах) 150 «у.а.» у месяц плюс камунальныя плацяжы, то цяпер 150 еўра плюс камунальныя плацяжы. «У.а.» столькі ж, але ў беларускіх рублях плата вырасла.

— Гэта тактычны ход прагных да заробкаў нашых асобных суграмадзян. На жаль, я не валодаю статыстыкай пераводу «ў.а.» з долара ў еўра, але з пачаткам зніжэння курсу апошняга, думаю, такая практыка запаволіцца. Затое я ведаю, што традыцыйна беларусы давяраюць долару больш, чым іншым замежным валютам. Хоць дзе тая Амерыка, а Еўрасаюз вось ён, побач, мы мяжуем з яго краінамі. Але чамусьці беларусы долар шануюць больш. Менавіта ў доларах вядзецца разлік цэнаў за кватэры і дамы, аўтамабілі, у доларах захоўваецца большая частка зберажэнняў «у панчохах», у долярах, нарэшце, карупцыянеры бяруць і даюць хабар. Карацей, ён пакуль універсальны як мера вызначэння кошту тавараў і паслуг. Такі вось парадокс.

Па-другое, усе знешнеэканамічныя разлікі ў нашай краіне робяцца ў долярах, з гэтай валютай працуюць амаль усе вядомыя і ўплывовыя міжнародныя арганізацыі, напрыклад, ААН. Дарэчы, і Сусветны банк усё лічыць у долярах, скажам, аб'ёмы валавога ўнутранага прадукту краін свету, якія ўваходзяць у ААН.

А тое, што частка нашага малога і сярэдняга бізнэсу пачала весці разлікі «у.а.» у еўра, так гэта іх маленькія хітрыкі, імкненне трохі больш зарабіць. Яны, гэтыя хітрыкі, паверце, не маюць ніякага дачынення да рэальнага кошту долара і еўра. З такім ка поспехам можна ўзяць за адну «ў.а.» мангольскі тугрык, песо ці ўвогуле якую-небудзь экзатычную афрыканскую валюту.

— Здзіўляе і абурае, што рублёвы змест «у.а.» прадпрымальнікі і гандляры вызначаюць як хочуць. У адных долар ці еўра адпавядае курсу Нацбанка, у другіх — як у абменных пунктах на дзень продажу, у трэціх нават вышэй на 50—100 рублёў, чым у «абменніках».

— Выйсце адно — канчаткова скасаваць «у.а.». У нашай краіне, паўтарыся, забаронена весці разлікі ў замежнай валюце, толькі за беларускія рублі. І гэта правільна. У Расіі, напрыклад, рашуча пазбавіліся ад ужывання «ў.а.». Там забаронена яе выкарыстоўваць у аб'явах, пісаць на цэнніках. Усё купляецца і прадаецца выключна за расійскія рублі. Ды і ў нас можна знайсці ўсё больш аб'яў аб продажы тавараў, тых жа камп'ютараў, за беларускія рублі. «Умоўная адзінка» павінна сысці з практыкі разлікаў. Гэта ўжо несучасна. Дзе вы бачылі ўжыванне «у.а.» у ЗША, развітых краінах Еўропы, у азіяцкіх Японіі, Кітаі?

***—

АД СНЕГУ ДА ВАДЫ АДЗІН КРОК

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Нават мінчане вядуць падрыхтоўку супраць вясновага падтаплення. Жыхар прыватнай сядзібы ў сталічным мікраёне Лошыца, што побач з ракою Свіслач, загадзя высцілае дарогу ад весніц да ганку.

ПАВОДКА НЕ МАЕ МЕЖАЎ

Выратавальнікі і метэаролагі Брэсцкай вобласці і памежных раёнаў Украіны наладзілі абмен інфармацыяй па магчымай веснавой паводцы. Цяпер на тэрыторыі Брэсцкай вобласці кантроль за ўзроўнем вады вядуць 26 гідралагічных пастоў. Акрамя гэтага, інфармацыя паступае з пяці пастоў на ўкраінскай тэрыторыі — па рэках Прыпяць, Случ, Стыр, Гарынь і Заходні Буг. Як лічаць у абласным Брэсцкім упраўленні МНС, аператыўны абмен інфармацыяй дазволіць беларусам і ўкраінцам зладжана кіраваць сістэмай шлюзаў, а значыць, мінімізаваць наступствы ўздзеяння «вялікай вады».

Яна СВЕТАВА.

КАНСТЫТУЦЫЯ БЕЛАРУСІ — АСНОВА САЦЫЯЛЬНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ І НАРОДАЎЛАДДЗЯ

Канстытуцыя — абавязковы элемент сучаснай дзяржавы, аснова дэмакратыі, народаўладдзя. Значэнне Канстытуцыі такое вялікае, што сам факт яе прыняцця ацэньваецца як крок да дэмакратыі.

Канстытуцыя — Асноўны Закон, аснавatворны палітыка-прававы акт грамадства і дзяржавы, які валодае найвышэйшай юрыдычнай сілай, прымаецца ў адмысловым парадку, замацоўвае арганізацыю публічнай улады ў цэнтры і на месцах, рэгулюе ўзаемаадносіны гэтай улады, грамадства і індывідаў.

Пятая па ліку Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, прынятая 15 сакавіка 1994 г. — гэта найважнейшы палітыка-прававы дакумент, дагавор суверэннай улады і ўсяго народа Беларусі. Яна з'яўляецца асноваю, ядром прававой сістэмы, рэгулюе самыя стабільныя і важныя грамадскія адносіны, выступае ў якасці арыенціру, узору цяперашняга і будучага дзяржаўнага і сацыяльнага жыцця.

Канстытуцыя ўпершыню ў гісторыі Беларусі была прынятая шляхам свабоднага дэмакратычнага волевыяўлення і адлюстравала маральны, палітычны ўзровень грамадства, яго асноўныя ідэі канца XX стагоддзя, увасобіла ў сабе сацыяльныя ідэалы беларускага народа, якія найбольш ярка выражаныя ў вершы Я. Купалы «А хто там ідзе?»

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агрpreміstай такой грамадзе?
— Беларусы...
А чаго ж, чаго захацелась ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?
— Людзьмі звацца.

Канстытуцыя не толькі юрыдычна аформіла якасна новую дзяржаўнасць, палітычныя і сацыяльна-эканамічныя змены, што адбыліся ў дзяржаве і грамадстве, але і завяршыла фарміраванне суверэннай беларускай дзяржавы. На думку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі, Канстытуцыя «ўвасобіла ў сабе пераемнасць і вопыт шматвяковага гістарычнага шляху Беларусі, азнаменавала новы этап у палітычным і сацыяльна-эканамічным развіцці нашай краіны».

Яна вызначыла ўзаемныя абавязкі і адказнасць паміж грамадзянінам і дзяржавай. Больш за тое, дзяржава ўзяла на сябе абавязацельства па стварэнні ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы. Максімальнае набліжэнне да дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы, да «дасканалага» грамадства магчымае толькі праз выкананне ўсімі Канстытуцыі, праз фарміраванне правапрымяняльнай практыкі, якая адпавядае яе сутнасці, праз захаванне правоў і свабодаў грамадзян і свядомага выканання апошнімі сваіх абавязкаў. Рэалізацыя правоў і свабод грамадзян цесна звязана з выкананнем імі сваіх непасрэдных канстытуцыйных абавязкаў перад сям'ёй, грамадствам і дзяржавай. На практыцы гэта часам не ўсімі ўсведамляецца, забываецца другая частка дэвіза сённяшняй палітыкі: «Дзяржава для народа, для чалавека, а чалавек — на карысць сваёй Айчыны».

Найважнейшае значэнне нашай Канстытуцыі абумоўліваецца тым, што яна ўпершыню ў нашай канстытуцыйнай практыцы замацавала шэраг асноватворных прынцыпаў, дэмакратычных інстытутаў, вызначыла механізм ажыццяўлення дзяржаўнай улады на аснове прынцыпу падзелу і ўзаемадзеяння ўладаў.

На працягу тэрміну дзеяння Канстытуцыі на аснове і ў адпаведнасці з ёю створаная шырокая заканадаўчая база для эканамічных, палітычных і сацыяльных пераўтварэнняў, забеспячэння правоў і свабодаў грамадзян, гарантый іх рэалізацыі, сфарміраваная новая прававая сістэма, якая адлюстроўвае сучасныя дасягненні еўрапейскай прававой культуры. Беларуская Канстытуцыя гарантуе кожнаму грамадзяніну правы і свабоды, неабходныя для стваральнай працы, годнага жыцця і гарманічнага ўсебаковага развіцця асобы.

Правы і свабоды чалавека і гарантыі іх рэалізацыі — найвышэйшая каштоўнасць і мэта грамадства і дзяржавы. Яны размешчаныя ў Канстытуцыі на першым месцы. У сувязі з гэтым можна нават сказаць, што Канстытуцыя Беларусі — гэта Канстытуцыя правоў і свабодаў чалавека. У частцы правоў і свабодаў чалавека яна адпавядае стандартам міжнародна-прававых актаў (Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, Міжнароднаму пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах і Міжнароднаму пакту аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах). Канстытуцыя ўвасобіла ў сабе вопыт канстытуцыйнай пабудовы сучасных дэмакратычных дзяржаў Захаду. Яна адпавядае патрабаванням сучаснай канстытуцыйнай дактрыны і асноўным рысам канстытуцый дэмакратычных дзяржаў.

Для сваёй аховы і абароны каштоўнасцяў Канстытуцыя прадугледзела стварэнне Канстытуцыйнага Суда, які адыгрывае важную ролю ў фарміраванні прававой дзяржавы, ажыццяўленні прынцыпу падзелу ўладаў, у рэалізацыі канстытуцыйных прынцыпаў і забеспячэнні прамога дзеяння канстытуцыйных нормаў.

Да нядаўняга часу Канстытуцыйны Суд ажыццяўляў наступны канстытуцыйны кантроль, г.зн. у адпаведнасці з артыкулам 116 Канстытуцыі правяраў на адпаведнасць Канстытуцыі як акты агульнадзяржаўнага ўзроўню, у тым ліку і законы аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў, так і нарматыўныя акты міністэрстваў, дзяржаўных камітэтаў, мясцовых Саветаў дэпутатаў, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

Разам з тым у апошнія гады дзяржаўныя органы, вызначаныя ў артыкуле 116 Канстытуцыі, амаль не ўносілі прапановы аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў у Канстытуцыйны Суд. У той жа час, зыходзячы з аналізу зваротаў грамадзян і арганізацый, Канстытуцыйны Суд зрабіў выснову аб тым, што на практыцы ёсць пэўныя падставы для ўнясення ў Канстытуцыйны Суд прапаноў аб праверцы канстытуцыйнасці асобных нарматыўных прававых актаў. У прыватнасці, у 2009 годзе ва ўпаўнаважаныя органы паступіла больш як 100 зваротаў грамадзян і арганізацый з просьбай унесці ў Канстытуцыйны Суд прапанову аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў у сувязі з наяўнасцю ў іх, на думку заяўнікаў, супярэчнасцяў, якія цягнуць неабгрунтаванае абмежаванне канстытуцыйных правоў і свабодаў.

Ва ўмовах адсутнасці ў грамадзян права на канстытуцыйную скаргу, Канстытуцыйны Суд лічыць, што павінен быць выпрацаваны механізм рэалізацыі часткі трэцяй артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судовым ладзе і статусе суддзяў, згодна з якой дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, іншыя арганізацыі і грамадзяне звяртаюцца з ініцыятывай аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта да органаў і асобаў, якія валодаюць правам унясення ў Канстытуцыйны Суд прапаноў аб такой праверцы. На думку Канстытуцыйнага Суда, парадак унясення ўпаўнаважанымі органамі прапаноў аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў на падставе зваротаў зацікаўленых асобаў павінен быць дакладна вызначаны на заканадаўчым узроўні. Ён забяспечыць рэалізацыю грамадзянам і арганізацыям права апасродкаванага доступу да канстытуцыйнага правасуддзя.

З прыняццем Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Дэкрэта ад 26 чэрвеня 2008 г. № 14 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь» пачаўся новы этап канстытуцыйнага кантролю. Дэкрэт значна пашырыў кампетэнцыю Канстытуцыйнага Суда, адкрыў новую форму канстытуцыйнага кантролю ў Беларусі, якую прынята называць папярэднім канстытуцыйным кантролем. Дарэчы, Канстытуцыйны Суд у 2009 годзе ў парадку абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці заканадаўстваў разгледзеў 104 законы, у тым ліку 44 законы аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыйным Судом за перыяд сваёй дзейнасці прынята звыш 600 рашэнняў і ўнесена ў дзяржаўныя нарматворчыя органы больш як 170 прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства.

На думку Канстытуцыйнага Суда, канстытуцыйнае правасуддзе ў Беларусі стала рэальнасцю, адным са складнікаў канстытуцыйных асноў беларускай дзяржаўнасці.

Рэальнае жыццё, эфектыўнае дзеянне Канстытуцыі забяспечваецца рэалізацыяй яе нормаў, прынцыпаў і каштоўнасцяў у нарматворчай і правапрымяняльнай дзейнасці.

Наша Канстытуцыя змяшчае велізарны патэнцыял для фарміравання сапраўды народнай суверэннай дэмакратычнай дзяржавы, развіцця чалавека, усіх сферaў жыццядзейнасці, які можа рэалізавацца пры ўмове забеспячэння вяршэнства канстытуцыйных нормаў, іх непасрэднага дзеяння.

Надзеі і чаканні, спароджаныя Канстытуцыяй у нашай свядомасці, не заўсёды могуць рэалізавацца адразу і збыцца ў поўнай меры. Нягледзячы на гэта, усе мы адзіныя ў адным: Дзень Канстытуцыі — гэта, па сутнасці, Дзень народаўладдзя, а таксама і Дзень суверэннай беларускай дзяржаўнасці.

Анатоль ЦІКАВЕНКА, суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

Зачапіла!

А выйсце зусім простае...

Еду на працу аўтобусам, прабіў квіток наміналам 600 рублёў. Кандуктарка папярэдзіла, што ад сённяшняга дня яны нядзейсныя. Быў вельмі (і непрыемна) здзіўлены, але, тым не меней, выкідаць не стаў. Праз некалькі прыпынкаў тая самая сітуацыя паўтарылася з кабетай. Толькі яна, даведаўшыся пра тую неспадзяванку, адрэагавала куды болей эмацыйна. Паводле яе словаў, квіткі яна набыла ў пачатку месяца, калі ўжо ўступілі ў дзеянне новыя тарыфы. Ды ёй прадаўшчыца паабяцала, што гэтыя квіткі будуць дзейнічаць да канца месяца.

Праязныя дзейнічаюць да канца месяца. Пра жэтоны на метро і ўвогуле ніякіх пытанняў няма: закупіўся дый катайся, пакуль маеш. А вось на талончыках з адваротнага боку сапраўды напісана, што «білет сапраўдны... на працягу 10 дзён дзеяння новага тарыфу».

Так, я сапраўды сутыкаюся з такой сітуацыяй упершыню. Але ці шмат хто ведае пра тое, што нягледзячы на наяўнасць пракампасіраванага квітка, можна атрымаць штраф? Бо квіток той, ці бачыце, на 100 рублёў таннейшы за той, што дзейнічае пасля павышэння коштаў. Вось дзе будзе пажыва рэвізорам ці кантралёрам. Ці ўсё ж выйсце ёсць? Напрыклад, даплата няшчасных 100 рублёў кандуктару альбо абмен ім жа старых квіткоў на новыя, зноў жа з даплатай. А далей ужо хай думаюць, што са старымі рабіць.

Дарэчы, пасля могуць пачаць прадаваць іх па кошце, па якім уздумаецца. Як гэта рабілася і робіцца з квіткамі наміналамі 400, 460 (ці колькі) і г.д. рублёў. Мяркую, спачатку трэба разумна арганізаваць працэс, а потым абвінавачваць людзей і караць іх.

Раман ПАТАПЧУК, тэхнік-праграміст ЗАТ «СОФТКЛУБ-Цэнтр распрацоўкі».

КАЛІ ЦЯЛЯ ПОБАЧ

Старшыня аднаго СВК з Ганцавіцкага раёна заявіў у міліцыю, што з цялятніка, які знаходзіцца на малочнатаварнай ферме в. Кукава, выкралі цяля вагой 112 кг. Аператыўная група выехала на месца і ўстанавіла, што зладзеі працуюць у гэтым жа сельгаскааператыве. 21-гадовага мясцовага жыхара пасадзілі ў ізалятар, а са старэйшага ўзялі падпіску аб нявыездзе.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

КРАДЗЕЖ ШЛЯХАМ ЗЛОЎЖЫВАННЯ СЛУЖБОВЫМ СТАНОВІШЧАМ

У такіх дзеяннях падазраецца кіраўнік аднаго з лунінецкіх прадпрыемстваў, дэпутат Лунінецкага раённага Савета. У дачыненні да службовай асобы абласная пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу. Урон, нанесены прадпрыемству па віне кіраўніка, ацэньваецца больш чым на 30 мільёнаў рублёў.

Яна СВЕТАВА.

Перад 8 Сакавіка я сказала мужу, што знайшла парачку новых рэцэптаў святочных страў, якія яму будзе зусім не складана прыгатаваць. Ён так хітра ўсміхнуўся і сказаў, што сам ведае, што будзе гатаваць. Калі пасля паездкі ў супермаркет выгружалі пакупкі, я зразумела, што на свята будуць у нас кальмары. Не стала засмучаць мужа тым фактам, што я іх зусім не люблю. Таму ўгаварыла яго прыгатаваць яшчэ і мяса — маўляў, каб усім гасцям дагадзіць... Але да мяса так ніхто і не дакрануўся, таму што прыгатаваныя кальмары аказаліся вельмі смачнымі, а ўжо як прыгожа ўсё выглядала — проста слоў няма! Пасля святаў я занялася дасканалым вывучэннем пытання, і вось што высветліла.

*Пачнём з таго, што сярод усіх прадстаўнікоў марской жыўнасці кальмары самыя бяспечныя для ежы. Склад і колькасць біялагічна актыўных рэчываў у мясе гэтых малюскаў робіць іх больш карыснымі для чалавека, чым мяса наземных жывёл. У кальмарах утрымліваецца вялікая колькасць карысных для здароўя чалавека мікраэлементаў, такіх як жалеза, ёд, марганец, калій, фосфар, кальцый, а таксама вітаміны групы В і С. Гэтыя морапрадукты проста неабходныя дзецям і старым. Бялок, якога ў кальмарах вельмі шмат, патрэбен дзецям для фарміравання мышачнай сістэмы. Мяса кальмараў змяшчае таксама значную колькасць таурыну, які садзейнічае зніжэнню халестэрыну ў крыві чалавека і аказвае антысклератычнае дзеянне, рэгулюе крывяны ціск, садзейнічае звужэнню артэрый і да т.п. Акрамя таго, **мяса кальмараў з'яўляецца яшчэ і дыетычным прадуктам, бо не ўтрымлівае тлушчу**.*

Цяпер пагаворым пра тое, як правільна выбіраць кальмараў. Правіла першае — кальмары абавязкова павінны быць замарожанымі (дэфраставаныя, г.зн. кальмары, якія ўжо падвяргаліся размарожванню, будуць гарчыць і распаўзацца пры прыгатаванні, гэта па сутнасці ўжо брак — бо парушаныя ўмовы захоўвання). Правіла другое — тушкі кальмара не павінны зліпацца, лёгка павінны аддзяляцца адна ад адной (гэта пацвярджае, што пасля расфасоўкі брыкет не размарожваўся). Плёнка, якая пакрывае тушку, можа быць рознага колеру: ад шэра-ружовага да фіялетавага. Колер, як і памер кальмара, залежыць ад узросту і асяроддзя пражывання (гэта значыць, у якую пару года і ў якім моры быў вылаўлены малюск). І тут увага: правіла трэцяе — мяса пад плёнкай павінна быць толькі **белага колеру**.

Памятаеце рэкламны слоган: «Ненавіджу кошак!» — «Ты проста не ўмееш іх гатаваць». Жарты-жартамі, але штосьці падобнае адбываецца і з кальмарамі. Шмат хто пазбягае іх гатаваць не таму, што яны не смачныя, а менавіта таму, што не ўмеюць іх правільна пачысціць і прыгатаваць.

Тыя, хто лічыць чыстку кальмараў турботным заняткам, моцна памыляюцца. Для таго, каб хутка і без турбот пачысціць кальмараў, выкладваем замарожаныя (!) кальмары ў міску і заліваем крутым кіпенем. Амаль уся скурка-плёнка ўмомант згортваецца, а астатняя выдаляецца вельмі лёгка. Для гэтага адразу зліце кіпень і чысціце кальмараў пад праточнай вадой, рукой аддзяляючы рэшткі плёнкі. Унутры кальмара выдаліце вантробы і хорду (гэта гнуткая празрыстая пласцінка). Добра прамыйце.

Як жа правільна адварыць кальмараў для салаты? Перш-наперш, выкіньце ўсе гэтыя бязглуздыя кніжкі, якія вучаць варыць кальмараў 3—5 і больш хвілін. Упэўнена, што большасць «неаматараў» кальмараў, як і я, каштавалі іх, прыгатаванымі менавіта гэтымі варварскімі спосабамі. Вазьміце ачышчаных і размарожаных кальмараў. Закіпяціце ваду. Дадайце ў яе соль, лаўровы ліст, перац гарошкам. У вар па адным апускайце кальмараў. Спачатку апусціце аднаго. Палічыце да дзесяці і дастаньце кальмара шумоўкай. Пачакайце, калі вада зноў закіпіць, і апускайце наступнага кальмара.

Вось, уласна, усё, што проста неабходна ведаць пра кальмараў. Атрымалася нямала, таму ў наступны раз будзем таксама гатаваць з кальмараў, і абавязкова прымушу мужа падзяліцца сваім фірменным рэцэптам (пакуль мне яго не ўдалося «раскалоць»).

ФІЛЕ КАЛЬМАРА, СМАЖАНАЕ Ў ПАНІРОЎЦЫ

Вазьміце: *500 г сырога мяса кальмара, соль, перац, 2 яйкі, 2 ст. лыжкі малака, паўшклянкі молатых сухароў (можна змяшаць з натаркаваным сырам), алей або сметанковае масла для смажання.*

Адбітае філе кальмара, ачышчанае ад скуркі, можна смажыць цалкам або скрылікамі. Для запраўкі пасыпаць філе соллю і перцам, памакаць у місачцы з узбітым яйкам, змешаным з малаком, абкачаць у молатых сухарах і абсмажваць з абодвух бакоў, пакуль скарыначка не падрумяніцца (літаральна 1,5—2 хвіліны). Падаць на стол з адварной або смажанай бульбай, агароднінай, соусам і салатай.

ХВЕ З КАЛЬМАРА

Нам спатрэбіцца: *1 кг кальмараў, 20 г сталовага воцату, 3 г чорнага молатага перцу, 3 г чырвонага молата перцу, 2 зубкі часнаку, соль, алей.*

Кальмара адварыць, нарэзаць палоскамі даўжынёй 4 см, дадаць воцат, чорны і чырвоны молаты перац, соль, здробнены часнок. Запраўце гатаваным алеем.

КОЛЬЦЫ КАЛЬМАРАЎ У ГАРЧЫЦЫ

На 2 порцыі спатрэбіцца: *2 кальмары, 1 ст. лыжка гатовай гарчыцы, 1 ч. лыжка з верхам сухога насення гарчыцы, 2 яйкі, 2 ст. лыжкі мукі для паніроўкі, 100 г алею.*

Кальмары пачысціце, парэжце кольцамі. Да кольцаў дадайце сталовую лыжку гатовай гарчыцы. Добра перамяшайце і пакіньце марынавацца 1—2 гадзіны пры пакаёвай тэмпературы. Чайную лыжку сухога гарчычнага насення злёгку патаўчыце ў ступцы. Два сырыя яйкі разбіце ў місачку. Дадайце стоўчанае насенне гарчыцы да яек. Добра размяшайце відэльцам яечны льезон. (Льезон (ад фр. liaison — «сувязь», «злучэнне») — загушчальнік для розных страў. Можа быць на аснове яек, мукі, крухмалу, густых вяршкоў. У стравах старажытнай французскай кухні, перш за ўсё з дзічыны, у якасці льезону часта выкарыстоўвалася кроў). Кожнае кольца кальмара добра паніруйце ў муцэ, мачайце ў льезон і абсмажвайце ў добра нагрэтым алеі з двух бакоў. Смажыць трэба толькі да ўтварэння румянай скарыначкі. Даставайце з алею шумоўкай і перакладвайце ў друшляк або на сурвэтку, каб пазбавіцца ад лішку алею. Падавайце ў якасці другой стравы альбо астуджанымі, у якасці закускі. Смачна есці!

КАЛЬМАРЫ З ЧАСНАКОМ І СЫРАМ

Гэта добры рэцэпцік дыетычнай салаты.

Вазьміце: *0,5 кг філе кальмара, 150 г цвёрдага нятлустага сыру, 3 яйкі, 2—3 зубкі часнаку, 0,5 шклянкі поснага маянэзу, 1 ст. лыжку любога зяленіва, сок 1/4 лімона.*

Кальмары адварыце, нарэжце саломкай. Яйкі адварыце, нарэжце кубікамі. Сыр надзярыце на буйной тарцы. Часнок старанна расцісніце. Злучыце гэтыя інгрэдыенты, дадайце здробненае зяленіва, сок лімона і запраўце маянэзам.

«ЯДОМЫ» АНЕКДОТ

— Дарагі, у нас сёння гадавіна вяселля.

— Можа, зарэжам парася?

— Парася ж тут пры чым? Гэта брата твайго зарэзаць трэба, ён жа нас пазнаёміў.

* * *

Прыязджае мужчына ў санаторый на адпачынак, заходзіць, бачыць — яму насустрач ідзе адпачывальнік. Мужчына па-сяброўску яго і пытаецца:

— Як тут у вас кормяць?

— Дасі хлеба — скажу!

* * *

— Дарагая! Які смачны торт!

— Я яго ў краме купіла.

— А сама такі ж спячэш?

— З чаго? У нас ні глютамату натрыю, ні Е517, ні Е1452!..

Организация:

ОАО «ЭРГОНОМИКА»

Учетный номер плательщика: УНП 100066751
Единица измерения: млн руб.
Адрес: г. Минск, К и Мефодия, 8

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 г.

Актив	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства			
первоначальная стоимость	101	19	109
амортизация	102	17	23
остаточная стоимость	110	2	86
Нематериальные активы			
первоначальная стоимость	111	–	–
амортизация	112	–	–
остаточная стоимость	120	–	–
Прочие внеоборотные активы	150	–	–
ИТОГО по разделу I	190	2	86
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	16	10
В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	16	10
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	–	–
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более, чем через 12 месяцев после отчетной даты)	230	–	–
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	30	10
В том числе: покупателей и заказчиков	241	29	9
поставщиков и подрядчиков	242	1	1
Расчеты с учредителями	250	–	–
В том числе: по вкладам в уставный фонд	251	–	–
прочие	252	–	–
Денежные средства	260	88	33
Финансовые вложения	270	23	–
Прочие оборотные активы	280	–	–
ИТОГО по разделу II	290	157	53
БАЛАНС (190 + 290)	300	159	139

ПАССИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	68	68
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	–	–
Резервный фонд	420	4	4
Добавочный фонд	430	5	7
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	440	–	–
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	28	37
ИТОГО по разделу III	490	105	116
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	–	–
Прочие долгосрочные обязательства	520	–	–
ИТОГО по разделу IV	590	–	–
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	–	–
Кредиторская задолженность	620	54	23
В том числе: перед поставщиками и подрядчиками	621	–	–
перед покупателями и заказчиками	622	1	–
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	25	14
по налогам и сборам	625	16	3
по социальному страхованию и обеспечению	626	11	5
прочие кредиторы	628	1	1
Задолженность перед участниками (учредителями)	630	–	–
Прочие краткосрочные обязательства	650	–	–
ИТОГО по разделу V	690	54	23
БАЛАНС (490 + 590 + 690)	700	159	139

Директор **Ходоско А.Д.**
Главный бухгалтер **Ходоско О.Н.**

26 марта 2010 года состоится повторное общее собрание акционеров **ОАО «ЛУКОМЛЬЭНЕРГОМОНТАЖ»,**
расположенного по адресу: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8.

Собрание пройдет по адресу:
г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, актовый зал.

Повестка дня собрания:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году и основных направлениях деятельности Общества на 2010 год.
2. О работе Наблюдательного совета в 2009 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (покрытия убытков) за 2009 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2010 г. и первый квартал 2011 г.
7. Об увеличении уставного фонда Общества путем увеличения номинальной стоимости акций за счет источников собственных средств.
8. Об утверждении регламента работы Общества с реестром владельцев ценных бумаг.
9. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
10. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник – пятница), начиная с 12 марта 2010 г., по месту нахождения Общества (приемная) с 13.00 до 16.00.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 8.00 до 9.45.

Время начала проведения собрания – 10.00.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
- акционеру Общества – паспорт;
- представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 300007839

ОАО «МИНСКЛИФТ» УВЕДОМЛЯЕТ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА

об изменении повестки дня очередного общего собрания акционеров, опубликованной в газете «Звязда» № 32 от 20 февраля 2010 года, внесением вопроса в повестку дня № 11 «О внесении изменений в устав ОАО «Минсклифт».

Наблюдательный совет Общества.

УНП 190292990

ПАЛЯВАЛІ НЕЗАКОННА. З САБАКАМІ

На працягу некалькіх дзён работнікі Гомельскай аблінспекцыі выявілі два факты незаконнага палявання з выкарыстаннем паляўнічых сабак.

Напачатку ў колішнім населеным пункце Дзям'янкі Добрушскага раёна на тэрыторыі зоны адчужэння і адсялення былі затрыманыя два грамадзяніны, што з дапамогай паляўнічага сабакі здабылі казулю. Літаральна праз тры дні ў зоне спакою Гомельскага таварыства паляўнічых і рыбаловаў затрымалі работніка ЖКГ «Гомельскія цепласеткі»: ён з дапамогай лайкі здабыў самку дзіка з двума эмбрыёнамі.

ДАЙ АХВОЦЕ ВОЛЮ — ДАВЯДЗЕ ДА НЯВОЛІ?

У паляўнічых угоддзях Шацкай ваенна-паляўнічай гаспадаркі быў выяўлены факт незаконнай здабычы двух дзікоў.

Падчас абследавання прылеглай тэрыторыі выкліканымі супрацоўнікамі міліцыі былі затрыманыя два падазроныя: работнік садовага таварыства «Чырвонае Урочышча» Уздзенскага раёна і мінчанін. Падчас затрымання апошні паспрабаваў збегчы і выкінуў карабін ІЖ-18 МН з прыцэлам начнога бачання. Узбуджана крымінальная справа. На дачы аднаго з затрыманых знойдзена 14 баявых патронаў калібру 5,45 міліметра і некалькі кілаграмаў мяса дзіка. Высветлілася, што ў канцы мінулага года абодва парушальнікі ўжо прыцягваліся да адказнасці за парушэнне правілаў паляванне. Тады іх аштрафавалі і пазбавілі права займацца паляваннем на паўгода.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СОАО «Минский завод автомобильной комплектации»

ОБЪЯВЛЯЕТ ТЕНДЕР ПО ПРОВЕДЕНИЮ ПРОЕКТНЫХ РАБОТ ПО ОБЪЕКТУ:
«Реконструкция имущественного комплекса со строительством административного здания со складом и склада со сносом зданий по ул. Лынькова, 123».

Предложения принимаются в течение 7 дней со дня публикации по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 123, тел./факс **205 86 00**, тел. **205 85 26** Тельтевский В.Н.

СОАО «Минский завод автомобильной комплектации»

ОБЪЯВЛЯЕТ ТЕНДЕР ПО ПРОВЕДЕНИЮ ИЗЫСКАТЕЛЬСКИХ РАБОТ ПО ОБЪЕКТУ:
«Реконструкция имущественного комплекса со строительством административного здания со складом и склада со сносом зданий по ул. Лынькова, 123».

Предложения принимаются в течение 7 дней со дня публикации по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 123, тел./факс **205 86 00**, тел. **205 85 26** Тельтевский В.Н.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
на заключение договора аренды земельного участка в г. Орше

№ п/п	Месторасположение и площадь земельного участка	Начальная стоимость (руб.)	Условия заключения договора аренды	Инженерное обеспечение участка	Сумма задатка (руб.)
1.	Земельный участок по улице Ленина (четная сторона) на автобусной остановке «Медицинский колледж» в г. Орше площадью 0,0015 га. Кадастровый номер 242400000001011043	113 872	Срок аренды земельного участка – 5 лет. Целевое использование – под торговый киоск по улице Ленина (четная сторона) на автобусной остановке «Медицинский колледж» в г. Орше. Получение разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработка архитектурно-строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года. Начало строительства объекта в течение 6 месяцев со дня утверждения архитектурно-строительного проекта и осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	В квартале застройки по ул. Ленина, где находится земельный участок, выставляемый на аукцион, имеются сети водоснабжения, электрической и телефонной связи, с возможностью подключения предполагаемого объекта.	11 380

Примечание:

1. Аукцион состоится **в 11.00 25 марта 2010 г.** в г. Орше в здании Оршанского горисполкома по ул. Островского, 2.

2. Для участия в аукционе необходимо подать заявление. К заявлению прилагается заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % от начальной цены объекта, а также:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

3. Победитель аукциона обязан:

- подписать протокол аукциона в день его проведения;

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения аукциона, и формированием земельного участка в течение 10-ти рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка победителю аукциона;

- заключить с Оршанским горисполкомом договор аренды земельного участка и в двухмесячный срок после получения решения (выписки из решения) горисполкома о предоставлении ему земельного участка обратиться за государственной регистрацией этого земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него;

- занять земельный участок в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка и возникновения права

ДРУГІ 3D-КІНАТЭАТР АДКРЫЕЦЦА Ў МІНСКУ Ў КАНЦЫ ГОДА

Аб гэтым паведаміў генеральны дырэктар УП «Кінавідэапракат» Васіль Коктыш, перадае БЕЛТА.

Другая лічбавая кіназала для паказу трохмернага кіно будзе адкрыта ў сталічным «Салюце». Раней гэты кінатэатр капітальна адрамантавалі, засталося толькі прывезці кіназалу ў адпаведнасць з патрабаваннямі лічбавага абсталявання. «Плануецца адкрыць «Салют» у IV квартале, хутчэй за ўсё, гэта адбудзецца ў кастрычніку—лістападзе», — сказаў Васіль Коктыш.

У Мінску дзейнічае 14 кінатэатраў. У мінулым годзе іх наведалі крыху больш за 3,7 млн гледачоў — на 320 тыс. больш, чым год таму. За студзень—люты гэтага года ў кіно схадзілі 1,1 млн чалавек — на 250 тыс. больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ за 2009 год

ОАО «БРЕСТСКИЙ ЭЛЕКТРОМЕХАНИЧЕСКИЙ ЗАВОД»

Полное наименование эмитента: **Открытое акционерное общество «Брестский электромеханический завод».**
Учетный номер плательщика: **200032892.**
Адрес: **224020, г. Брест, улица Московская, 202, телефон/факс: (8 0162) 42 73 89.**
Директор: **Разумец Сергей Леонидович.** Главный бухгалтер: **Баган Нина Андреевна.**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2010 г.

Единица измерения: млн. руб.

АКТИВ	Код строки	На начало отчетного периода	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	**110**	**41156**	**39863**
Нематериальные активы	**120**	**220**	**306**
Доходные вложения в материальные ценности	**130**	**2847**	**1826**
Вложения во внеоборотные активы	140	717	504
в том числе:незавершенное строительство	141	157	164
Прочие внеоборотные активы	150	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**44940**	**42499**
Запасы и затраты	**210**	**15844**	**21069**
В том числе:			
Сырье, материалы и другие активы	211	5179	3711
Незавершенное производство и полуфабрикаты	213	1153	1202
Расходы на реализацию	214	28	23
Готовая продукция и товары для реализации	215	5844	8145
Товары отгруженные	216	3418	7401
Расходы будущих периодов	218	222	587
Прочие запасы и затраты	219	-	-
Налоги по приобретенным активам	220	709	411
Дебиторская задолженность	**240**	**314**	**1339**
В том числе:			
Покупателей и заказчиков	241	38	46
Поставщиков и подрядчиков	242	155	1106
По налогам и сборам	243	22	77
По расчетам с персоналом	244	22	8
Разных дебиторов	245	77	102
Прочая дебиторская задолженность	249	-	-
Расчеты с учредителями	**250**	**18**	**59**
В том числе:			
По вкладам в уставный фонд	251	-	-
Прочие	252	18	59
Денежные средства	260	774	474
В том числе:			
Денежные средства на депозитных счетах	261	-	-
Финансовые вложения	270	25	25
Прочие оборотные активы	280	259	191
ИТОГО по разделу II	**290**	**17943**	**23568**
БАЛАНС	**300**	**62883**	**66067**

ПАССИВ	Код строки	На начало отчетного периода	На конец отчетного периода
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	8671	8671
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	-	-
Резервный фонд	**420**	**56**	**113**
В том числе:			
резервы, созданные в соответствии с законодательством	421	56	113
резервы, созданные в соответствии с учредительными документами	422	-	-
Добавочный фонд	430	39303	37176
Прибыль(убыток) отчетного периода	440	-	-
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	-265	659
Целевое финансирование	460	-	-
Доходы будущих периодов	470	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**47765**	**46619**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	713	171
Прочие долгосрочные обязательства	520	-	-
ИТОГО по разделу IV	590	713	171
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	4515	701
Кредиторская задолженность	**620**	**9746**	**18465**
В том числе:			
Перед поставщиками и подрядчиками	621	8220	17204
Перед покупателями и заказчиками	622	628	162
По расчетам с персоналом по оплате труда	623	408	522
По прочим расчетам с персоналом	624	-	-
По налогам и сборам	625	217	185
По социальному страхованию и обеспечению	626	129	165
По лизинговым платежам	627	127	175
Перед прочими кредиторами	628	17	52
Задолженность перед учредителями	630	104	83
В том числе:			
По выплате доходов дивидендов	631	2	4
прочая	632	102	79
Резервы предстоящих расходов	640	-	-
Прочие виды обязательств	650	40	28
ИТОГО по разделу V	**690**	**14405**	**19277**
БАЛАНС	**700**	**62883**	**66067**
Из строки 620			
Долгосрочная кредиторская задолженность	701	7	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	702	9612	18290

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Единица измерения: млн. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. Доходы и расходы по видам деятельности			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ и услуг	010	117291	60642
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	18757	10238
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010–020)	020	98534	50404
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ и услуг	030	92749	48866
Расходы на реализацию	060	244	162
Прибыль (убыток) от реализации (020-030-040-050)	**070**	**5541**	**1376**
II. Операционные доходы и расходы			
Операционные доходы	080	1694	3087
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081	232	206
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	090	1462	2881
В том числе:			
Доходы от операций с активами	093	260	2218
Прочие операционные доходы	099	1202	663
Операционные расходы	100	634	1638
В том числе:			
Расходы от операций с активами	102	322	1495
Прочие операционные расходы	109	312	143
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (080-090+/-100+/-110)	**120**	**828**	**1243**
III. Внереализационные доходы и расходы			
Внереализационные доходы	130	1198	1431
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	-	-
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	140	1198	1431
Внереализационные расходы	150	5406	1836
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	**160**	**-4208**	**-405**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (070+120+160)	**200**	**2161**	**2214**
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	299	1613
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220	231	747
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (200+210-220)	**240**	**2229**	**3080**
Налог на прибыль	250	-	683
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	535	311
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	398	193
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)(200-250-260-270)	**300**	**1228**	**1027**

Данные отчетности подтверждены: (наименование и номер лицензии аудиторской проверки или наименование контролирующего органа, проводящего проверку) **Аудиторское ОДО «Фораудит» лицензия № 02200/0495485, действительна до 25.02.2014 г. выдана Министерством финансов Республики Беларусь.**

Количество акционеров	Всего	1604	Юридических лиц	1	Физических лиц	1603

Информация о дивидендах и акциях

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	Миллионов рублей	**81**	**104**
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию, включая налоги	Рублей	**47**	**60**
Обеспеченность акции имуществом Общества	Тыс. рублей	**26,881**	**27,182**
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	штук	**-**	**-**

Информация о задолженности

Просроченная дебиторская задолженность	Миллионов рублей	**3530**	**1397**
Просроченная кредиторская задолженность	Миллионов рублей	**1143**	**1828**
Среднесписочная численность работающих человек			**747**
Основные виды продукции	**Сельскохозяйственная техника**		
	Счетчики учета электрической энергии		

Директор **С.Л. Разумец**
Главный бухгалтер **Н.А. Баган**

ВЯСНА ІДЗЕ, ВЯСНЕ — МАШЫНУ!

ХОЦЬ каляндарная вясна пакуль і не радуе нас цёплымі дзянькамі, рэшткі снегу вось-вось растануць і дарогі пазбавяцца солі і слязгаты, якая ўжо надакучыла. Многія аўтааматары ведаюць, што сваіх жалезных коней трэба рыхтаваць да эксплуатацыі зімой. А вось пра вывад аўто са стану «зімовай спячкі» клапоцяцца нямногія. І дарэмна, лічаць спецыялісты.

Чаму неабходна правесці падрыхтоўку аўтамабіля да вясны?

РУХАВІК

З надыходам цяпла ўважлівы візуальны агляд рухавіка абавязковы ў сувязі з тым, што 110-градусныя перапады тэмператур (ад -20 у ранішнія гадзіны да +90 у працоўным рэжыме) прыводзяць да зносу эластычных элементаў рухавіка. Пластыкавыя і гумовыя дэталі губляюць свае ўласцівасці: гума сохне і трэскаецца, пластык лопаецца. Усё гэта прыводзіць да страты герметычнасці, а, такім чынам, тэхнічныя вадкасці (масла, антыфрыз) могуць падцякаць. Спраўны матор павінен быць сухі, інакш гэта пагражае яго паломкай.

ВАДКАСЦІ

Незалежна ад сезонаў неабходна рэгулярна (не радзей за адзін раз у месяц) правяраць узровень усіх вадкасцяў: масла ў маторы, каробцы перадач, рулявой рэйцы, тармазной вадкасці, антыфрызу.

АКУМУЛЯТАР

Бывае, што акумулятару не хапае моцы ў добры мароз, каб запусціць рухавік. А што з ім можа стацца летам? Рэч у тым, што летам акумулятару хопіць і 60 працэнтаў зараду, каб аўто завялося. Аднак такі яго стан прыводзіць да хуткага выхаду са строю. Таму акумулятар трэба зарадзіць поўнасцю. Пры неабходнасці даліць дыстыляванай вады.

ПАЛІВА

Узімку айчыннае паліва адрозніваецца яшчэ большай забруджанасцю, чым у летні перыяд: разам з адталай вадой у бак з палівам трапляе шмат бруду. Правільна было б кожную вясну прамываць паліўны бак аўтамабіля і ўвесь паліваправод. І, безумоўна, неабходна памяняць паліўны фільтр.

ПАДВЕСКА

У план падрыхтоўкі аўтамабіля да вяснова-летняга сезона дыягностыка хадавой часткі павінна быць уключана абавязкова. Перапад тэмператур, ядза па лёдзе, снезе і лужынах адначасова прыводзіць да таго, што пылавікі на вузлах падвескі лопаюцца, з-за чаго вузел губляе змазку і хутка выходзіць са строю. Каб пазбегнуць рамонту, звязанага з заменай вузла, трэба праверыць усе пылавікі і замяніць пашкоджаныя.

Тая ж сітуацыя адбываецца з тармазнымі шлангамі. Калі пашкоджаны тармазны шланг своечасова не замяніць, гэта можа стаць чыннікам трагедыі.

СХОД-РАЗВАЛ

Часта кіроўцы незаслужана лаюць шыны за тое, што яны «гойсаюць», дрэнна «трымаюць» дарогу, становяцца чыннікам дрэннай кіравальнасці аўтамабіля. Часам гэтыя сімптомы сведчаць не пра дрэнную якасць пакрышак, а пра тое, што парушаны рэгулёўкі «сход-развалу». Нярэдка рэгулёўкі збіваюцца з-за цвёрдых кантактаў колаў з дарожнымі перашкодамі, але бывае, што з-за асаблівасцяў шын, якія былі пастаўлены, неабходна правесці рэгулёўку падвескі. Калі ўсё стане на свае месцы, акажацца, што прэтэнзіі да шын былі дарэмнымі.

КАНДЫЦЫЯНЕР

Кандыцыянеры, усталяваныя ў аўтамабілях, таксама патрабуюць сезоннага абслугоўвання. Як правіла, яно складаецца з замены фільтраў, запраўкі і рэгулёўкі кандыцыянера. Калі вы не хочаце застацца ў трыццаціградусную спякоту без ахаладжэння, рэкамендуем правесці гэтыя працэдуры.

У ВЫНІКУ

Чым уважлівей мы ставімся да аўтамабіля, тым ён даўжэй нам служыць, тым больш мы ўпэўненыя ў сваім аўто. Магчыма, спіс неабходных працэдур для падрыхтоўкі аўтамабіля да вяснова-летняга сезона з першага погляду здасца залішне доўгім, але, з іншага боку, упэўненасць і бяспека каштуюць значна больш.

Да ведама

РЭГІСТРАЦЫЯ АЎТО НА ТЭРЫТОРЫІ ВЦ «АКВАБЕЛ» БУДЗЕ СПЫНЕНА

У філіяле міжраённага рэгістрацыйнага аддзела ДАІ ў мястэчку Баравая, 1 (ВЦ «Аквабел») з 11 сакавіка спынена рэгістрацыя транспартных сродкаў, паведамляе **БЕЛТА**.

Па тэхнічных прычынах з 11 сакавіка транспартныя сродкі рэгіструюцца ў адпаведных пунктах на вуліцы Ціміразева, 114 (ТД «Ждановічы») і вул. Сярова, 1 (ААТ «АВТОВАЗ»). У філіяле міжраённага рэгістрацыйнага аддзела ДАІ ў мястэчку Баравая, 1 (ВЦ «Аквабел») будзе ажыццяўляцца толькі здыманне з уліку транспартных сродкаў. Юрыдычным асобам, як і раней, трэба звяртацца ва ўпраўленне ДАІ на праспекце Дзяржынскага, 3.

За мяжой

ЗНАКІ «АСЦЯРОЖНА, П'ЯНЫ ПЕШАХОД» З'ЯВІЛІСЯ Ў РУМЫНІІ

Цвярозыя аўтамабілісты — яшчэ не 100-працэнтная гарантыя бяспекі на дарогах. Часам пешаход нападпітку можа таксама стаць вінаватым у сур'ёзнай аварыі. Прыняўшы гэта да ўвагі, румынская аўтаінспекцыя ўвяла новы знак, які папярэджвае пра п'яных пешаходаў, перадаюць брытанскія СМІ.

Новыя знакі ў выглядзе ярка-памаранцавага трыкутніка з надпісам «Асцярожна, п'яныя» з'явіліся на ўзбочынах пасёлка Пекіка, што за 20 кіламетраў ад заходняй мяжы Румыніі з Венгрыяй. Знакі, на якіх намаляваны чалавек на карачках з бутэлькай у руцэ, усталяваны паблізу рэстаранаў і бараў і ўжо сталі мясцовай выбітнасцю.

У ІТАЛІІ ХОЧУЦЬ УКАРАНІЦЬ РОЗНАКАЛЯРОВЫЯ ДАРОГІ, ДЗЯКУЮЧЫ ЯКІМ ЯМЫ СТАНУЦЬ БОЛЬШ ПРЫКМЕТНЫМІ

Двое маладых італьянскіх энтузіястаў, студэнты Даменіка Дыега і Крысціна Кардзіні прапанавалі ўраду Італіі цікавы эксперымент: пры ўкладцы асфальту ўкатваць яшчэ адзін пласт яркага колеру.

Цямлівыя маладыя людзі пабудавалі сваю ідэю на прыкладзе чалавечага цела: калі ў чалавека ўтворыцца рана, гэта адразу становіцца прыкметна, бо параненае месца запаляецца і становіцца чырвоным. Сапраўды такі прынцып можна ўжыць і пры ўкладцы дарог. Чаму б не ўкладваць дадатковы яркі пласт дарогі, перад тым як укатваць асфальт? Бо потым, калі асфальтавае пакрыццё пашкодзіцца, кіроўцам будзе лягчэй заўважыць выбоіну і аб'ехаць яе, кажуць аўтары праекта. Акрамя кіроўцаў, якім гэты метад сапраўды дапаможа ўсцерагчы свае аўто ад непрыемнасцяў, гэтым змогуць карыстацца і дарожныя службы, якія будуць хутчэй дыягнаставаць праблемныя ўчасткі, заўважае Car. Тэхналогію могуць апрабаваць ужо сёлета. Калі яна сапраўды зможа дапамагчы вырашыць праблемы выбоін на дарогах, то падобную тэхналогію змогуць выкарыстоўваць і іншыя краіны свету.

Інфарм-укол

Антыбіётыкі: супраць якой ангіны?

Ангіну — запаленне паднябенных міндалінаў — могуць выклікаць вірусы і бактэрыі. Адбываецца гэта пры зніжэнні імунітэту, напрыклад, пасля перааахаладжэння.

Паводле слоў урача-кардыёлага 2-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Галіны БАНДАЖЭЎСКАЙ, аглядаць горла без ліхтарыка абсалютна бессэнсоўна, таму часта дыягназ ангіны не ставіцца, і дзіця лечаць не ад таго, чым яно хварэе. У дзяцей да года часцей сустракаецца ангіна вірусная, пры якой малому неабходныя толькі агульныя абмежаванні (не купаць, не гуляць), апрацоўка зеву і полівітаміны. Бактэрыяльную ж ангіну выклікаюць мікробы. Праяўляецца апошняя высокай тэмпературай, налётам на міндалінах, павелічэннем шыйных лімфавузлоў. Пры гэтым кашаль, насмарк і іншыя сімптомы вострага рэспіраторнага захворвання адсутнічаюць. Такая ангіна можа прывесці да ўскладненняў — гламеруланефрыту, рэўматызму, рэўматоіднага артрыту. Таму для лячэння (на працягу 5-10 дзён) выкарыстоўваюцца антыбіётыкі.

Каб высветліць, якім мікробам выклікана ангіна, важна здаць пасеў на флору з міндалін. Калі бактэрыяльную ангіну не лячыць, высокая верагоднасць узнікнення хранічнага танзіліту. Такі ачаг інфекцыі прыводзіць да зніжэння абарончых сілаў арганізма. Пры самым малым ахаладжэнні дзіця зноў і зноў будзе хварэць на ангіну. Для папярэджвання ангіны важна:

— санацыя хранічнай інфекцыі (карыёзныя зубы, хранічны танзіліт, гнойнае пашкоджанне каляснасавых пазух і г.д.);

— забеспячэнне свабоднага насавога дыхання;

— рэжым дня;

— загартоўванне арганізма;

— адсутнасць пылу і тытунёвага дыму.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Простая мова

ДЗВЕ ЛЮБОВІ

СПАЧАТКУ было... свята, з найвялікшай раскошай — цёплых усмешак, доўгіх шчырых размоў...
Падчас якіх, зразумела ж, нешта елася (і пілося), што засведчылі потым здымкі, да якіх міжволі склалася:
Я ж ці бачыла ў сне —
Ананасы на акне,
Мёд у рамцы на стале...
І найлепшыя мужчыны
Ходзяць выпіць да мяне.
Выпіць — як правіла — кавы альбо гарбаты (з мёдам!); найлепшыя мужчыны — сябры, якія ў той раз купілі ананас і ўдружылі са словамі: «Мы падумалі — кветкі ж не ядуць?..»
...Гэта, зазначым, раней не елі. Цяпер...
У марозным студзені цюльпан падарылі. Ахнула: «Божа, адкуль?!»
Высветлілася — з рынку. І бутон у ім з... шакаладу, ядомы!
Чаго не прыдумаеш, чаго не зробіш, каб здзівіць, каб парадаваць — тых, каго насамрэч любіш!

На сямі вятрах

Люты і сапраўды люты: вецер працінае да касцей, распранае. І — прыпынак у чыстым полі — затуліцца няма за што. Мне... Іншая рэч — двум двайняткам-хлапцам: аднаго матуля (а ўжо высокая, шырокая) прыхінула да правага сцягна, другога — да левага, ля галоў апусціла рукавы. І стаяць сабе ў зацішку, у цяпле, як двое куранятак.

...Мо такой вось — мажнай — і павінна быць мама?

Хочацца верыць

У Нічкі мабільнік няправільны — размаўляе з некім, а чутно ўсім... Прычым не толькі тое, што кажа яна (некаму), але і тое, што кажуць ёй. У тую хвілінку — словы віншаванняў і пажаданняў, каб здаровенькая была, каб шчаслівая, каб абавязкова і ў самы бліжэйшы час збыліся ўсе яе мары!

Нічка ўсміхаецца, дзякуе і, закончыўшы размову, цяжанька ўздыхае.

Ведаю, чаму. Жывучы ў свекрві, яна, безумоўна ж, марыць пра асобную кватэру. Але для таго, каб купіць яе альбо пабудаваць, трэба грошай, якіх у Нікі ніколі не было, няма і наўрад ці будзе.

Яшчэ яна марыць зацяжарацъ. І нарадзіць. Хлопчыка, дзяўчынку — без розніцы. Абы дзіця... Хай нават нездаровае (яна касцямі ляжа, — вылечыць)... Але з гэтым таксама праблемы і, лічы, невырашальныя.

Хоча яшчэ, каб не піў мужык, а ён...

Карацей, мары яе, а тым больш у хуткасці, наўрад ці збудуцца.

Але чуць пажаданні ўсё адно... прыемна.

Сардэчная

З вялікай (калісь...) сям'і іх засталося толькі двое — дзве сястры. Самая малодшая (яна ж багатая, бо здаровая, жыве ў сям'і) і самая старэйшая — бедная, бо муж і нават сяброўкі ўсе даўно паўміралі, дзяцей не было. Адна яна — дзень пры дні. Хіба суседзі зрэдчас зазірнуць. Ці малодшая сястра — на хвілінку, бо ў яе (дарэчы, наследніцы — на кватэру ў цэнтры Мінска, на дачу...) вечна клопат якісь — дзеці, унукі... А калі і не яны, то, кажа, там коцік адзін — сумуе!

— Каб ён здох... — не вытрымала неяк сястра старэйшая, ці не ў соты раз пачуўшы ад малодшай пра коціка.

Тая пакрыўдзілася, сказала:

— Какая же ты жестокая, какая бессердечная! Как ты можешь?!

...І часу няма паглядзецца ў люстэрка і спытаць у самой сябе: а як можаш ты?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Язва

Апошняй кропляй у чашы яго цярпення было паліто — скураное, з пясцовым каўняром.

Жонка нагледзела яго на рынку ў Ждановічах і як «захварэла» — «хачу і ўсё».

Муж ведаў ужо — нешта даводзіць, пярэчыць сэнсу цяпер няма, трэба, як некалі «партыя сказала «надо», — комсомол ответил «есть»!». І... пайшоў зарабляць грошы. Там трыццаць баксаў, там пяцьдзясят, там сто...

Аддаючы іх, апошнія, што патрэбны былі на тую пакупку, ён даведаўся, што першых... ужо няма — жонка даўно патраціла. Прычым, ён жа, муж, быў у тым вінаваты, бо няўдачнік, бо не можа, як іншыя, зарабляць і забяспечваць, а калі так, то не трэба было і жаніцца...

Слухаць гэта ўсё было вельмі крыўдна, але ў той раз ён не адступіўся яшчэ, рашыў па новай пачаць: шабашыць, як і раней, але грошы (гэтыя, левыя) жонцы не аддаваць. Прынамсі, па частках. Вось збярэцца патрэбная сума, тады ў зубы ёй і хай едзе ў свае Ждановічы, хай купляе тое паліто...

Шабашыў (еў не еў, спаў не спаў...), але грошы такі сабраў — жонцы аддаў. Тая з сяброўкай паехала на рынак, каб... прывезці адна страўніку. Падаўся дамоў — у вёску, да старэнькай матулі, стаў паціху папраўляцца. А там і праца раптам знайшлася: новы беларус па суседстве ўзяўся дом будаваць, — яго прарабам узяў, плаціць стаў...

Што цікава, грошы на паліто (і нават не адно!) у мужыка ўжо ёсць. Аднак купляць яго жонцы, хоць забі, не хочацца.

Што за карысць з вачэй?

...Які гэта цуд — пісанне, сам працэс яго! Літарка да літаркі і, бач, атрымалася слоўка (за ім — нейкі вобраз, з'ява, паняцце)... Слоўка да слоўка — думка, праблема, малюнак, пытанне...

Янка Брыль з падарожжаў: «Што за карысць з вачэй, калі ў іх няма дабрыні?»

Аляксей Карпюк: «Якія файныя і вялікія, бы ў царкве, — бурчыць у бараду дзядзька, разглядаючы дзверы ў недабудаваным вакзале. — Во, а шыльдачку на іх ужо павесілі: «Уваход забаронены». Дык нашто ж было гэтыя дзверы ўстаўляць, калі хадзіць цераз іх нельга?».

Што за карысць з вачэй?...

Што за карысць з дзвярэй?..

Пытанні, якія даймалі і будуць даймаць найлепшыя розумы.

Дзве любові

У Піліпаўны дзяцей, кажа, троечка — два сыны і дачка. Як ні цяжка было, вырасцілі з нябожчыкам мужам, дагледзелі, у людзі вывелі... Дзе яны і засталіся — свае жыцці ў іх, свае сем'і. Матуля — адна. Можа не можа — устае, пыніць гаспадарку з трох катоў, трох курэй, певуна і сабакі, варыць есці.

Дзеці бываюць, але зрэдку, бо далекавата і дорага. Тэлефануюць — часцей. А ўжо ў свята — сам Бог загадаў.

— Малодшы першым пазваніў, я спала яшчэ, — скардзіцца (а хутчэй ганарыцца) бабуля. — Крычыць мне: «Мамачка, віншую! І каб ты ведала: я цябе вельмі-вельмі люблю!.. Тысячу разоў цалую!»

...І немагчыма (нават уявіць!), што было б, каб некалі маці яму, такому ж бездапаможнаму, сказала, што вельмі і вельмі любіць (каб ведаў...), пацалавала («тысячу разоў») і пры гэтым не пайшла варыць кашу, мыць, шыць, прыбіраць, прасаваць, зарабляць грошы.

На яго ж, пераважна, патрэбы.

Смех без прычыны...

Сталіца. Гастраном. Спіртное — адразу на ўваходзе. Што падаецца разумным, бо пры іншым раскладзе адпаведны кантынгент сноўдаў бы паміж паліц з таварамі, распуджваў пакупнікоў — адным сваім выглядам.

Хлопец вось... Гадоў 30, не больш, а ўжо аніякі: вочы асалавелыя, твар бура-сіні, адзенне наросхрыст. Але ж ідзе (хоць улукатку) — да любімай касы, да чаргі, да сяброў.

— Слухай, ты... зашпіліся... А то ходзіш... — камандуе хтось адтуль, густа сыплючы мацюкамі.

Хлопец хапаецца рукой за клыны, відаць, каманду яшчэ разумее і досыць гучна выдае:

— А ў хаце пакойніка дзверы не зачыняюцца!

Чарга да касы (у віна-гарэлачным...) качаецца ад рогату, у іншых аддзелах чамусьці не.

Хоць бы плацілі...

Дробязь, а прыемна: нехта на працу толькі ідзе, а Іванаўна ці не ўсё парабіла: кантэйнер са смеццем выкаціла, снег расчысціла, лесвіцу (дзевяць паверхаў!) памыла, застаўся калідор, на першым, дзе нейкі сабака (не хочацца ж думаць, што чалавек) зноў нацурболіў лужыну. Жанчына (у вялікіх гумовых пальчатках) пакорліва мые.

— І хоць бы плацілі! — заводзіцца з паўабароту, — а то гэтулькі снегу пералапацілі, гэтулькі бруду вынеслі і што? За студзень — чатырыста тысяч. Не, з мяне хопіць, трэба ўцякаць.

Язык не павяртаецца сказаць ёй: «Не трэба...». Хоць і карціць, бо пры ёй у пад'ездзе, ля дома хоць адносная ды была чысціня.

Што будзе, калі яна сыдзе?

Тыдзень-два-тры бруду — пакуль знойдзецца нехта новы.

Калі знойдзецца.

Марыць не шкодна?

...Горад (і, здаецца, з год ужо) завешаны плакатамі: «Беларускае — самае маё!».

Што, напэўна, добра? Бо калі паўтараць гэта на ўсіх скрыжаваннях і з ранку да вечара, то нейкая частка людства можа ўзяць за правіла і купляць пераважна сваё, айчыннае.

А потым (марыць не шкодна) можа зразумее, што «самае тваё» гэта не толькі айчынны хлеб і малако, не толькі абуткі-адзеткі ды халадзільнікі з тэлевізарамі... Самае тваё — мова...

Чужы

Раніца, свежая прэса, але чытаць яе буду потым, зараз — хіба паглядзець, выхапіць вокам навіны, што-кольвечы з драбязы.

Сярод яе — кароткая нататка пра маладога чалавека, што загінуў на працы. Страшна. Не толькі таму, што загінуў (нейчы, мо, адзіны сын, муж, брат... Без вайны)...

Страшна, што змешчана гэта інфармацыя пад рубрыкай «Здарэнні».

Не ён першы, чытай, не ён (свят-свят-свят!) апошні.

Бо чужы.

«Каб не мама...»

Нехта з гумарыстаў самыя вабныя ножкі знайшоў, змераў іх і ўслых абвясціў: даўжыня 2 метры 20 сантыметраў! Чым, безумоўна ж, уразіў. Пераважна — мужчын. А жанчын — засмуціў... БЫ, пасеяў БЫ зайздрасць, калі б тут жа не дадаў, што левая з тых ног на 15 сантыметраў даўжэйшая. Чым правая.

Вам смешна?

Тарасаўне — не, бо прыкладна з такімі нагамі (у сэнсе не роўнымі — па даўжыні) яна жыве, прычым з самага маленства.

Што не перашкодзіла ёй досыць добра закончыць школу, атрымаць спецыяльнасць, выйсці замуж, нарадзіць дачку. Потым, на жаль, развесціся (бо гарэлку мужык любіў больш), разысціся, як кажуць, з канцамі: ты нас не ведаеш, мы таксама — ні цябе, ні тваіх аліментаў...

З форсам кабета, хоць і вечна без грошай: як вол працавала, каб падняць дачку, каб не горш апрануць, каб вывучыць. Думала, вось вырасце, вось пойдзе на свой хлеб...

А дачка замест гэтага — замуж. І, лічы, тут жа ў дэкрэт.

Ды каб раз!.. А то следам яшчэ і нават яшчэ, бо з трыма малымі ўжо льготы — на будаўніцтва жылля. І праз год ці другі...

Праз год ці другі Тарасаўне і насамрэч будзе лягчэй (бо павінна ж... Хоць некалі...). Прыкульгаўшы з працы дамоў, у кватэрку жылплошчай у 25 квадратаў (дзе цяпер жыве шэсць чалавек), яна, прынамсі, хоць адпачне. А цяпер...

— Каб не мама, далі бог бы прапала! — дзеліцца жанчына.

— ?!

— Яна чацвярых нас адна падымала. Бацька інвалідам з вайны вярнуўся, праз дзесяць гадоў памёр. А яна цягнула — у вёсцы. То я гляджу на сябе ды і думаю — кватэра, хоць маленькая, але свая, з выгодамі, дроў не трэба, страха не цячэ. Дзеці здаровыя, харошыя, зяць, дзякуй Богу, шануе... Дык я ж жыву яшчэ! Як сыр у масле качаюся!.. У параўнанні з мамай.

...У мамы была вайна.

Не для таго?

...«Ну, і які дзянёк нам божухна даў?» — шторанак сама ў сябе пытала знаёмая бабуля і пацяхеньку тэпала да акенца, каб убачыць, што там...

Мінулы панядзелак ёй, дакладна, спадабаўся б — сонейкам, здаровым марозікам, тартамі і кветкамі, якія (8 Сакавіка) неслі жанчынам...

Кажуць, у соты раз пасля таго, як свята гэтае на свет з'явілася. І, што, магчыма, цікава, у краінах, дзе жанчынам жылося прасцей і лягчэй, не прыжылося, дзе цяжэй (у Манголіі, В'етнаме, Паўднёвай Карэі, Буркіна-Фасо...) — па-ранейшаму святкуецца...

Не для таго ж (свят-свят-свят), каб адзін раз на год зняць капелюшы, уручыць падарункі і кветкі і забыцца на нас.

Да наступнага Восьмага.

Валянціна ДОЎНАР.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 14 апреля 2010 года повторно проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Белаттракцион» (продавец)

На аукционные торги выставляются:

Номер лота	№ 1	№ 2	№ 4
Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота	- здание административно-хозяйственное, инв. номер 500/С-48231, площадь 69,6 кв.м; - здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. номер 500/С-48232, площадь – 67,0 кв. м; - ограждение металлическое, протяженность – 470 м; - асфальтобетонное покрытие, площадь – 29,6 кв.м	- здание специализированное иного назначения (павильон), инв. номер 500/С-48537, площадь – 59,3 кв.м.	- здание административное инв. номер 400/С-2446, площадь – 178,7 кв.м
Местонахождение имущества	г. Минск, ул. Ташкентская, д. 25	г. Минск, ул. Фрунзе, д. 2	г. Гродно, ул. Виленская, д. 20
Сведения о земельном участке	площадь – 0,0090 га, кадастровый номер 500000000002006760; назначение – эксплуатация и обслуживание здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; площадь – 0,0074 га, кадастровый номер 500000000002006759, назначение – эксплуатация и обслуживание административно-хозяйственного здания.	площадь – 0,0106 га, кадастровый номер 500000000001004775, назначение – эксплуатация и обслуживание здания специализированного иного назначения (павильон)	площадь – 0,0350 га, кадастровый номер 440100000002003160, назначение – обслуживание административного здания
Начальная цена без учета НДС	68 009 892 белорусских рубля	44 271 615 белорусских рублей	78 222 240 белорусских рублей
Сумма задатка	6 000 000 белорусских рублей	4 000 000 белорусских рублей	7 000 000 белорусских рублей

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуаль

Занатоўкі мастака



Мама і печаныя яблыкі

Мама адсвяткавала свой семдзясят шосты год жыцця. Пілося шампанскае. Я еў смажаную курыцу. Мама ўгаворвала мяне з'есці печаны яблык. Адмовіўся. У дзяцінстве я любіў печаныя ў духоўцы яблыкі, а цяпер не люблю. Мама забываецца на маю цяперашнюю нелюбоў да печаных яблыкаў і прапаноўвала іх тры разы за вечар.

Генадзь і скула

Скула — мярзотная з'ява. Як скула сядзе, як пачне балець, як пачне торгаць, дык ты месца сабе не знаходзіш. А калі яна з'явіцца на дупе, дык і не сядзеш. У Генадзя скула выскачыла якраз на дупе, пад копчыкам. Тут не тое што не сесці, тут у прыбіральню не схадзіць. Давялося Генадзю ісці да хірурга. Той скулу разрэзаў, і разваліў ён скулу няўдала, ды так няўдала, што давялося яшчэ дзве аперацыі зрабіць. Хірург так моцна пашкодзіў сфіктар, што той зусім перастаў сціскацца. Гной плыў і плыў у Генадзя бесперапынна. Чалавек так змучыўся ад скулы і аперацый, што ўзяў вяроўку і задавіўся. Нават ад пераказу гэтай гісторыі мне горка.

Ядзя і фашыст

У Беларусі мала хто адрознівае фашыстаў ад нацыстаў. Ну не папулярныя ў нас творы розных нацыяналістаў, кшталту Эрнста Юнгера, з іх праблемамі вайны і рэвалюцыі, з іх недаверам да асветы, з іх бачаннем вялікай розніцы паміж фашыстамі і нацыстамі. Для татальнай большасці беларусаў усе нацысты і фашысты на адзін зненавідны твар. Пра гэты твар я згадаў сягоння, калі пачуў тупат дзіцячых ног у сябе над галавою. Туп-туп-туп з калідора на варэльню, туп-туп-туп з варэльні ў залу. Туп-туп-туп цэлы вечар дзяўчынка бегае ў суседскай кватэры. І мне згадаўся скандал, які ўшчала Ядзя, жонка акадэміка Івана Н. Ядзя лямантавала на ўвесь пад'езд, бо мой сын — пяцігадовы Мікалай — нібыта таптаўся па галаве акадэміка, які працаваў над раманам пра летуценніка. Удзельнік вайны з фашызмам, народны пісьменнік, ардэнаносец, акадэмік працаваў, а яму заміналі. Таму Ядзя, баронячы спакой свайго любага мужа, аблаяла мяне і маю жонку апошнімі словамі, а нашага сына абазвала фашыстам. Ну бегаў хлопчык па кватэры. Бегаў. Тупатаў. Дзіця, яно і павінна бегаць, павінна тупатаць, яно — жывое. Не! Усчаўся лямант, палілася лаянка, пасыпаліся праклёны і абразы. Калі дайшло да «фашыста», давялося казаць, што Ядзя не мае рацыі. А калі яшчэ раз яна напалохае крыкамі ды лаянкаю маё дзіця, атрымае жорсткі адлуп. І пляваць я хацеў на тое, што жанчына, і на тое, што выкладчыца гісторыі КПСС, і на акадэміка яе мне наплявать, бо дзіця палохаць нельга нікому. Праз пару тыдняў мы ўсе замірыліся, бо суседзі, бо не так і гучна тупатаў наш Мікалай, і не так і моцна той тупат замінаў акадэміку пісаць лірычную прозу пра летуценніка. І сягоння мяне тупат у кватэры наверсе парадаваў, бо ў пакоі, дзе нядаўна памёр сусед Валодзя, з'явілася дзіця, і яно рухавае і вясёлае. Дзяўчынцы тры гады, і яна, вядома ж, не адрознівае фашыстаў ад нацыстаў, як і татальная большасць беларусаў. Не адрозніваюць? Ну і хай сабе!

Жонка і ноч

Прачнуўся пасярод ночы, сеў на ложку і сяджу. Голы сяджу на ложку і думаю: ці запальваць святло, каб пачытаць, ці не запальваць. Жонка спіць. Калі ўключу лямпу, дык пабуджу жонку. Ці люблю я сваю жонку? Сяджу голы на ложку, сяджу ў цемры і пытаюся сам у сябе пра любоў да жонкі. Я яе люблю. Так я адказваю сам сабе і запальваю святло.

Гамэр і памяць

Георг Крыстоф Ліхтэнберг піша: «Арыстоцель заўважыў, што з усіх відаў аўтараў паэты любяць свае творы больш за ўсё». І сапраўды, яны ж свае творы нават вывучаюць на памяць. Прыклад са сляпым Гамэрам і ягонымі «Іліядай» ды «Адысеяй» уражвае. Ні літаратар Ліхтэнберг, ні філосаф Арыстоцель не маглі вывучыць свае творы на памяць, як гэта зрабіў легендарны паэт.

Вольга, Омфала і супакаенне

Яму было пад трыццаць, ёй — крыху за сорак. «Жанчына пасля трыццаці павінна аддавацца мужчыне, як Омфала!» — сказала Вольга, скідаючы чаравічкі. Ён нічога не ведаў пра Омфалу, таму моцна напружыўся. Вольга аддалася яму папросту. Ён, усё яшчэ напружаны, прыйшоў дахаты, знайшоў у кнізе руковацелую Омфалу, якая аддаецца загарэламу Гераклу, пераапранутаму ва ўсё жаночае, і супакоіўся. З Вольгаю ён больш не сустракаўся.

Васіль і продаж Радзімы

Мы сядзелі за сталом і пілі чачу. Мы глядзелі на Чорнае мора, на абхазскія горы і ваенную грузінскую дарогу. Мы пілі моцную чачу і разважалі пра блізкую вайну. «Хутка пачнецца вайна! Заяваць будуць усе супраць усіх!» — сказаў тады Васіль. «Заяваць будзе кожны за сваё!» — сказаў тады я захмялеламу сабутэльніку. «Валодзя, пісьменнік не павінен супрацоўнічаць са спецслужбамі. Яны прапануюць, а ты не пагаджайся...» — «Васіль, а чаму пісьменнік не павінен супрацоўнічаць са спецслужбамі?» — «Пісьменнік у спецслужбах заблытаецца. Ворагаў папрадае, за ворагамі папрадае сяброў, за сябрамі прадасць Радзіму... Здрадзіць усім, каму зможа. Пісаць кіне! Дакладна, такі пісьменнік кіне пісаць. Ён сам убачыць, што піша горш і горш, піша хлусню і паскудства, убачыць і кіне пісаць зусім...» Тады мы моцна панапіваліся чачы. Вайна пачалася. Васіля я не бачыў амаль дваццаць гадоў. Убачыліся мы выпадкова, гаварыць нам не было пра што, але я спытаў: «Васіль, чаму ты пісаць кінуў?» — «Перастала пісацца! Пісалася-пісалася, а потым скончыліся словы, я і кінуў пісаць!»

Ду Фу і пыл

«Пыл забыцця няхай мяне накрые...» Так напісаў Ду Фу. Лепей і не напішаш, лепей і не скажаш... «Пыл забыцця няхай мяне накрые».

Адам ГЛОБУС.

Футбол. Ліга чэмпіёнаў

Катком па аўтарытэтах

Самы прэстыжны клубны турнір Еўропы застаўся без сваіх найбольш тытулаваных удзельнікаў. Нельга сказаць, што ім не пашанцавала. «Мілан» і «Рэал» сустрэлі на сваёй дарозе годных супернікаў і вымушаныя былі саступіць, прапусціўшы наперад «МЮ» з «Лiёнам». Кампанію апошнім складуць футбалісты «Баварыі» і «Арсенала».

Сёлета фінал Лігі чэмпіёнаў пройдзе на мадрыдскім «Санцьягу Бернабеу». Не трэба казаць, якія планы з гэтай гульнёй звязвалі Кака, Раналду і астатнія зоркі «Рэала». Прайграўшы першы паядынак у Францыі з лікам 0:1, «каралеўскі клуб» ужо на шостай хвіліне другой гульні зраўняў агульны лік — вызначыўся ўсё той жа Крышціяну Раналду. Але, чым менш часу заставалася да фінальнага свістка, тым больш нервовым станавілася становішча на полі. Кожная памылка магла дорага абысціся кожнай з камандаў, што і пацвердзілася на 76-й хвіліне. Гол у адказ, які правёў П'яніч, дэмаралізаваў «Рэал». Далей ідзе «Лiён».

Звышвопытны «Мілан» на чале з маладым Леанарда і малады «МЮ» са звышвопытным Фергюсанам на трэнерскай лаўцы сышліся на самай першай стадыі плэй-оф. Камусьці трэба было саступіць, але ніхто не чакаў, што перавага англічан будзе настолькі вялікай. Італьянскую каманду хапіла толькі на адзін тайм першай гульні. Далей на полі быў толькі «МЮ». Пасля перамогі ў гасцях з лікам 3:2 «манкуніянцы» разгромілі «Мілан» на сваім полі з лікам 4:0. Дубль правёў Уэйн Руні, яшчэ па голе на рахунку Пака і Флэтчэра.

Цяжка нават сабе ўявіць, але Фларэнцыю, з яе сярэднямесячнай тэмпературай у сакавіку +19, засыпала снегам. Была нават верагоднасць адмены гульні мясцовых «фіялак» супраць «Баварыі». Падчас тэлевізійнага прагляду складвалася ўражанне, што на трыбунах ніяк не менш, чым тысяч восемдзясят (пры рэальных сарака) заўзятараў — такая гучная падтрымка была ў гаспадароў. І ніхто з гэтых прыхільнікаў на 54-й хвіліне, калі чарнагорац Явеціч зрабіў лік 2:0 на карысць фларэнційцаў, не мог нават уявіць, якія змены адбудуцца на табло літаральна праз 11 абаротаў секуднай стрэлкі. Тым больш што да гэтага «Фіярэнтына» валодала ініцыятывай і яе атакі выглядалі нашмат больш вострымі, чым спробы баварцаў. Але ў складзе немцаў ёсць два галандскія майстры — Ван Бомель і Рабен, якія сваімі выніковымі ўдарамі размежавалі яшчэ адзін гол Явеціча. 3:2 на карысць гаспадароў, 4:4 па суме двух паядынкаў, але далей ідзе «Баварыя», якая забіла на адзін «гасцявы» мяч больш.

Можна бясконца назіраць за тым, як гарыць агонь, цячэ вада і... футбалісты «Арсенала» «пад арэх» раскатваюць гасцей з «Порту». Хуткія «крайкі» лонданцаў Аршавін і Насры проста разрывалі абарону «Порту». Вялікая колькасць вострых момантаў вылілася хет-трыкам Нікласа Бэндтнэра, трыма галявымі перадачамі Аршавіна і «аргенціна-ямайскім» лікам 5:0.

Яўген ВАРАКСА.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

ІЛЬВАМ ВАРТА ПАПРАЦАВАЦЬ НАД УМАЦАВАННЕМ АЎТАРЫТЭТУ, А ШАЛЯМ НЕАБХОДНА ПРАЯВІЦЬ ДЫПЛАМАТЫЧНАСЦЬ

БАРАН. Пры ўмелым спалучэнні аптымізму і гнуткасці ў паводзінах вы зможаце ўмела і дзейсна прыцягнуць да сабе ўвагу навакольных. Працуйце — і ваш поспех забяспечыць вам годнае існаванне. Займіцеся набыццём прафесійных ведаў у вашай і ў сумежных абласцях. Яны могуць спатрэбіцца. Звярніце ўвагу на інтэлектуальную сферу дзейнасці — у ёй вас чакае поспех.

ЦЯЛЕЦ. Не імкніцеся вырашыць усе праблемы адразу — вы толькі змарнуеце свае сілы і будзеце дарма турбаваць навакольных, якіх можаце ўцягнуць у арбіту сваёй бурнай, але, на жаль, бескарыснай дзейнасці. Лепш дакладна расплануйце сваю дзейнасць, вызначце галоўнае і займіцеся толькі гэтым.

БЛІЗНЯТЫ. Можаце стаць выдатным арганізатарам святочных вечарынак. У панядзелак плануйце толькі рэальнае. У аўторак будзьце больш асцярожнымі на публічных выступах і памятайце, што сцісласць — сястра таленту. У канцы тыдня на працы могуць паўтарыцца падзеі канца мінулага года. Калі палепшыце свой імідж, то можаце раптам выявіць у полі зроку прыемны аб'ект процілеглага полу.

РАК. Вы знаходзіцеся ва ўмовах у цэлым спрыяльных, хоць, магчыма, цяпер гэта і не адчуваецца. Працягваецца перыяд актыўнасці, які дазваляе раскрыць ваш дзелавы і творчы патэнцыял і рэалізаваць даўно задуманыя планы. Адзіным мінусам стане стан стомленасці, выкліканы гэтай самай павышанай актыўнасцю. Час багаты сустрэчамі і рознымі забаўляльнымі мерапрыемствамі. Паспрабуйце не даваць абяцанняў, бо іх выкананне будзе звязана з вялікімі цяжкасцямі. Часцей прыслухвайцеся да сваёй інтуіцыі — яна на гэтым тыдні ваш саюзнік.

ЛЕЎ. Час задумацца аб прафесійным росце і ўмацаванні ўласнага аўтарытэту. Непажадана адмаўляцца ад прапаноў чаму-небудзь навучыцца. Да непрыемнасцяў і непапраўных памылак вас з вялікай верагоднасцю могуць прывесці нядбайнасць і безуважлівасць. У аўторак верагодныя раптоўныя змены планаў. У чацвер і пятніцу кантралюйце свае эмоцыі, не праваkуйце канфліктныя сітуацыі.

ДЗЕВА. Будзе карысна супаставіць прычыны і вынікі вашых жыццёвых сітуацый. Не варта прымаць паспешлівых рашэнняў. У аўторак пачніце ўвасабляць у жыццё свае задумы: калі не выкарыстаеце гэты дзень на ўсе сто, то складана будзе нагнаць упушчанае. У пятніцу паспяшайцеся дадому і правядзіце вечар у спакойнай і камфортнай для вас абстаноўцы. Субота спрыяльная для творчасці і раскрыцця вашага патэнцыялу. У гэты дзень імкніцеся не крыўдзіцца, не засмучацца і прабачаць усіх. Спрыяльна заняцца ачышчэннем хаты: напрыклад, узяць свечку і абысці з ёй усю кватэру.

ШАЛІ. Тыдзень абяцае быць досыць актыўным і напружаным. Затое пры жаданні, калі правільна скарыстаеце акалічнасці, зможаце многага дасягнуць. Вам спатрэбяцца такія якасці як дыпламатычнасць і ўменне прадбачыць бліжэйшую будучыню. Аўторак — спрыяльны дзень для ўсяго новага. Спраўцеся з тым, што вам не падабаецца ў вашым характары, і вы ўбачыце, што вам стане лягчэй жыць.

СКАРПІЁН. Вам неабходна ўменне прымаць своечасовую дапамогу ад сяброў і калег. Бо немагчыма ўвесь час несці на сваіх плячах непасільную ношу. Калі вы хоць трохі навучыцеся давяраць блізкім людзям, то адчуеце проста неверагодную лёгкасць. Прыдуць і пачуцці абавязку паспрабуйце захаваць зароблены грошы на асабістыя патрэбы. Ваш велікадушны ўчынак па стаўленні да сяброў будзе ацэнены.

СТРАЛЕЦ. Вам, напэўна, захочацца навесці на працы парадак і прыгажосць: вось тут усе і зразумеюць, што вы — неардынарная асоба. Назапашаныя веды і вопыт будуць спрыяць умацаванню аўтарытэту, аднак не варта імі залішне бравіраваць. У вас з'явіцца шанц увасобіць у жыццё планы і задумы. У панядзелак не бярыцеся за справу, калі вы ў гэтай галіне не прафесіянал. У суботу ваша звычайная праніклівасць часова можа адмовіць. Вы, вядома, можаце цешыць сябе ілюзіямі, але сур'ёзных рашэнняў у гэты дзень лепш не прымаць.

КАЗЯРОГ. Спрыяльны час для сур'ёзных пачынанняў, толькі не аглядайцеся назад. Трэба будзе змагацца за сваю асабістую прастору, адстойваць свае мэты, будуць вельмі важныя вынікі. Каб паспяхова прасоўвацца наперад, вам спатрэбіцца звярнуцца да дапамогі інтуіцыі. Усе вашы ідэі — ад геніяльных да дзівацкіх — могуць ажыццявіцца толькі пры падтрымцы навакольных. Нават самыя экстравагантныя з іх знойдуць станоўчы водгук. У панядзелак не марнуйце сілы па дробязях, бо энергія можа вам спатрэбіцца ўжо ў аўторак — і для таго, у тым ліку, каб як след прыслухацца да самога сабе. Не прыспешваеце падзеі і не спяшаецеся ўвасабляць задуманае ў жыццё, не прадумаўшы дробязяў.

ВАДАЛЕЙ. Тыдзень абяцае выдатныя вынікі ў розных галінах жыцця. У панядзелак не варта праяўляць залішнюю актыўнасць і ініцыятыву ў дзелавой сферы, карысна ўсё прадумаць і не дзейнічаць без крайняй неабходнасці. У сераду рызыкніце пачаць новую справу, нават калі вы не зусім упэўненыя ў поспеху сваіх ідэй. Але варта толькі падзяліцца планамі з калегамі і блізкімі людзьмі, як вашы дзеянні сустрэнуць разуменне і падтрымку. У нядзелю бязлітасна вызваляйцеся ад старога і непатрэбнага, займіцеся стварэннем чаго-небудзь новага.

РЫБЫ. Не акцэнтуйце сваю ўвагу на дробязях, а засяродзьцеся на асноўным. Галоўнымі якасцямі будуць таварыскасць і лёгкасць на ўздым. Плануйце сустрэчы з сябрамі і знаёмымі, бо калі не зробіце гэтага, яны адбудуцца, але ў нязручны для вас момант. Паспрабуйце, нягледзячы на аптымістычны настрой, рэальна ацаніць свае сілы і не перагружаць сябе лішнімі клопатамі. Тыдзень удалы амаль ва ўсіх пачынаннях, варта толькі максімальна выкарыстаць спрыяльны час. Вашы ідэі шмат у чым паўплываюць на будучыя перспектывы.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ПЯЦЬ ХВІЛІН НА РОЗДУМ

Г. Брылевіч



Белыя: Крс6, Лh3, Лh4, Сb2, Сh7, Ке4, Кf4 (7). **Чорныя:** Крс4, Лe3, Се1, Cf1, пп. a2, c2, d2, g2 (8)

Мат за 2 хады.

Э. Палькоска



Белыя: Крh, Фg6, Ла5, Са7, Се6, пп. a6, b4, b6, e5 (9). **Чорныя:** Крс6, Лd2, Лf8, Cg2, Kb3, Kg8, п. g4 (7)

Мат за 3 хады.

Чакаем вашых адказаў.

ПРАВЕРЦЕ РАШЭННІ

Змяшчаем адказы на эцюды, апублікаваныя 2 сакавіка г.г.

В. Таку. I. 1.g7 Лg2 2. Крh6 Лg3 3. Лd3! Крс5 4. Лd2 Лg4 5. Крh7! Лh4+ 6. Крg6 Лg4+ 7. Крh6! Крс4 8. Лf2! Лg3 9. Л:f3 Л:f3 10. g8Ф і выйгрыш.

II. 7... Крс6 8. Лd4! Лg3 9. Крh7! Лh3+ 10. Крg6 Лg3+ 11. Крf7 f2 12. Лf4 і выйгрыш.

I. Моравец. 1. Крds! Крg2! 2. h4 Кр:f2 3. h5 Крg2 4. h6 f2 5. h7 f1 Ф 6. h8 Ф — нічыя.

ПАРТЫІ БЕЛАРУСКІХ МАЙСТРОЎ

Прыводзім дзве цікавыя шахматныя партыі беларускіх майстроў В. Дыдышкі і А. Ройзмана.

Г. Каспараў — А. Ройзман (1978 г.)

ІСПАНСКАЯ ПАРТЫЯ

1. e4 e5 2. Kf3 Кс6 3. Cb5 Kd4 4. K:d4 ed5 5. o-o Cc5 6. d3 c6 7. Cc4 d6 8. f4 Kf6 9. e5 de 10. C:f7+ Кр:f7 11. fe Фd5 12. ef g7 13. Kd2 Лg8 14. Ke4 Ce7 15. Cf4 Лg6 16. Фe2 Cg4 17. Фf2 Лag8 18. Лae1 h5 19. Cg5! Фd8 20. Фf4 Ce6 21. h4 Cd5 22. g4 Крg7 23. gh fg 24. Фe5+ Крh6 25. hg gh 26. Лf5 Кр:g6 27. Крh2 і чорныя здаліся.

В. Дыдышка — М. Шарашэўскі (1980 г.)

АБАРОНА ТАРАША

1. d4 d5 2. c4 e6 3. Kc3 c5 4. cd ed 5. Kf3 Кс6 6. g3 Kf6 7. Cg2 Ce7 8. o-o o-o 9. Cg5 cd 10. K:d4 h6 11. Ce3 Cg4 12. h3 Ce6 13. K:e6 fe 14. Фa4 Фa5? 15. Ф:a5 K:a5 16. Kb5 Cd8 17. C:a7 b6 18. Лfc1 Ke4 19. b4 Kb7 20. Лc6 Cf6 21. Лac1 K:f2 22. C:b6 Ke4 23. C:e4 de 24. Л1c2 Kd8 25. Лc7 Kf7 26. Л:f8+ Кр:f8 27. Ka7 Kd6 28. a4 і чорныя здаліся.

У гэтай партыі белыя і чорныя свядома ідуць на ўтварэнне ў сябе ізаляванай цэнтральнай пешкі. Гэта дае магчымасць хутка развіць свае сілы. Аднак такая пешка як і ў сярэдзіне гульні, так і ў канцы мае патрэбу ў абароне.

БЕЛАРУСАЧКА

Бяседныя песні

Каханне беларусаў — як беларуская прастора. Такое ж знешне ўраўнаважанае, затоена пяшчотнае, душэўна кранальнае, але ўнутрана напружанае, нават драматычна трывожнае. І разгортваецца яно пачуццёва — горда ў сціплым выяўленні, ахвярна, неспакойна-шчымліва...

А беларусачкі бы тыя кветачкі — першыя, вясновыя, што называем падснежнікамі. Ці гэта пралескі, што нясуць пасля зімовай скутасці імклівую радасць, афарбаваную ў сіне-ліловы колер?! Ці яны падобныя на сон-траву — пяшчотна-цёплую, пушыста-сарамлівую?! А мо паўстаюць беласнежнай ветраніцай, якая ўвесь час у руху, у суладнай размове з ветрам?

Рамантычна прывабны вобраз беларусачкі стварылі ў аднайменнай песні Алесь Ставер і Юрый Семяняка. Перадалі яе магічную прыцягальнасць, што ні ноччу, ні ўдзень не дае спакою каханку, яго пастаянныя мроі пра недасягальную Панну ў каляровым абрамленні вясновай квецені. Легендарныя «Песняры» з замілаваннем пранеслі гэты вакальны твор па ўсім Саюзе і за яго межамі ўзнёслым гімнам у гонар светланоснай асобы, імя якой — беларуска.

Беларусачка

Верш Алеся Ставера — ***Музыка Юрыя Семянякі***

Я гляджу на твае косы русыя —
Не магу наглядзецца ніяк,
Беларусачка, беларусачка,
Дарагая сяброўка мая.

У краях невядомых, нязведаных,
Буду ў радасці я ці ў журбе,
Беларусачка, беларусачка,
Не забуду ніколі цябе.

Я вярнуся к табе, сінявокая,
Калі ў кветкі адзенецца край.
Беларусачка, беларусачка,
Ты хоць зрэдку мяне ўспамінай.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

Открытое акционерное общество «СТРОЙТРЕСТ № 35»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за 2009 год

АКТИВ	На начало отчетного года млн. руб.	На конец отчетного года млн. руб.	ПАССИВ	На начало отчетного года млн. руб.	На конец отчетного года млн. руб.
I. Внеоборотные активы			**III. Капитал и резервы**		
Основные средства:			Уставный фонд	54	54
первоначальная стоимость	22 504	24 580	Резервный фонд	292	384
амортизация	9 694	10 905	Добавочный фонд	13 218	14 895
остаточная стоимость	12 810	13 675	Нераспределенная прибыль	937	1 149
Нематериальные активы остаточная стоимость	2	2	Целевое финансирование	2	-
Вложения во внеоборотные активы	18	205	**Итого по разделу III**	**14 503**	**16 482**
Итого по разделу I	**12 830**	**13 882**	**IV. Долгосрочные кредиты и займы**	**1 000**	**790**
II. Оборотные активы			**V. Краткосрочные обязательства**		
Запасы и затраты	6 448	8 283	Краткосрочные кредиты и займы	770	1 077
Налоги по приобретенным ценностям	65	56	Кредиторская задолженность	16 167	20 229
Дебиторская задолженность	12 085	16 199	Задолженность перед участниками (учредителями)	114	107
Денежные средства	1 126	265	Прочие краткосрочные обязательства	3 904	-
Прочие оборотные активы	3 904	-	**Итого по разделу V**	**20 955**	**21 413**
Итого по разделу II	**23 628**	**24 803**	**БАЛАНС**	**35 458**	**38 685**
БАЛАНС	**36 458**	**38 685**			

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период млн. руб.
1	2	3
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ		
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	83827
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	7490
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	76337
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	73102
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-040-050)	060	3235
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов	120	124
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов	160	-577
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (060+/-120+/-160)	200	2782
Налоги, сборы и платежи из прибыли	210	919
Прочие расходы и платежи из прибыли	220	24
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-210-220)	240	1839
Справочно (из строки 240): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль		193
Начислено на выплату дивидендов за 2009 год		107
Количество акционеров		357

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ

По мнению аудиторской организации ЧАУП «Аудит-финанс» бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Стройтрест № 35», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение ОАО «Стройтрест № 35» на 1 января 2010 года и результаты финансовой деятельности за 2009 год.

УНП 100289278

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

ОАО «Світанак» г. Жодино за 2009 год (млн руб)

Показатель	
1. Выручка от реализации (за минусом НДС и др. аналогичных обязательных платежей)	151794
2. Себестоимость реализованных товаров, работ, услуг	131936
3. Прибыль от реализации	19858
4. Сальдо операционных доходов и расходов	-29
5. Сальдо внереализационных доходов и расходов	-4855
6. Итого прибыль за отчетный период	14974
7. Налоги из прибыли и иные обязательные платежи	5451
8. Чистая прибыль	9523

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

ОАО «Світанак» г. Жодино на 01.01.2010 года (млн руб)

	АКТИВЫ	
1.	Внеоборотные активы, всего	67091
	в том числе:	
	1. Основные средства	64932
	2. Нематериальные активы	898
	3. Вложения во внеоборотные активы	1261
2.	Оборотные активы, всего	44980
	в том числе:	
	1. Запасы и затраты	39716
	2. Налоги по приобретенным ценностям	2420
	3. Дебиторская задолженность	1418
	4. Финансовые вложения	93
	5. Денежные средства	1332
	6. Прочие оборотные активы	1
	Итого активы	112071
	ПАССИВЫ	
3.	Капитал и резервы	93814
	в том числе:	
	1. Уставный фонд	80634
	2. Резервный фонд	831
	3. Добавочный фонд	2296
	4. Нераспределенная прибыль	10053
4.	Обязательства:	17961
	в том числе:	
	Кредиты банков	6398
	Кредиторская задолженность	11563
	Итого пассивы	112071

ИНФОРМАЦИЯ о дивидендах и акциях, количестве акционеров, задолженности по ОАО «Світанак» г. Жодино за 2009 год

Показатель	Ед. изм.	За 2009 год	За 2008 год
Количество акционеров, всего	лиц	9839	9860
в том числе: юридических лиц	лиц	6	6
в том числе: физических лиц	лиц	9833	9854
начислено на выплату дивидендов	млн руб.	587	473
Дивиденды, приходящиеся на 1 акцию (включая налоги)	руб.	742,54	598,33
Обеспеченность акции имуществом Общества	тыс. руб.	115,77	100,49
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	штук	0	0
Просроченная дебиторская задолженность	млн руб.	1512	667
Просроченная кредиторская задолженность	млн руб.	50	493
Среднесписочная численность работающих	чел.	2774	2794

УНН 600038919

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества

Лот № 1. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальные строения инв. №№ 430/С-18692, 430/С-25918, 430/С-25919, объекты озеленения (60 ед.), расположенные по адресу: Гродненская обл., Новогрудский р-н, 4, и право заключения договора аренды трех земельных участков с кадастровыми номерами 424300000001000047, 424300000001000049, 424300000001000050 общей площадью 0,4580 га сроком на 50 лет
Начальная цена предмета аукциона – 505 278 854 руб., сумма задатка – 50 527 000 руб.	
Продавец недвижимого имущества: Сельскохозяйственное республиканское дочернее унитарное предприятие «Свитязь» транспортного республиканского унитарного предприятия «Барановичское отделение Белорусской железной дороги», контактные телефоны: (8 01597) 7 65 00, (8 0163) 49 33 46	
Сведения об объектах недвижимости: инв. № 430/С-18692: здание специализированное для общественного питания 1968 г. общ. пл. 1500,3 кв. м, двухэтажное, кирпичное с бутобетонным подвалом, кирпичной террасой, сенями и дымовой трубой; водопроводная сеть 1970 г. протяженностью 53 м, канализационная сеть 1970 г. протяженностью 83,7 м с семью колодцами и двумя отстойниками, асфальтное покрытие 1983, 2007 г.г. пл. 323 кв. м, тротуарная плитка 1968 г. пл. 496 кв. м, бетонное покрытие 1968 г. пл. 387 кв. м; инв. № 430/С-25918: одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции 1968 г. общ. пл. 21,7 кв. м, линия электропередач 1970 г. протяженностью 56,5 кв. м; инв. № 430/С-25919: скважина артезианская 1970 г.; 60 деревьев	
Условия использования недвижимого имущества: ремонт фасада и благоустройство территории в течение трех лет с момента заключения договора купли-продажи и осуществление предпринимательской деятельности	
Условия использования земельного участка: осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении покупателю земельных участков государственной регистрации права на земельные участки; получение в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; **ограничения по использованию:** на земельном участке с кадастровым № 424300000001000047 – по перечню № 2 в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос на пл. 0,4475 га, по перечню № 5 в охранных зонах линий связи и радиофикации на пл. 0,0406 га	
Лот № 2. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, расположенное по адресу: г. Гродно, пер. Курчатова, Северный промузел, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 440100000002002590 площадью 5,2630 га сроком на 26 лет
Начальная цена предмета аукциона – 10 423 598 497 руб., сумма задатка – 1 042 359 000 руб.	
Продавец недвижимого имущества: Республиканское унитарное производственное предприятие «Гроднохлебпром», контактные телефоны: (8 0152) 74 44 70, 74 03 22	
Сведения об объектах недвижимости: Главный производственный корпус – общ. пл. 7000 кв. м, 1-4-этажный из сборного железобетона, фундаменты из сборного железобетона, отдельные участки из цельного железобетона; колонны железобетонные, плиты перекрытия – ПР, ПК; кровля – с применением утеплителя, полистирола покрытого стяжкой с армированием и двумя слоями мягкой кровли, шахты и колодцы под вентиляционные системы из сборного железобетона. **Административно-бытовой корпус** – примыкает к главному и вспомогательным корпусам, общ. пл. 1220 кв. м, фундаменты из сборного и цельного железобетона; смонтировано около 40 % каркаса АБК из сборного железобетона; колонны, ригеля, балки – железобетонные, плиты перекрытия – железобетонные. **Вспомогательный корпус** – примыкает к зданию АБК, 2-этажный, общ. пл. 2880 кв. м; выполнен монтаж нулевого цикла, фундаменты из сборного и цельного железобетона; выполнены работы по монтажу солерастворителя на отметке 3,4 м; стены и полы из цельного железобетона, обтянуты нержавеющей сталью; общий процент выполнения 3,7 %. **Котельная** – примыкает к главному корпусу, пл. 432 кв. м, возведен каркас, фундаменты – сборный и цельный железобетон; ригеля, колонны железобетонные, плиты перекрытия ПР; общий процент готовности 4,8 %. **Внеплощадочные сети** – выполнено 90 % работ (водопровод, хозфекальная и ливневая канализация), начат монтаж резервуаров технологического запаса воды емкостью 500 куб. м, используемый материал: стальные, чугунные и железобетонные трубы, колодцы и резервуары воды из сборного железобетона. **Ограждение** – территория строительной площадки обнесена железобетонным забором по всему периметру, ворота металлические; длина ограждения 660 м, высота 2 м. **Оборудование** – силоса А2-Х2-Е160А (20 смонтировано, 2 находятся на строительной площадке). Строительство объекта начато в 1993 г., строительно-монтажные работы не ведутся с января 2003 г. Общий процент готовности 27 %	
Условия использования недвижимого имущества: Размещение объекта пищевой промышленности. Срок реконструкции и ввода объектов в эксплуатацию в течение трех лет с момента заключения договора купли-продажи	
Условия использования земельного участка, ограничения по использованию: Разрешить победителю аукциона в установленном порядке использовать земельный участок в производственных целях для производства продуктов питания или их переработки. Осуществление в двухмесячный срок после принятия решения горисполкома о предоставлении победителю аукциона земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год. Осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	
Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул.17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82, www.region.by, www.gki.gov.by	

1. Аукцион состоится **19 апреля 2010 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (6 сакавіка). Па гарызанталі: Крагі. Шчасная. Абоз. Алюр. Сад. Скіт. Лімон. Віка. Ігліу. Лат. Шатэн. Станюта. Сын. Кок. Крап. Фара. Хабар. Скептык. Аза. Бруна. Кока. Матка. Камар. Гута. Трапак. Мова. Грунт. Дарафеева. **Па вертыкалі:** Белахвосцік. Хам. Экран. Фаза. Абат. Люстра. Каштан. Краты. Арба. Ідал. Танк. Грам. Бюст. Муму. Под. Штора. Трава. Дог. Сава. Кар. Лушчык. «Рэпка». Матыка. Том. Оптыка. Дэсантнік. Каралева.

Сканворд (10 сакавіка). Па гарызанталі: Бамбук. Шасцярня. Друз. Фрак. Пак. Барс. Піхта. Офіс. Елка. Мел. Сасна. Ніягара. Сад. Каа. Храм. Скат. Палка. Красала. Ула. Трыко. Тлен. Фанза. Трата. Хадж. Бровар. Рагу. Свааяк. Табакерка. **Па вертыкалі:** Лістоўніца. Пуф. Сіняк. Сала. Клан. Мастак. Замбія. Афера. Тата. Кедр. «Лада». Хлор. Рапс. Шыба. Ват. Штука. Драга. Кіл. Коржж. Руб. Пастух. Растр. Хустка. Ала. Амулет. Кананада. Анаконда.

Сканворд (11 сакавіка). Па гарызанталі: Ступа. Дворнік. Іржа. Зварка. Корда. Кус. Лямец. Пост. Еднасць. Ёга. Стаер. Сэнс. Рака. Бар. Фортка. Радары. Рак. Рэм. Карат. Лімон. Дом. Тайга. Блакада. Гад. Фара. Іран. Крытык. Багажнік. **Па вертыкалі:** Спідометр. Руль. Конік. Абарот. Рысь. Арэна. Прыезд. Крым. Вальс. Графік. Гіра. Дар. Румба. Раб. Важак. Барана. Акцёр. Кіл. Мора. Спас. Эстрада. Сон. Катод. Кліент. Смак. Мацярык.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.30	18.09	11.39
Віцебск —	6.20	17.58	11.38
Магілёў —	6.20	17.59	11.39
Гомель —	6.16	17.57	11.41
Гродна —	6.45	18.25	11.40
Брэст —	6.45	18.26	11.41

Месяц

Маладзік 15 сакавіка.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Марыны, Арсенія, Васіля, Івана, Мікалая, Несцера.*

К. *Бажэны, Хрысціны, Марка, Нікіфара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Усміхнемся!

Запіска на дзвярах участковага тэрапеўта:

«З 16 па 20 сакавіка прыёму не будзе! Усе сімптомы хвароб і спосабы іх лячэння ёсць у інтэрнэце».

☺

— Вовачка, паглядзі ў акно, ці вяртаецца тата з піўной?

— Так, ужо ідзе!

— Па якім баку вуліцы?

— Па абодвух!..

☺

Аб'ява:

«Прыходзьце да нас на суперэкстрэмальнае шоу — «Дзень адкрытых дзвярэй!»

Гарадскі заапарк».

☺

— Кажуць, што Пятровіча жонка да іншага сышла. Ты не ў курсе, ён моцна перажывае?

— Не тое слова. Другі тыдзень на працу не выходзіць. Забіў цвікамі ўваходныя дзверы: ці мала што, раптам жонка перадумае.

☺

Не злоўлены — не прызыўнік!

КУЛЯ — ДУРА, ШТЫК — МАЛАДЗЕЦ

ЯПОНСКІЯ майстры валодання штыком і кароткім мячом прыехалі ў Мінск, каб прадэманстраваць беларускім гледачам баявыя мастацтвы дзюкэнда (JUKENDO) і такэнда (TANKENDO). Свае паказальныя выступленні яны прадэманстравалі гледачам ва ўніверсітэце фізічнай культуры, у 125-й школе, а таксама ў Акадэміі МУС.

Дзюкэнда і такэнда былі створаныя ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя ў рамках спробаў мадэрнізаваць японскую армію. Першапачаткова за аснову была ўзятая французская сістэма штыкавога бою, а потым да яе былі далучаны элементы японскіх тэхнік працы з кап'ём. Такэнда фарміравалася ўжо пад уплывам вопыту Першай сусветнай вайны, калі штык (juken) часам прыходзілася выкарыстоўваць у дэманстраваным стане.

— Паколькі дзюкэнда займаліся ў японскай арміі, то некаторыя людзі сёння ставяцца да гэтага мастацтва крытычна, — кажа **майстар Канэсака Хіраміці, намеснік старшыні праўлення Усеяпонскай федэрацыі штыкавога бою**. — Але цяпер, можна сказаць, дзюкэнда паціху распаўсюджваецца. Калі параўнаць баявыя мастацтвы па папулярнасці, то, напэўна, на першым месцы будзе дзюдо, потым кэнда (фехтаванне), потым каратэ, ну а пасля ўжо — дзюкэнда.

Спадар Канэсака Хіраміці таксама вельмі задаволены, што Беларусь зацікавілася дзюкэнда:

— Мы хочам пачаць адсюль і развіваць далей. У дзюкэнда ёсць чорнае і белае кімано. Сёння я апрануў белае ў знак павагі да беларускага народа і Беларусі, — сказаў ён.

Дарэчы, спадар Канэсака Хіраміці на выступленні ва ўніверсітэце фізічнай культуры прызнаўся, што яму ўжо 80 гадоў. Але так і не скажаш — майстар дзюкэнда выглядае вельмі жвава і максімум гадоў на шэсцьдзясят.

Павел БЕРАСНЕЎ.

УПРАЎЛЯЮЩИЙ РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ БЕЛХЛЕБОПРОДУКТ» ХАДКЕВИЧ А.Д.

ПРОВОДИТ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ СКЛАДСКОЙ БАЗЫ 1975 ГОДА ПОСТРОЙКИ ПЛОЩАДЬЮ 1,2 га в г. ЗАСЛАВЛЬ В СОСТАВЕ:

3 кирпичных складских помещения (площадью 1205,7 кв. м, 985,5 кв. м, 581,6 кв. м), 2 административных здания (площадью 105,1 кв. м, 66,1 кв. м), крановая однопролетная эстакада с бетонным покрытием и двумя кран-балками грузоподъемностью по 5 т каждая (площадь 1440 кв. м). База примыкает к железнодорожной станции «Беларусь», подъездные пути, электрокабельная линия, водоснабжение, телефон.

Торги состоятся **18 марта 2010 года в 11 часов** по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15, ком. 201. Задаток для участников 20,0 млн руб. перечисляется на расчетный счет РУП «Торговый Дом Белхлебопродукт» № 3012200130017 в ОАО «Бел АПБ«МГД» г. Минск, код 963, УНП 100079803.

Заявки принимаются **до 18.00 17 марта 2010 года.**

Начальная цена 800 000 000 бел. руб.

Конт. тел. 8(029) 120 98 56, 8(029) 614 02 69.

Ёсць нагода!

13 сакавіка — Дзень слана

Якое ён мае дачыненне да нас, беларусаў, большасць з якіх слана ніколі жыўцом не бачыла? Ды ніякага! Аднак чым не нагода ператварыць самы звычайны дзень — у СВЯТА!

Аматараў адзначаць усе «чырвоныя» дні ўсіх календароў меней не становіцца. І прыемна, што сакавік парадаваў іх не толькі Міжнародным жаночым днём, іудзейскім Пурымам, ірландскім днём святога Патрыка, але і тайландскім Днём слана.

Безумоўна, лепш за ўсё яго адзначаць у Тайландзе. Турыстычныя фірмы, якія спецыялізуюцца на турах у гэтую краіну, загадзя ўзнімаюць цэны напярэдадні гэтага свята. Для тых, хто патрапіў у Тайланд у Дзень слана, перад вачыма разгортваецца шыкоўнае відовішча, сапраўдны карнавал. У любой будыйскай краіне слана шануюць як сімвал пазбаўлення ад ланцугоў зямнога быцця, а ў Тайландзе яму аказваюць асаблівую павагу (белы слон з'яўляецца сімвалам Тайланда). Гэтая жывёліна ўвасабляе цярпенне, мудрасць і вопыт, а таксама моц і ўладу. Для слаоў 13 сакавіка арганізуюць пір з тонамі цукровага трыснягу, садавіны і бананавых дрэў.

У Расіі ва ўсіх гарадах, дзе ёсць буйныя заапаркі, 13 сакавіка таксама ладзяць свята для слаоў.

14 сакавіка — Дзень чысла «π»

Чысло «π» — матэматычная канстанта, якая выражае суадносіны даўжыні акружнасці да даўжыні яе дыяметра. У лічбавым выражэнні «π» пачынаецца як 3,141592 і мае бясконцую матэматычную працягласць.

Гэтае неафіцыйнае свята — Дзень чысла «π» — прыдумаў у 1987 годзе фізік з Сан-Францыска Лары Шоў, які заўважыў, што ў амерыканскай сістэме запісу дат (спачатку месяц, потым чысло) дата 14 сакавіка (3/14) і час 1:59 супадае з першымі разрадамі чысла «π» (3,14159).

Цікавасць да значэння чысла «π» з'явілася яшчэ ў незапамятныя часы. Як мяркуюць спецыялісты, гэтае чысло было вынайдзена вавілонскімі магамі. Яно выкарыстоўвалася пры будаўніцтве знакамітай Вавілонскай вежы. Аднак недастаткова дакладнае вылічэнне чысла «π» прывяло да краху ўсяго аб'екта. Верагодна, што гэтая матэматычная канстанта ляжала ў аснове будаўніцтва легендарнага храма цара Саламона.

У глыбокай старажытнасці лічылася, што π=3 (напрыклад, пра гэта ўзгадваецца ў Бібліі). У эліністычную эпоху «π» вылічалі як 22/7. Гэтым жа яго значэннем карысталіся і Леанарда да Вінчы, і Галілея Галілей. Аднак абодва варыянты вельмі грубыя. Геаметрычны малюнак акружнасці, якая апісана вакол правільнага шасцівугольніка і ўпісана ў квадрат, адразу дае працэйшыя ацэнкі для «π»: 3<π<4.

Выкарыстанне грэчаскай літары π для абазначэння гэтага чысла было ўпершыню прапанавана Уільямам Джонсам у 1706 годзе. Гэта першая літара грэчаскага слова περιφέρεια (перыферыя, акружнасць).

Першы крок на шляху да вывучэння якасцяў чысла π зрабіў Архімед. У сваёй працы «Вымярэнне круга» ён вывеў знакамітую няроўнасць $3^{10}/_{71} < \pi < 3^{1}/_{7}$. Гэта азначае, што π ляжыць у інтэрвале даўжынёй 1/497. У дзесяцічнай сістэме вылічэння атрымаюцца тры правільныя лічбы π=3,14... Ведаючы перыметр правільнага шасцівугольніка і паслядоўна ўдвойваючы чысло яго бакоў, Архімед вылічыў перыметр правільнага 96-вугольніка, адкуль і вынікае няроўнасць. 96-вугольнік візуальна мала адрозніваецца ад акружнасці і з'яўляецца добрым набліжэннем да яе.

Сёння з чыслом π звязана безліч формул, матэматычных і фізічных фактаў. Іх колькасць працягвае імклівa расці, таму і цікавасць да найважнейшай матэматычнай канстанты, вывучэнне якой налічвае больш за 22 стагоддзі, не спадае.

У Дзень π гэтай матэматычнай канстанце чытаюць прамовы ўшанавання, пякуць π-рагі (pie) з выявай самой літары «π» ці з першымі лічбамі чысла, п'юць напоі і гуляюць у гульні, назвы якіх пачынаюцца з «π», вырашаюць матэматычныя галаваломкі, загадкі, водзяць карагоды вакол прадмету, звязаных з гэтым чыслом.

Цікава, што свята чысла «π» супадае з днём нараджэння аднаго з найбольш вядомых фізікаў сучаснасці — Альберта Эйнштэйна.

Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.

Тэлесеткі

«Цудоўная пяцёрка-4» фінішуе

Сёння тэлеканал АНТ пакажа выніковую «бітву» паміж фіналістамі музычнага праекта «Цудоўная пяцёрка-4». За галоўны прыз памерам у 25 мільёнаў беларускіх рублёў будуць спаборнічаць экспертна-крыміналістычны аддзел МУС з песняй «Белыя ружы», каманда спецназаўцаў з кампазіцыяй «Position № 2», работнікі абутковай крамы з рэтра-хітом «Электрычка», медыцынскі цэнтр «Нардзін» з песняй «Угон-шчыца» і каманда ЦЭЦ-4 з песняй «Дзяўчынка-дзяўчыначка».

Вядучыя шоу Яўген Смарыгін і Дзмітрый Танковіч уручаць гэты сертыфікат пераможцам.

Пераможцу ў ходзе інтэрактыўнага тэлефоннага галасавання абяруць гледачы — прычым у прамым эфіры. (У мінулых сезонах праекта, нагадаем, удача ўсміхалася па чарзе камандзе МНС, агракамбінату «Дзяржынскі» і агракамбінату «Сноў».) А адразу пасля фінальнай праграмы цікаўныя змогуць зазірнуць за кулісы праекта — творчая група АНТ спецыяльна падрыхтавала паўгадзінны фільм пра закадравыя падрабязнасці выбару і падрыхтоўкі ўдзельнікаў.

Дарэчы, як расказалі на АНТ, адраджэнне праекта, у якім «спяваюць усе», выклікала новы ўсплёск цікавасці з боку розных кампаній і арганізацый — «спяваючыя офісы» літаральна гатовыя выстройвацца ў чаргу, каб таксама паказаць свае таленты на экране.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота тэлеканала АНТ.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДАПАМАЖЫ САБЕ САМ

«Паслізнуўся, упаў, ачуўся — гіпс...»

Сакавік лічыцца адным з самых траўманебяспечных месяцаў у годзе. Але траўму можна атрымаць не толькі на слізкай дарозе. Пра пераломы, іх наступствы і сродкі, якія дапамогуць пры іх лячэнні, і пойдзе размова ніжэй.

Хутчэй зрастайся!

На жаль, складасці правільна і хутка косці і накласці гіпс — гэта яшчэ не ўсё. Існуе шмат спосабаў лячэння пераломаў на ранніх стадыях, якія паскараюць рэгенерацыйныя працэсы (фарміраванне касцявога мазаля, прасцей кажучы, зрастанне косці). У іх ліку электрапрацэдуры, агульнае ўльтрафіялетавае апраменьванне, лячэнне ўльтрагукам і інш. Добра дапамагаюць і хатнія сродкі.

ХАЛЕСТЭРЫН І ПАМІДОРЫ

Каб косці хутчэй зрасталіся, неабходны халестэрын (асабліва пры сустаўным пераломе). Значыць, трэба есці як мага больш халадцу, насычаных булёнаў з костак, яек, тлустага мяса. Аднак халестэрын, як вядома, — гэта ўдар па сэрцы: можа развіцца атэрасклероз, ішэмічная хвароба сэрца. Каб абараніць сардэчна-сасудзістую сістэму і накіраваць увесь халестэрын «у справу», адначасова з пералічанымі вышэй прадуктамі ешце як мага больш зеляніны і памідораў (як у сырым, так і ў вараным выглядзе).

КАЛЬЦЫЙ З ЛІМОНАМ

Абавязкова прымайце «кальцыевую калатушку». Шкарлупіны 40 вараных яек, зняўшы плёнкі, здрабніце ў кавамолцы, заліце шклянкай свежавыціснутага лімоннага соку, настойвайце 1-2 дні ў цёмным халаднаватым месцы. З'ядайце па 1 ч. лыжку адзін раз на дзень перад абедам.

ПАДАРУНАК ПЧАЛЫ

Пры пераломах вельмі карысныя сродкі апітэрапіі — матачнае малачко і пярга.

- Прыгатуйце настойку: 1 частку матачнага малачка змяшайце з 2 часткамі гаралкі. Прымайце па 5-10 кропель за паўгадзіны да яды чатыры разы на дзень.
- Штодня па два-тры разы на дзень з'ядайце па 1/3 ч. лыжкі пяргі.

Увага! І пярга, і матачнае малачко маюць шмат супрацьпаказанняў, і калі праз дзень-два пасля прыёму гэтых прэпаратаў узнікнуць непрыемныя адчуванні ў страўніку, пачне скакаць ціск, з'явіцца скурныя высыпанні — тэрмінова спыніце лячэнне.

Беражыце ныркі

Траўматолагам добра вядома, якая непрыемная рэч — перараз-меркаванне кальцыю ў арганізме. З-за гэтага часта пасля складаных пераломаў у чалавека пачынаюцца праблемы з ныркамі (утвараюцца камяні). Каб гэтага не адбывалася, старайцеся не трымаць тулава ў гарызантальным становішчы доўгі час. Нават калі вам забаронена ўставаць з пасцелі, не ляжыце, а сядзіце, падклаўшы пад спіну падушкі. Інакш у нырачных лаханках можа адбыцца застой мачы. А калі «паманенькаму» быццам бы і не хочацца, што зноў-такі не рэдкасць пры цяжкіх траўмах, абавязкова прымайце лёгкія мачагонныя сродкі.

Карысныя парады

- Траўмаваны сустаў нельга ні награваць, ні ахалоджваць. Таму на 3—5 месяцаў забудзьце пра рускую лазню і штодзённыя абліванні вадой.
- Да актыўных заняткаў спортам можна прыступаць не раней чым праз 2-3 месяцы пасля пераломy, і то калі пацярпела не «галоўная» канечнасць.
- Калі была зламаная рука, не насіце ў ёй нічога цяжкага як мінімум 1-2 месяцы.
- Абавязкова бінтуйце месца траўмы эластычным бінтам на працягу 1—3 месяцаў пасля таго як знімуць гіпс.
- Пры пераломе нагі вельмі важна правільна навучыцца карыстацца мыліцамі. Верхняя частка мыліцы не павінна даставаць да падпахавай ямкі 3—5 см, а папярочнае дзяржанне трэба размясціць на такой вышыні, каб пры абапіранні на мыліцу рука была цалкам выпрастаная.

-2642-

ПОСНЫ СТОЛ

Бульбяныя катлеты з соусам

Гэтая страва — простая і сытная — спадабаецца тым, хто посціць.

10 бульбін, 2 ст. лыжкі мукі, 1 цыбуліна, алей, соль.

Для соусу: 30 г сушаных баравікоў, 300 г шампіньёнаў, 1 ст. лыжка мукі, 1 ст. лыжка алею, 1 цыбуліна, сок з 0,5 лімона, соль, перац на смак.

Для ўпрыгажэння: лісце салаты, памідоры, зяленіва.

Абабраную бульбу зварыце ў падсоленай вадзе, прапусціце праз мясарубку ці пратрыце праз сіта. Цыбулю пасячыце, абсмажце на алеі, злучыце з бульбянай кашай. Дадайце муку, старанна перамяшайце. Сфармуйце круглыя катлеты, абкачайце ў муцэ і абсмажце на алеі.

Прыгатуйце соус. Сухія грыбы зварыце, булён працадзіце. Вараныя баравікі, шампіньёны, цыбулю дробна парэжце, абсмажце на алеі, дадайце муку, уліце 1 шклянку грыбнога адвару, соль, перац, сок лімона. Усё перамяшайце і давядзіце да кіпення.

Выкладзіце катлеты на блюда з лісцем салаты, упрыгожце памідорамі і зеленівам, асобна падайце соус.

НЕАБХОДНЫЯ ДРОБЯЗІ

Што можа воцат

Ён не толькі паляпшае смак страў, але ўмее і яшчэ шмат чаго па гаспадарцы.

- Тлусты посуд, патэльні, бляхі лягчэй адмыць, калі ў ваду дадаць крыху воцату. Гэтак жа можна адмыць кухонныя анучкі, мачалкі і шчоткі.
- Каб выдаліць спецыфічны пах у кухоннай шафе, яе сценкі трэба працерці анучкай, намочанай у воцаце.
- Воцатны раствор (2-3 ст. лыжкі на 2 л вады), які кіпіць на працягу дзвюх гадзін, ачысціць чайнік (не электрычны) ад даволі тоўстага слою накіпу.
- Ватным тампонам, намочаным у воцаце, выдатна чысціцца ракавіны, эмаліраваны посуд.
- Сумесь буйной солі з воцатам добра чысціць пацямнелыя графіны і хрустальныя вазы.
- Афарбоўка тканіны мэблі і дываноў стане ярчэйшай, калі іх выбіваць праз тканіну, намочаную растворам 1 ст. лыжкі воцату на 1 л вады.
- Калі «заесць» шкляны прыцёрты корак на флаконе, на дапамогу прыйдзе кропля воцатнай эсенцыі, пушчаная паміж горлачкам і коркам флакона.
- Анучкай, намочанай у воцаце, можна вычысціць каўнер пінжака ці паліто.
- У сумесі з вадой воцат надасць эластычнасць вычышчаным скураным пальчаткам і трыкатажным вырабам.
- Разведзеным у роўных прапорцыях воцатам з вадой можна праціраць абутак ад салявых разводаў.
- Каб ва ўвільгатняльніку паветра не з'явілася плесня, штодня дадавайце ў ваду воцат.
- Гарачым воцатам можна выдаліць сляды фарбы са шкла.

ПАМЯТАЙЦЕ: воцат і асабліва воцатную эсенцыю, калі ў доме ёсць дзеці, неабходна трымаць у недаступным для іх месцы.

ПАДКАЗКІ СПРАКТЫКАВАНЫХ

Каб лак не загусцеў

Манікюр робяць многія жанчыны, аднак далёка не кожная ведае, што захоўванне лаку для пазногцяў патрабуе навуковага падыходу. Падыхайце ў флакон з лакам перад тым, як закруціць корак, і лак дзякуючы гэтаму даўжэй не будзе гусцець.

-2643-

13 сакавіка

Дзве даты

1919 год — створана Беларуска-Літоўская армія, аператыўнае аб'яднанне часцей і злучэнняў Чырвонай Арміі на тэрыторыі Літоўска-Беларускай ССР у грамадзянскую вайну. Створана па загаду РВС Рэспублікі шляхам перайменавання Заходняй арміі.

1881 год — быў учынены замах на імператара Аляксандра II, калі яго карэта праязджала ўздоўж Екацярынінскага канала. Народаволец Мікалай Рысакоў кінуў бомбу пад колы карэты, але імператар не пацярпеў. Толькі выйшаўшы з карэты, ён быў смяротна паранены другім тэрарыстам — Ігнатам Грынявецкім, які пры гэтым таксама загінуў. Трэцяга красавіка 1881 года былі публічна павешаны пяцёра народавольцаў — Жалябаў, Пяроўская, Рысакоў, Міхайлаў і Кібальчыч.

Цытата дня:

«Чым разумнейшы і дабрэйшы чалавек, тым больш дабра ён бачыць у іншых людзей».

Блез Паскаль (1623—1662), французскі рэлігійны мысліцель, матэматык.

ПТУШКІ — ВЕСТУНЫ ВЯСНЫ

Свет і суседзі

ЧАЛАВЕКА

Выпяканне «птушак» для выканання абраду «гуканне вясны», найперш «жаўранкаў», тлумачыцца тым, што якраз гэтыя птушкі з'яўляліся першымі і самымі раннімі вестунамі набліжэння цяпла. Як звычайна, на золку гаспадыня распальвала печ, але пры гэтым звярталася да агню як да жывой істоты — з кароткай замовай або малітвай. Затым з жытняй мукі гатавалася цеста, з якога рабілі значную колькасць «галушак» у выглядзе птушак (жаўранкаў, вераб'ёў, качак, «чырачак»).

- Назіранні за паводзінамі птушак дапамаглі нашым продкам бездакорна арыентавацца ў зменах прыроды. Яны маглі прадказаць надвор'е як на некалькі дзён наперад, так і на больш аддаленую перспектыву, што было для селяніна надзейным арыенцірам для правядзення адпаведных земляробчых работ. Напрыклад, ранні прылёт ластавак прадказваў дружную вясну. Лічылі, калі гракі прыляталі раней святой Аўдакеі (14 сакавіка) — быць лету мокрым. Лепшым тэрмінам прылёту гракоў лічылі 17 сакавіка — дзень ушанавання святога Герасіма. На Беларусі казалі так: «Святы Герасім гракоў прыгнаў»; «Калі гракі сядзяць ужо ў гнёздах — вясна будзе дружная, праз тры дні можна выходзіць на поле, калі лётаюць бязмэтна або іх увогуле не відаць — вясна будзе павольная, позняя».
- Вялікая колькасць прыкмет звязана з бусламі, шпакамі, варонамі, жураўлямі і некаторымі іншымі відамі птушак. Паралель прасочвалася самая непасрэдная. З далёкага выраю птушкі прыляталі ў пэўнай паслядоўнасці: «На Саракі, паводле народнага павер'я, вылятае з цёплага краю вястун вясны жаваронак; пасля яго — гракі, што бывае за 12 дзён да адкрыцця вады; потым качкі і журавы і, нарэшце, зязюля, якая, як кажа народ, пачынае куваць за 12 дзён да святога Георгія (6 мая)». Апошнімі прыляталі салаўі — птушкі кахання.
- Да птушак беларусы ставіліся як да істот, якія звязаны з выРаем, з месцам знаходжання душ памерлых продкаў. Таму іх прылёт з выраю ўспрымаўся вясткай новага жыцця, адушаўлення-ажывання прыроды.
- Да выпякання «птушак» гаспадыня запрашала дзяцей. Яны пры дапамозе спецыяльных папяровых або драўляных формаў з кардону выразалі з цеста выявы птушак і клалі іх на хлебную лапату або на капусныя лісты, а потым на патэльню. Колькасць «птушак» вагалася ў залежнасці ад мясцовай традыцыі — недзе ад дваццаці да сарака.
- Адразу пасля таго як печыва даставалі з печы, гаспадыня выконвала абавязковае рытуальнае дзеянне — кідала назад у печ адну «птушачку» — прыносіла ахвяру (можа, вясне, можа, агню, можа, добраму духу хаты)...

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 1230. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12